

Рэпартаж з мінскага выцвярэзніка

СТАР. 3



Іншы свет. Дзеці-аўтысты

СТАР. 3



Чым небяспечныя скарыстаныя батарэйкі?

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 КРАСАВІКА 2014 г. СУБОТА № 63 (27673) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ ПРАЕКТЫ Ў РОЗНЫХ СФЕРАХ

### У Беларусі і Калужскай вобласці ёсць вялікі патэнцыял для пашырэння супрацоўніцтва

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам расійскага рэгіёна Анатолем Артамонавым.**

Калужская вобласць з'яўляецца даўнім і важным гандлёвым партнёрам Беларусі, бакі звязваюць шматгадовыя прамыя партнёрскія сувязі, якія маюць трывалую гістарычную, дзелавую і гуманітарную асновы. Узаемны тавараразварот у 2013 годзе склаў амаль $ 570 млн.

Прэзідэнт адзначыў, што бакі ўжо актыўна ўзаемадзейнічаюць у будаўнічай сферы: беларускія арганізацыі ўзводзяць у Калужскай вобласці жылыя дамы, у шэрагу выпадкаў з выкарыстаннем беларускіх тэхналогій і матэрыялаў. «Мяркую, варта выйсці на новы этап і прыступіць да ўдзелу ў праектаванні і будаўніцтве вытворчых і інфраструктурных аб'ектаў», — лічыць беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што Калужская вобласць і Беларусь маюць развітую прамысловасць. На яго думку, гэты фактар дыктуе неабходнасць прапрацоўкі варыянтаў вытворчай каапераацыі аж да стварэння сумесных прадпрыемстваў як у Беларусі, так і ў гэтым расійскім рэгіёне.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь гатова падзяліцца з калужскімі аграрыямі вопытам у сельскай гаспадарцы, а таксама практычнымі напрацоўкамі па ачыстцы вады, якія з'явіліся дзякуючы 12-гадовай рэалізацыі праграмы «Чыстая вада». У бакоў ёсць таксама вялікі нявыкарыстаны патэнцыял супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы, у тым ліку ў атамнай энергетыцы, у сферы касмічных, медыцынскіх, інфармацыйных тэхналогій і па пытаннях энергаэфектыўнасці.

Аляксандр Лукашэнка закрануў у ходзе сустрэчы і пытанні ўзаемаадносін з Расіяй, паведамляе БелТА. Прэзідэнт адзначыў, што апошнім часам з'явілася занадта шмат здагадак і інсінуацый. «Нібыта Лукашэнка спрабуе выкарыстоўваць праблемы, якія ўзніклі ў Расіі, на сваю карысць. Ведаеце, ідыётам быў бы той, хто не выкарыстоўваў нейкія магчымасці. Але запомніце: што б я ні рабіў цяпер, размаўляючы з Украінай, Захадам, Усходам і г.д., я ніводнага кроку не раблю без узгаднення з кіраўніцтвам Расійскай Федэрацыі, калі пытанне тычыцца Расіі», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Таму даю на гэтае пытанне прамы і дакладны адказ: калі трэба будзе Расіі, каб мы за яе працавалі ва Украіне, мы гэта будзем рабіць. Калі трэба будзе Расіі, каб мы ехалі за трыдзевяць зямель і карысць ёй прыносілі, мы гэта будзем рабіць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што, па-першае, гэта «ў інтарэсах нашага роднага брата» і, па-другое, гэта не супярэчыць нашым інтарэсам.

Што тычыцца санкцый, уведзеных Захадам супраць Расіі, Прэзідэнт лічыць іх «поўным трызненнем і глупствам». Да таго ж, на думку беларускага лідара, «яны аб'ядноўваюць вакол праблем, якія ёсць унутры той ці іншай краіны, усю нацыю, увесь народ». «Таму давайце будзем працаваць так, каб нас потым не папікалі тым, што мы не скарысталіся гэтым спрыяльным момантам», — сказаў Прэзідэнт.

## УЗАЕМНЫЯ ПЛЮСЫ

**Беларусь дамаўляецца аб супрацоўніцтве з Банкам гандлю і развіцця краін Усходняй і Паўднёвай Афрыкі па пытанні садзейнічання ў развіцці гандлю і ажыццяўленні інвестыцый на Афрыканскім кантыненце. Пра гэта ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з прэзідэнтам, галоўным выканаўчым дырэктарам гэтага банка Адмасу Тадэсэ, паведамляе БелТА.**

«Мы гатовыя працаваць з Афрыкай, тым больш у нас ёсць вопыт савецкіх часоў. Мы будзем прадаваць туды свой тавар і ствараць сумесныя прадпрыемствы для вытворчасці адпаведнага тавару, будзем інвеставаць у Афрыку», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы. Але, на яго думку, «без падтрымкі фінансавых інстытутаў вельмі складана гэта зрабіць». « Калі вы нам дапаможаце прыйсці ў Афрыку, думаю, банк ад гэтага атрымае толькі плюсы», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да Адмасу Тадэсэ.

Той у сваю чаргу выказаў упэўненасць, што супрацоўніцтва будзе ўзаемавыгадным. «Беларусь даўно вядомая ў Афрыцы, і некаторыя беларускія гандлёвыя маркі ва ўсіх на слыху. Мы ўжо правялі пэўныя сустрэчы, і нашы акцыянеры і ўрады нашых краін зацікаўлены ў аднаўленні партнёрскіх адносін, у тым ліку ў вашым рэгіёне. Мы зацікаўлены ў навядзенні новых мастоў, адкрыцці новых магчымасцяў», — сказаў кіраўнік банка. «Афрыка хутка развіваецца, але для далейшага развіцця патрэбны моцныя, надзейныя партнёры», — дадаў ён.

## ДАБРЫНЯ, МУЖНАСЦЬ І МУДРАСЦЬ — РОДУ ЖАНОЧАГА

### Учора ў Мінску адбыўся фінал VI рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года-2013»

**Ганаровыя званні яго лаўрэатак атрымалі 17, а дыпламанткамі сталі яшчэ 35 беларусак, якія дасягнулі за апошні год вяршыняў не толькі ў сваёй прафесійнай сферы, але і ў грамадскай дзейнасці, у дабрачынным руху, у справе выхавання дзяцей, у развіцці вёскі, у захаванні духоўных і маральных каштоўнасцяў, у бізнесе...**



Святлана НОВАК – настаўніца з вёскі Малоткавічы Пінскага раёна, выводзіла дзяцей з пажару.



Ала ЦУПЕР – нарадзіўшы дзіця, вярнулася ў вялікі спорт і стала алімпійскай чэмпіёнкай.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Вольга КАЛІНСКАЯ – педагог з 20-гадовым стажам і шматдзетная маці з Акцябрскага раёна.

Перад пачаткам урачыстай цырымоніі старшыня праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (якая да таго ж ужо 15 гадоў узначальвае грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын») Надзея Ермакова размовы аб магчымай дэнамінацыі і яе тэрмінах падтрымлівала неахвотна, нагадваючы, што сабраліся не дзеля гэтага, і гаварыць варта зусім пра іншае — жанчын, дзяцей, вялікія сем'і: «Гэта самае дробнае пытанне — выпусціць новыя грошы. Значна больш складана зрабіць так, каб яны з'явіліся дакладна ў патрэбны момант, каб не давялося праз два-тры гады запускаць адваротны працэс. Наогул, трэба, каб у пагоні за грашыма, за ўсімі гэтымі моднымі словамі — дэнамінацыя, дэвальвацыя, інфляцыя — мы не забыліся пра багацце духоўнае, пра звычайнае чалавечае жыццё».

Затое Надзея Андрэеўна з усмешкай вітала ідэю, каб на будучых новых беларускіх грашах былі змешчаны партрэты славутых суайчынніц, і з прыемнасцю адзначала, што за шэсць гадоў правядзення ў Беларусі маштабнага конкурсу «Жанчына года» цікавасць да яго не зменшылася: «Цяпер нашы жанчыны загадзя чакаюць гэтага конкурсу. Не ўсе могуць быць яго ўдзельніцамі і тым больш пераможцамі, але нават проста пабываць на свяце, куды з'язджаюцца жанчыны з усёй рэспублікі — гэта адметная падзея для кожнай. Я сёння назірала, з якім настроем госці заходзяць у залу — усе ўсміхаюцца, ва ўсіх радасна на душы. Хочацца пажадаць усім жанчынам, якія мараць пра ўдзел у гэтым конкурсе, імкнуцца, ставіць мэты і дасягаць іх, жадаць перамогі і перамагаць».

СТАР. 2

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ПУЗАКОЎ, першы намеснік начальніка галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл:**

*«Пытанне скарачэння працягласці тэрміновай ваеннай службы пакуль не разглядаецца. Напрамую гэта залежыць ад патрэбы войскаў у новым папаўненні ў кожным прызыве. Прасцей кажучы, чым карацейшыя тэрміны ваеннай службы, тым больш грамадзян неабходна прызываць для яе праходжання. Існуючыя сёння тэрміны ваеннай службы і колькасць вызначаных законам падстаў для адтэрміновак і вызвалення ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве забяспечваюць патрэбы ў камплектаванні войскаў. А скарачэнне тэрмінаў службы запатрабуе і скарачэння колькасці падстаў для адтэрміновак і вызвалення ад прызыву».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9900,00 | ■ |
| Еўра | 13560,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 854,55 | ▼ |

■ Жыллё напракат

## ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ ПРЫВАТНАЙ АРЭНДЫ

### Уладальніку здымнай кватэры трэба ўважліва складаць дагавор

**Да апошняга часу наша газета пастаянна прапаноўвала сваім чытачам аналіз развіцця рынку арэнднага жылля. Галоўным чынам, мы разглядалі апошнія тэндэнцыі гэтага сектара па цэнавым кірунку, а таксама давалі парады будучым кватарантам. Сёння мы паспрабуем дапамагчы гаспадарам жылля — тым уласнікам, хто збіраецца здаць сваю кватэру па законе, зарабіць грошай, а потым аб гэтым не шкадаваць.**

#### Пошук кватарантаў — справа далікатная



Першае пытанне, якое ўзнікае ў гаспадароў свабоднай кватэры, тычыцца самога механізму падбору часовых жыхароў гэтага жылля. Памылкай будзе ўжо тое, калі «свежы» кватэраздатчык пачне прапанаваць сваю кватэру знаёмым, сябрам, знаёмым сяброў ці сябрам знаёмых і г. д. З аднаго боку, такім «сваім» кватарантам звычайна прапануецца крыху меншы цэннік арэнды, бо «рваць» грошы па поўнай неяк атрымліваецца нязручна. У гэтым выпадку гаспадару свабодных метраў здаецца, што знаёмы пастаялец будзе ставіцца да кватэры больш беражліва. Напэўна, у першы месяц ці два так яно і будзе, а потым такое роднае памяшканне можна ўжо і не пазнаць... Справа ў тым, што па знаёмстве праз трэція рукі кватэра звычайна здаецца без афармлення, а гэта разнявольвае часовых жыхароў. Зламалі мэблю, сапсавалі сантэхніку, пакрэмзалі шпалеры — гэта толькі «кветачкі», якімі могуць «ашчасліваць» вас сябры сяброў. Прымусіць выправіць усё гэта праз вашых знаёмых даволі праблематычна, бо дамоўленасць аб падобных нюансах не была зафіксавана на паперы. А людзі розныя бываюць, тым больш калі справа тычыцца грошай.

СТАР. 6

■ Індывідуальнае будаўніцтва

## ВЕСНАВОЕ «ПАЛЯВАННЕ» НА ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ

### Кошт участкаў пад Мінскам склаў ад 4 да 65 тысяч долараў

**Учора ў Мінскім раёне адбыўся чарговы аўкцыён па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць фізічным асобам. Пры павышанай актыўнасці пакупнікоў з малатка былі прададзены літаральна ўсе лоты. Найбольшую цікавасць людзі з грашыма праявілі да ўчасткаў у Копішчы, Ратамцы і Заслаўі.**

Таргі пачаліся з Бараўлянскага сельсавета. Тры ўчасткі ў вёсцы Копішча былі выстаўлены на аўкцыён па аднолькавай пачатковай цане — за 390 млн рублёў. На ўсе гэтыя ўчасткі без камунікацый першапачаткова было пададзена ад 4 да 6 заяў. У выніку гарачых таргоў найдаражэй на аўкцыёне быў прададзены менавіта першы лот — участак за 650 млн рублёў (65 тысяч долараў). Два астатнія ўчасткі былі перададзены ў прыватную ўласнасць адпаведна за 519 і 580 млн рублёў. Істотна павялічыўся пачатковы кошт (290 млн рублёў) участка з электрычнасцю ў вёсцы Курганы Бараўлянскага сельсавета, які быў рэалізаваны за 440 млн рублёў.

Ждановіцкі сельсавет выстаўляў на таргі 3 зямельныя ўчасткі: адзін — у Ждановічах і два — у Ратамцы. На лот у Ждановічах знайшоўся толькі адзін прэтэндэнт, таму таргі па ім не праходзілі. Па жаданні заяўніка ён будзе прададзены яму па пачатковай цане, якая павялічваецца на 5%. Участкі ў Ратамцы ўжо карысталіся павышаным попытам. На адзін з іх было пададзена 7 заяў, а на другі — 9. Участак 0,12 га з электрычнасцю і газам па завулку Лінейнаму прададзены за 519 млн рублёў, а надзел плошчай 12 сотак без камунікацый па вул. Алімпійскай — за 382 млн рублёў.

Сур'ёзным попытам учора карысталіся лоты і ў Заслаўі. На два ўчасткі плошчай 10 і 15 сотак без камунікацый прэтэндавалі адпаведна 8 і 4 заяўнікі. У выніку цана на адзін лот з 88 млн рублёў павялічылася да 228 млн рублёў, а на другі — з 132 млн да 260 млн рублёў ($26 тыс.). Участак плошчай 9 сотак з электрычнасцю і газам па вул. Прыазёрнай меў ажно 9 заяў. Таму пачатковы кошт у 146 млн павялічыўся да 470 млн рублёў.

Лашанскі сельсавет выставіў на аўкцыён два зямельныя лоты — у вёсках Дзінаравічы і Круты. Участкі па 15 сотак часткова з камунікацыямі прададзены адпаведна за 108 і 90 млн рублёў.

У вёсцы Гузгалаўка Лугаваслабадскога сельсавета прадаваўся ўчастак (15 сотак) з усімі камунікацыямі. На яго прэтэндавалі 6 чалавек. У выніку пачатковая цана лота з 95 млн паднялася да 298 млн рублёў. Шаршунскі сельсавет выстаўляў на таргі ў вёсках Дашкі і Пухлякі па адным участку, і яны былі прададзены. Апошні лот пры пачатковым кошце 25 млн рублёў рэалізаваны за 40 млн (4 тысячы долараў). Наступны аўкцыён па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць у Мінскім раёне адбудзецца 11 красавіка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ПАРЛАМЕНЦЕ ЛАТВІІ АБАКРАЛІ ДЭПУТАТАЎ



У залу пасяджэнняў парламента Латвіі пранікні зладзеі. Пра гэта паведамляе DELFI. Інцыдэнт адбыўся вечарам 3 красавіка пасля чарговага пленарнага пасяджэння. Паводле звестак выдання, зламыснікі скралі партатыўныя камп'ютары ў трох чалавек — віцэ-спікера Андрэя Кляменцьева, дэпутатаў Дзінтарса Расначса і Яніса Вуцанса. Зніклая тэхніка знаходзілася на іх працоўных сталах. Як заявіў Кляменцьеў у інтэрв'ю радыё Baltkom, выкрадзеныя камп'ютары не змяшчалі ніякай каштоўнай інфармацыі. Слядоў узлому на месцы здарэння не выяўлена. Між тым трапіць у будынак парламента Латвіі можна толькі па спецыяльным пропуску. Пакрыўджаным дэпутатам выдалі новыя камп'ютары. Паліцыя распачала крымінальную справу.

### УКРАІНСКУЮ МІЛІЦЫЮ ПЕРАЙМЯНУЮЦЬ У ПАЛІЦЫЮ




Урад Украіны распрацаваў законапраект, якім міліцыя будзе рэарганізавана ў паліцыю, паведаміў першы віцэ-прэм'ер Украіны Віталь Ярэма ў інтэрв'ю Укрінформ. У дакуменце вызначана, што паліцыя — гэта праваахоўны орган, на які ўскладзена, у прыватнасці, забеспячэнне бяспекі грамадзян, іх канстытуцыйных правоў і свабод. У сувязі з гэтым прапануецца новая структурная мадэль МУС, удакладніў чыноўнік. «Сёння МУС Украіны з'яўляецца міністэрствам міліцыі, а насамрэч у яго склад павінны ўваходзіць памежнікі, МНС, Нацыянальная гвардыя, фінансавая паліцыя», — растлумачыў Ярэма.

ISSN 1990 - 763X

14063

9 771990 763008

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЗША СТВАРЫЛІ АНАЛАГ «ТВІТАРА» ДЛЯ КУБЫ З МЭТАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАТЭСТАЎ

ZunZuneo

ЗША стварылі заснаваную на тэкставых паведамленнях сацыяльную сетку, якая мае на мэце актывізацыю пратэстаў на Кубе, прызнаў прэс-сакратар Белага дома Джэй Карні, перадаюць інфармагенцтвы. Як паведаміла агенцтва «Асашыэйтэд Прэс», пачынаючы з 2009 года ўлады ЗША таемна фінансавалі стварэнне на Кубе «кубінскага «Твітара» — сацыяльнай сеткі, створанай для вядзення антыўрадавай прапаганды ў астраўной дзяржаве. Агенцтва правяло ўласнае расследаванне абставін гэтай аперацыі, у ходзе якога высветлілася, што інтэрнэт-праект ZunZuneo або «кубінскі «Твітар» на піку сваёй актыўнасці меў на востраве да 40 тыс. падпісчыкаў. ЗША ўтойвалі сваё дачыненне да стварэння гэтай сеткі з дапамогай падстаўных кампаній, а таксама шляхам накіравання трафіку праз іншыя краіны. Сам праект курыраваўся амерыканскім Агенцтвам па міжнародным развіцці (USAID), якое працуе пад эгідай Дзяржздэпартамента. У сувязі з сітуацыяй кубінскі МЗС заклікаў ЗША паважаць міжнароднае права, у тым ліку Статут ААН, і спыніць нелегальныя і падрыўныя дзеянні супраць Кубы.

### КОРАТКА

З 1 красавіка тарыфныя стаўкі ўчастковым урачам-тэрапеўтам і ўрачам-педыятрам, урачам агульнай практыкі, а таксама ўрачам, якія аказваюць хуткую меддапамогу, павялічаны на 40 працэнтаў. Участковым медсёстрам, памочнікам урача па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе, медсёстрам агульнай практыкі, фельчарам, медработнікам фельчарска-акушэрскіх пунктаў і медработнікам, якія маюць сярэднюю медыцынскую адукацыю, аказваюць хуткую меддапамогу, — на 30 працэнтаў. На 20 працэнтаў павышаны тарыфныя стаўкі санітаркам хуткай меддапамогі.

«Беларуснафта» плануе ў гэтым годзе ўдвая павялічыць колькасць аўтазаправачных станцый, якія працуюць на сонечнай энергіі. Такім чынам, у фірменнай сетцы аб'яднання будзе восем сонечных АЗС, у кожнай вобласці рэспублікі.

У Мінску 18 красавіка пройдзе акцыя па льготным лячэнні людзей, якія пакутуюць ад алкагольнай залежнасці, метадам кадзіравання або падшыўкі. Для таго каб стаць удзельнікам акцыі, неабходна пазваніць з 9.00 да 16.00 па тэлефоне 292-31-03.

■ Сумесная праца

## СЕЛЬСКАЕ АСЯРОДДЗЕ НАТХНІЛА НА ТВОРЧАСЦЬ

**Развіццё аграэкатурызму ў Беларусі набірае абароты. Пра інтарэс, які выклікае гэтая тэма ў грамадстве, сведчыць і рэспубліканскі творчы конкурс на лепшае асвятленне тэмы аграэкатурызму, праведзены па ініцыятыве Белаграпрамбанка.**

Ужо цягам сямі гадоў Белаграпрамбанк садзейнічае развіццю аграэкатурызму ў Беларусі па многіх кірунках: арганізуе цікавыя праекты ў гэтай сферы, аказвае крэдытную падтрымку тым, хто развівае яе. Спрычынілася да гэтай справы і «Звязда», якая неаднойчы пісала пра рэспубліканскі конкурс «Лепшая аграэкасядзіба года», што ўжо пяць разоў праходзіў пры падтрымцы банка.

Творчы конкурс таксама быў арганізаваны ў межах мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю нацыянальнага сельскага турызму і прадпрымальніцкай дзейнасці ў гэтай галіне. Суарганізатарамі конкурсу выступілі Міністэрства інфармацыі Беларусі і Беларускае грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы». Сам конкурс праходзіў з 1 ліпеня 2013 года да 31 студзеня 2014 года па пяці намінацыях: «Друкаваныя рэспубліканскія СМІ і інфармацыйныя агенцтвы», «Друкаваныя рэгіянальныя СМІ», «Тэлевізійныя і радыёвяшчальныя СМІ», «Інтэрнэт-рэсурсы», «Майстэрства і крэатыў». Урачыстая цырымонія ўзнагароджання адбылася ў аздараўленчым цэнтры «Сасновая» пад Мінскам — адным з лепшых агратурыстычных аб'ектаў даччынага сельгаспрадпрыемства «Азярыцкі-Агра».

Удзельнікаў цырымоніі цёпла павітаў **старшыня праўлення Белаграпрамбанк Уладзімір ПАДКАВЫРАЎ.** Ён павіншаваў пераможцаў, выказаўшы спадзяванне, што і надалей журналісцкая супольнасць будзе адгукацца на ініцыятывы Белаграпрамбанка і сумеснымі намаганнямі ўдасца сфарміраваць максімальна шырокую інфармацыйную прастору, якая дазволіць зрабіць сельскі турызм масавым як для нашых суайчыннікаў, так і для замежных гасцей. Кіраўнік банка падкрэсліў, што падтрымка аграэкатурызму з'яўляецца важнай сацыяльнай задачай Белаграпрамбанка, ускладзенай на яго Прэзідэнтам Беларусі.



Звяртаючыся да ўдзельнікаў цырымоніі, **першы намеснік міністра інфармацыі Лілія АНАНІЧ** падкрэсліла актуальнасць такога конкурсу сярод журналістаў, пераможцаў якога адзначылі прызамі і дыпломамі. Яна канстатавала рост цікавасці сярод СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў да конкурснай тэматыкі, адзначыўшы асаблівую ролю і ўклад рэгіянальнай прэсы і электронных СМІ. Лілія Ананіч падзякавала кіраўніцтву банка за сумесную працу, выказаўшы ўпэўненасць, што ініцыятыва знойдзе свой працяг, а ўдзел у конкурсе стане яшчэ больш масавым і якасным.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

# ДАБРЫНЯ, МУЖНАСЦЬ І МУДРАСЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Штогод арганізатары цырымоніі ўносяць у яе пэўныя цікавінкі — сёлета, напрыклад, гэта новыя намінацыі «За вернасць Беларускаму саюзу жанчын» і «Гонар нацыі». Яшчэ адна асаблівасць шостага па ліку ўшанавання жанчын года: дадому лаўрэаткі павязуць не крышталёвыя статуэткі, а адмысловыя памятныя медалі.

Конкурс «Жанчына года» мае на мэце ўшанаванне жанчыны ва ўсіх яе іпастасях і годную ацэнку ролі жанчыны ў сучасным грамадстве. Магчыма, ці не самай лаканічнай і выразнай з такіх ацэнак, што гучалі ў святочны вечар, сталі словы міністра ўнутраных спраў Беларусі Ігара Шуневіча: «Дзякуй за тое, што вы нас, істот далёка не дасканалых і часам шкодных, любіце і ўпрыгожваеце нашы дні і наогул жыццё».

Выбіраць пераможцаў журы сёлета было няпроста: у многіх намінацыях на званні лепшых сярод лепшых прэтэндавалі 7, а то і 8 кандыдатак. Бадай, найвялікшая канкурэнцыя склалася ў намінацыі «За прафесіяналізм і актыўную грамадскую дзейнасць», лаўрэаткамі якой сталі дырэктар РНПЦ атарыналарынгалогіі Людміла Макарына-Кібак і загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў Брагінскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Любоў Кузняцова. Перамогу ў намінацыі «За дасягненні ў выхаванні дзяцей» заваявала Вольга Калінская, настаўніца біялогіі і хіміі ДУА «Шкаўскі дзіцячы сад-базавая школа» Акцябрскага раёна, не толькі педагог з 20-гадовым стажам, але яшчэ і маці 5 дачок. Найлепшымі ў намінацыі «За дабрыню і міласэрнасць» журы назвала галоўнага ўрача 3-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы г. Мінска Людмілу Казачкову і дырэктара Івянецкага дома-інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі фізічнага развіцця (Валожынскі раён) Алену Петрашкевіч. Дыпломы лаўрэатаў «За жаночую мужнасць» атрымалі настаўніца фізкультуры Малоткавіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна Святлана Новак і ўладальніца 27 медалёў этапаў Кубка свету па фрыстайле, чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў 2014 года Ала Цупер. Пераможцай у намінацыі «За адраджэнне сяла» была названа кіраўніца сельгаспрадпрыемства «Азярыцкі-Агра» Смалявіцкага раёна Ніна Жалязнова.

Уладальніцай звання «Гонар нацыі» стала трохразовая чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у Сочы біятланістка Дар'я Домрачава.

...Зрэшты, мяркуючы па настроі дэлегацый, якія прыбылі з рэгіёнаў краіны, кожную з удзельніц варта лічыць пераможцай. І, відаць, гэта правільна, што ў конкурсе няма першых, другіх і трэціх месцаў — бо тут сабраліся лепшыя з лепшых: прыгожыя, працавітыя, паспяховыя жанчыны, якія ўжо заслужылі грамадскае прызнанне і якім няма чаго дзяліць.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Знешняя палітыка

# БЕЛАРУСЬ ЗНОЎ СТАРШЫНСТВУЕ Ў СНД

**Пазачарговае старшынства ў Садружнасці прыняла на сябе Беларусь. У ліку прыярытэтаў нашай краіны на гэтай пасадзе стане ўмацаванне добрасуседскіх стасункаў на прасторы СНД.**

4 красавіка ў Маскве праходзіла пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Пасяджэнне адкрылася пад старшынствам **міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра МАКЕЯ.** Падчас мерапрыемства было запланавана разгледзець 20 праектаў дакументаў, якія рэгламентуюць супрацоўніцтва краін у розных сферах. Былі ўхвалены праекты рашэнняў аб тым, каб 2016 год у СНД быў аб'яўлены Годам адукацыі. Значную ўвагу міністры надалі пытанням бяспекі. Было вырашана аказаць сістэмную дапамогу з боку Садружнасці Рэспублікі Таджыкістан для ўзмацнення бяспекі на таджыкска-афганскай мяжы.

Як заявіў журналістам Уладзімір Макей па выніках пасяджэння, падчас сустрэчы кіраўнікоў дыпламатычных ведамстваў вялікая ўвага была нададзена пытанню ажыццяўлення старшынства ў Садружнасці ў 2014 годзе ў сувязі з нядаўнім рашэннем Украіны.

«Беларусь адносіць сябе да актыўных удзельнікаў інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы, — падкрэсліў міністр. — Таму мы пагадзіліся ўзяць на сябе старшынства ў гэтым годзе і правесці ў сябе пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў у канцы мая гэтага года, Савета кіраўнікоў дзяржаў і Савета міністраў замежных спраў — восенню гэтага года».

Міністр замежных спраў Беларусі адзначыў, што, узначальваючы СНД другі год запар, наша краіна будзе карыстацца леташнімі напрацоўкамі Беларусі ў рамках канцэпцыі старшынства, а таксама возьме тыя напрацоўкі, якія былі зроблены ўкраінскім бокам пры падрыхтоўцы да старшынства ў СНД сёлета. Беларусь мае намер надаць вялікую ўвагу эканамічнаму вымярэнню ў рамках інтэграцыйных працэсаў на прасторы СНД, а таксама выкананню адпаведнага Дагавора аб зоне свабоднага гандлю.

«Адным з нашых галоўных прыярытэтаў будзе садзейнічанне ўмацаванню добрасуседскіх стасункаў на прасторы Садружнасці», — акцэнтаваў увагу Уладзімір Макей.

Раней на брыфінгу **прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў нашай краіны Дзмітрый МІРОНЧЫК** заявіў, што беларускі бок зробіць усё неабходнае, каб забяспечыць спрыяльныя ўмовы для перамоў паміж Украінай і Расіяй, калі яны выберуць Мінск для правядзення гэтай сустрэчы. Тым не менш, як падкрэсліў дыпламат, рашэнне аб правядзенні сустрэчы належыць прыняць, перш за ўсё, украінскаму і расійскаму бакам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ** ■

НАВІНЫ

## НЕ ТЭЛЕФАНУЙЦЕ НЕВЯДОМЫМ!

**Больш за 1 тысячу брастаўчан атрымалі эсэмэскі на рускай і беларускай мовах на тэлефоны Velcom з просьбай тэрмінова перазваніць на нумар, які пачынаўся лічбамі 0023... Аказалася, гэта спланаваная акцыя махляроў, якія такім чынам вымантачвалі грошы. Званок абаненту, зарэгістраванаму ў Сьера-Леоне, быў платны. І ў тых, хто аказаўся залішне цікаўным, з рахунку здымалі па 20 або 10 тысяч рублёў. Цяпер гэтай «акцыяй» займаюцца праваахоўныя органы.**

Аўтару гэтых радкоў падобнага зместу эсэмэскі часам прыходзяць на «лайфаўскі» тэлефон, але я на іх не рэагую, што і вам раю рабіць. Тады не давядзецца дзяліцца грашыма з махлярамі.

**Яна СВЕТАВА.**

## МАГІЛЁЎСКАЯ АЛЬМА-МАТЭР ДЛЯ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ

**...АДЗНАЧЫЛА СВОЙ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ.**

**За 66 гадоў існавання Магілёўскі вышэйшы каледж МУС падрыхтаваў тысячы кадраў для праваахоўнай сістэмы.**

ПАДЗЕІ

Сёння гэтая ўстанова вызначаецца інавацыйным падыходам у рабоце, тут створана сучасная матэрыяльна-тэхнічная база, ёсць нават свая «кінастудыя». У лабараторыі вучэбнага тэлебачання здымаецца цыкл фільмаў аб няпростых міліцэйскіх буднях. Гэта дазваляе курсантам лепш замацоўваць атрыманыя веды. Першыя «серыі» з поспехам прайшлі нават на мясцовым тэлебачанні. А з новага навучальнага года каледж, згодна з Указам Прэзідэнта, пачынае працаваць у якасці вышэйшай навучальнай установы. І ўпершыню за гісторыю свайго існавання пачне набор таксама і дзяўчат. Прагназуецца, што конкурс сярод прадстаўніц лепшай паловы чалавецтва будзе зашкальваць. На падрыхтоўчых курсах іх сёння займаецца ўдвая больш, чым патрэбна.

Павіншаваць кіраўніцтва і яго навучэнцаў з нагоды дня нараджэння ўстановы прыйшлі прадстаўнікі абласной і гарадской улады, калегі.

— Хачу шчыра падзякаваць усім выкладчыкам за падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў для органаў унутраных спраў, — сказаў у сваім віншавальным слове **начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама, генерал-маёр міліцыі Фёдар БАЛЕЙКА.** — Па сваім родзе дзейнасці мне часта даводзіцца бываць у службовых камандзіроўках у Расіі, Украіне, іншых рэспубліках былога Савецкага Саюза, і кожны раз я сустракаю там вашых выпускнікоў і чую словы ўдзячнасці на адрас вашай установы.

Супрацоўнікі каледжа былі адзначаны вышэйшымі міліцэйскімі ўзнагародамі, а таксама Ганаровымі граматамі Міністэрства ўнутраных спраў і аблвыканкама, некаторыя афіцэры атрымалі чарговае павышэнне па службе. У рамках святкавання прайшло першынство па стральбе з пісталета Макарава сярод супрацоўнікаў каледжа, працавала выстава «Міліцыя ў жывапісе», адбыўся канцэрт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## АШТРАФАВАНЫ ВІНАВАТЫЯ ВА ЎЧЫНЕННІ ПАЖАРАЎ У ЭКАСІСТЭМАХ

**Як паведаміў кіраўнік прэс-службы Брэсцкага абласнога МНС Сяргей МАШНОЎ, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 171 жыхар Брэстчыны ў ходзе рэйдаў па папярэджанні пажараў у экасістэмах. Агульная сума штрафаў перавысіла 23 мільёны рублёў.**

Выратавальнікаў, супрацоўнікаў міліцыі, прыродаахоўных і санітарных службаў да рашучых дзеянняў падштурхнула сітуацыя. Вясновыя выпальванні травы прымаюць масавы характар, а гэта недапушчальна. Па стане на 3 красавіка ў рэгіёне зарэгістравана 428 узгаранняў сухой травы, кустоўя і тарфянікаў. У 12 выпадках выпальванні сталі прычынай пажараў у прыватным сектары. Агонь знішчыў тры і пашкодзіў восем пабудоў. І самыя цяжкія наступствы выпальвання сухой травы — двое загінулых і адзін траўмаваны чалавек.

У абласным МНС зазначылі, што акцыя па прафілактыцы вясновых пажараў працягнецца ў красавіку і маі.

**Яна СВЕТАВА.**

ФАКТЫ

## РАНЕЙ ЧАСУ ЗАКРЫЛА ЮШКУ...

**У Мінскім раёне 9-гадовае дзіця атруцілася чадным газам.**

Хлопчык быў у гасцях у бабулі ў вёсцы Копішча. Перад сном пенсіянерка, прапаліўшы ў печы, раней часу закрыла юшку. Дзіця, якое было ў спальным пакоі, адчула сябе не вельмі добра, і бабуля ноччу выклікала «хуткую дапамогу». Тая даставіла пацярпелага ў сталіцу ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Дзіця напачатку паклалі ў баракамеру. Стан хопчыка быў сярэдняй ступені цяжару.

Выратавальнікі яшчэ раз нагадваюць, што юшку неабходна закрываць не пазней, чым за дзве гадзіны перад адыходам да сну.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Ва ўрадзе

# ГУМАННАСЦЬ ТУТ НЕ ПАТРЭБНА

## Адказнасць за наркадылерства могуць павялічыць

**Днямі адбылося пасяджэнне Камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў. Старшыня камісіі, намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК заявіў, што неабходна тэрмінова прымаць рашэнні па барацьбе з распаўсюджваннем наркатычных рэчываў.**

«Зрабіць больш жорсткім адказнасць трэба на парадак. Гэта не тая сфера, дзе можна праяўляць гуманнасць у дачыненні да тых, хто можа загубіць сотні людзей», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

На пасяджэнні камісіі таксама абмяркоўвалася ўнясенне паправак у некаторыя законы Беларусі па пытаннях папярэджання п'янства, безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх. Напрыклад, узроставы парог па продажы алкагольных напояў маладым людзям прапануюць павялічыць з 18 да 21 года. Акрамя таго, размова ішла пра абмежаванне продажу спіртнога ў начны час у рознічным гандлі, акрамя аб'ектаў грамадскага харчавання.

Непакоіла ўдзельнікаў пасяджэння і арганізацыя работы па часовай працоўнай занятасці непаўналетніх у вольны ад вучобы час. У тым ліку размова ішла пра маладых людзей, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, а таксама тых, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Анатоль Тозік заўважыў, што многія падлеткі самі не могуць арганізаваць вольны час, таму часта трапляюць у непрыемныя гісторыі. У сувязі з гэтым ён даручыў міністэрствам адукацыі, працы і аховы здароўя ўнесці пашыраныя прапановы аб рэальным уцягванні ў працоўную дзейнасць школьнікаў як мінімум з 14-гадовага ўзросту ў вольны ад вучобы час. «Прыцягваючы непаўналетніх да працы, мы вырашаем адразу некалькі задач: занятасць у вольны час, магчымасць зарабіць грашовыя сродкі, што асабліва актуальна для дзяцей з няпоўных і малазабяспечаных сем'яў», — сказаў **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.** Ён нагадаў пра ўзнаўленне летніх працоўных лагераў, што мела пазітыўны вынік у плане занятасці і было станоўча ўспрынята дзецьмі і моладдзю. «Лічым, што неабходна развіваць працоўныя летнікі», — заявіў міністр.

**Падрыхтавана па інфармацыі БЕЛТА** ■

■ Фабрыка думкі

# «МАЗГАВЫ ШТУРМ» МАЛАДЫХ АНАЛІТЫКАЎ

**80 маладых інтэлектуалаў сабрала другая рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Парадак-2015». Усе яны з'яўляюцца ўдзельнікамі беларускай праграмы па пошуку, адборы і навучанні маладых аналітыкаў для органаў дзяржаўнага кіравання «Разумныя сеткі». Слоган праекта — «Пра палітыку не для кухні і не для форуму».**

Праект быў запушчаны па даручэнні Адміністрацыі Прэзідэнта ў кастрычніку 2012 года, а яго арганізатарамі выступілі Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта, Міністэрства адукацыі, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, БДУ і Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт.

Як прызнаецца **дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Аляксандр БАЗАНАЎ,** першапачаткова яны разлічвалі падабраць для работы ў цэнтры ўсяго некалькі маладых і таленавітых аналітыкаў: «Шчыра кажучы, мы не чакалі, што ў нас у краіне знойдзецца столькі маладых людзей з нестандартнымі, цікавымі, магчыма, нават і крыху фантастычнымі, ідэямі, гатовых займацца аналітыкай прафесійна, з практычнай аддачай для Беларусі і для сябе. Таму праект пачаў імкліва пашырацца...»

Сярод патрабаванняў да ахвотнікаў далучыцца да праекта былі наяўнасць аналітычных здольнасцяў, шырокі палітычны кругагляд і імкненне ствараць аналітычны прадукт для практычнага выкарыстання ў рабоце органаў дзяржаўнага кіравання. Між іншым, конкурс у кастрычніку 2012 года склаў амаль 8 чалавек на месца.

— Для маладых людзей важна, што іх прапановы не пыляцца на паліцах, што яны могуць прыйсці са сваім пунктам погляду, са сваёй ідэяй у гэты праект і быць пачутымі на самым высокім узроўні, што яны могуць весці прамы дыялог з міністрамі, з іншымі работнікамі дзяржаўных структур, прыводзіць свае аргументы, дыскутаваць, — падкрэслівае **намеснік кіраўніка Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра, каардынатар праекта «Разумныя сеткі» Аляксей МАЦЭВІЛА.** — «Парадак-2015» — гэта цыкл з пяці навукова-практычных канферэнцый, у ходзе якіх будуць сфармуляваны выклікі і актуальныя тэндэнцыі, якія ўлічаць пры падрыхтоўцы Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады.

Канферэнцыя ўключае чатыры тэматычныя палі: гэта мадэрнізацыя эканомікі Беларусі, інфарматызацыя і фарміраванне інфармацыйнага грамадства ў Беларусі, дзяржаўная маладзёжная палітыка ў Беларусі, знешняя палітыка і ўдзел Беларусі ў глабалізацыйных працэсах.

Сёння пад эгідай праекта «Разумныя сеткі» створана маладзёжная «фабрыка думкі», якая аб'ядноўвае амаль 150 маладых аналітыкаў ва ўзросце да 35 гадоў. Сярод задач, якімі займаліся ўдзельнікі «Разумных сетак», — распрацоўка праекта Канцэпцыі маладзёжнай кадравай палітыкі, падрыхтоўка тэзісаў Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту ў 2013 годзе. За паўтара года існавання анлайн-суполкі ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» маладыя аналітыкі прынялі ўдзел у абмеркаванні амаль 80 актуальных тэм. Дзяржаўныя органы разглядаюць іх як інтэлектуальны кадравы рэзерв і запрашаюць на работу найбольш актыўных удзельнікаў. Аналітыкі праекта ўжо працуюць у Інфармацыйна-аналітычным цэнтры, у міністэрствах эканомікі і адукацыі.

> **Сярод задач, якімі займаліся ўдзельнікі «Разумных сетак», — распрацоўка праекта Канцэпцыі маладзёжнай кадравай палітыкі, падрыхтоўка тэзісаў Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту ў 2013 годзе.**

Удзел у канферэнцыі ўзялі аўтары індывідуальных праектаў, якія тычацца павышэння эфектыўнасці кіравання дзяржаўнай уласнасцю, удасканалення нарматыўна-прававой базы для работы бізнесу, інфарматызацыі сістэмы адукацыі, мер дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да маладых сем'яў. Напрыклад, праект студэнткі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Дар'і Трыгубавай прысвечаны далучэнню Беларусі да «Руху супраць нянавісці ў інтэрнэт-прасторы». Старт маладзёжнаму праекту даў Савет Еўропы. Над рэалізацыяй кампаніі па барацьбе з мовай нянавісці ў інтэрнэце задумаліся і маладыя беларусы...

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

■ Курсавая розніца

# ВАГАННІ ВАКОЛ СТАНУ СПАКОЮ

**Калі памятаеце са школы, у фізіцы ёсць такое паняцце... Яно вельмі добра характарызуе цяперашні стан валютнага рынку.**

Нацыянальныя рэгулятары ні долара, ні еўра не могуць вызначыцца, што дакладна рабіць далей, а таму курсы гэтых валют то падымаюцца, то апускаюцца адносна адно аднаго. Цікавасць выклікае сітуацыя на нафтавым рынку і яе ўплыў на валюты. Рынак жыве ў чаканні рэзкага зніжэння і нервова ўспрымае розныя галіновыя навіны. Я маю на ўвазе сустрэчу амерыканскага прэзідэнта з каралём Саудаўскай Аравіі. Да чаго яны дамовіліся, невядома, але некаторыя эксперты лічаць, што нафтавыя санкцыі супраць Расіі арабская краіна можа падтрымаць. Акрамя таго, «падкопваюць» пад нафтавы рынак і ізраільскія вучоныя. Нядаўна пайшла пагалоска аб тым, што яны нібыта вынайшлі нейкую новую вадкасць, па сваіх якасцях вельмі падобную да нафты, толькі больш чыстую. Ёсць заявы і аб тым, што вытворчасць такой вадкасці можа прыняць прамысловыя маштабы. Што ж, пачакаем.

А пакуль што Расія робіць свае «крокі» — у дачыненні Украіны і Крыма. Першай павысілі з 1 красавіка на 100 долараў цану на газ. Апошняму абяцаюць шматлікія льготы і прэферэнцыі. Думаю, што на развіццё рэгіёна нядрэнна паўплывае хаця б тое, што прэм'ер-міністр РФ Дзмітрый Мядзведзеў заявіў падчас візіту на паўвостраў аб падатковых льготах для тых кампаній, якія будуць працаваць у Крыме. Што ж тычыцца стану рубля і грыўні, то расійская валюта больш-менш трымаецца на месцы, а ўкраінская б'е рэкорды па зніжэнні.

На беларускім валютным рынку таксама няма асаблівых змен. Айчынная валюта яшчэ трошкі аслабла, і пакуль што тэндэнцыя, хутчэй за ўсё, будзе захоўвацца. На карысць такога погляду пэўны факт — зніжэнне валютнай выручкі. Згодна са звесткамі Нацыянальнага банка, за першыя два месяцы года валютная выручка склала 6,5 млрд долараў, а значыць, знізілася на 553,7 млн долараў — на 7,8% — у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Гэта адбылося з-за змяншэння экспарту.

Увогуле, за гэты тыдзень долар падаражэў на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9900. Еўра патаннела на 10 рублёў (мінус 0,07%) да 13560. А расійскі рубель падняўся на 2 грашовыя адзінкі (плюс 0,7%) да 279.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■

# ЛЕПШАЯ ІНВЕСТЫЦЫЙНАЯ КАМПАНІЯ — БЕЛАРУСБАНК

**У межах IV Міжнароднага форуму «Рынак капіталу Рэспублікі Беларусь» у Мінску адбылася цырымонія ўзнагароджання лідараў айчыннага фінансавага рынку — лаўрэатаў першага конкурсу Cbonds Awards Belarus, паведамляе прэс-служба Беларусбанка.**

Пераможцы і прызёры конкурсу вызначаліся ў пяці намінацыях па выніках інтэрнэт-галасавання ўдзельнікаў фондавага рынку Беларусі і іншых суседніх краін. Трэба адзначыць, што Беларусбанк перамог у самай прэстыжнай намінацыі, бо заваяваў ганаровае званне лепшага інвестыцыйнага банка нашай краіны, а таксама ўвайшоў у лік прызёраў па дзвюх іншых намінацыях — «Лепшая аналітыка па фінансавых рынках» і «Лепшы брокер на рынку аблігацый».

«Атрыманыя ўзнагароды адлюстроўваюць вядучыя пазіцыі Беларусбанка на беларускай фондавым рынку і сведчаць пра высокую ацэнку партнёрамі і кліентамі якасці нашых паслуг. Віншую ўсіх калег, чыя прафесійная праца знайшла адлюстраванне ў гэтай прэстыжнай прэміі», — адзначыла ў сваім прывітальным слове **дырэктар дэпартамента інвестыцый і каштоўных папер Беларусбанка Маргарыта ЛУКАШЭНКА.**

Cbonds — адно з вядучых фінансавых інфармацыйных агенцтваў, якое ажыццяўляе сваю дзейнасць у Расіі, Украіне і Казахстане па напрамках развіцця інфармацыйных сайтаў (cbonds.info, investfunds.ru, preqveca.ru). Яно арганізуе правядзенне фінансавых канферэнцый, «круглых сталоў» і выстаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Вынікі тыдня

# З УЛІКАМ СУСВЕТНЫХ ТЭНДЭНЦЫЙ



*«Хочаш міру — рыхтуйся да вайны» — гэтая старажытная лацінская прымаўка кіруе дзеяннямі сусветных лідараў у апошнія тыдні. Упісваецца ў такую логіку і Беларусь.*

## Камень спатыкнення

Галоўнай інфармацыйнай нагодай, вакол якой разгортваліся міжнародныя падзеі, на мінулым тыдні заставалася сітуацыя ва Украіне. Набліжэнне прэзідэнцкіх выбараў і няздольнасць улады вырашыць самыя вострыя праблемы грамадства спрыяюць далейшай дэстабілізацыі сітуацыі ў рэгіёне. Усход і поўдзень краіны бунтуюць пад прарасійскімі лозунгамі, «Правы сектар» паспрабаваў абвясціць наступны этап рэвалюцыі на Майдане, урад вымушаны прымаць вельмі жорсткія меры эканоміі, якія выклікаюць ўсеагульную незадаволенасць насельніцтва. Адны толькі тарыфы на газ для грамадзян будуць павялічаны на 41%, што, на думку экспертаў, можа справакаваць у краіне «галодныя бунты». Паралельна ідзе праца па павелічэнні пенсійнага ўзросту, скарачэнні сацыяльных выплат, павелічэнні памеру абавязковых выплат з боку насельніцтва.

Гэтая палітычная і сацыяльна-эканамічная нестабільнасць Украіны працягвае правакаваць знешніх гульцоў на больш актыўныя дзеянні ў рэгіёне. Калі Расія пасля крымскага сцэнарыя пазіцыянуе сваю актыўнасць на паўднёва-заходніх рубяжах выключна як вучэнні, то ЗША і краіны НАТА адкрыта заяўляюць, што нарошчванне іх ваеннай прысутнасці ў Прыбалтыцы, Чорным моры, а таксама ў перспектыве — у Польшчы, Румыніі і іншых краінах выклікана імкненнем стварыць процівагу «ваеннай пагрозе з боку Масквы».

Разам з тым глыбокая эканамічная ўзаемазалежнасць Расіі, Еўропы і ЗША не дазваляюць канфлікту прыняць некантраляваны характар. Выступы палітыкаў на мінулым тыдні добра паказалі, што бакі не гатовы ісці на істотныя выдаткі з-за Украіны. Нават міністр замежных спраў Германіі Франк-Вальтэр Штайнмаер заявіў, што Еўрасаюз павінен так змяніць сваю знешнюю палітыку, каб не ставіць краіны рэгіёна перад выбарам «ці Еўропа, ці Расія».

Аднак яшчэ больш, чым жаданне працягваць супрацоўніцтва з Масквой, пазіцыі Еўропы і ЗША падрывае адсутнасць адзінства мэтаў паміж Брусэлем і Вашынгтонам. Калі Еўрасаюз працягвае настойліва выказваць гатоўнасць выйсці на больш высокі ўзровень інтэграцыі з Украінай, то для ЗША такое ўзмацненне Еўропы ўяўляе сур'ёзную пагрозу. Менавіта таму ў Еўрасаюзе і нават у НАТА пануе сапраўднае засмучэнне, выклікаае негатоўнасцю Вашынгтона сур'ёзна нарошчваць ваенную прысутнасць у рэгіёне.

Гэта не значыць, што распачатае глабальнае супрацьстаянне з'яўляецца «несапраўдным» ці будзе не вельмі інтэнсіўным. Проста лініі падзелу ў ім праходзяць больш складана, чым прынята думаць.

## Урады — на змену!

Сур'ёзнасць новай стратэгічнай сітуацыі ў поўнай меры ацаніў такі вопытны палітык, як прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. На мінулым тыдні ён адправіў у адстаўку ўрад Серыка Ахметава і прызначыў прэм'ер-міністрам краіны былога кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Карыма Масімава **(на фота)**.



Паралельна адбыўся яшчэ шэраг змен. Экс-прэм'ер Ахметаў быў прызначаны міністрам абароны. Экс-міністр абароны Адзільбек Джаксыбекаў стаў дзяржаўным сакратаром Казахстана. Кіраўніком адміністрацыі прэзідэнта прызначаны былы спікер ніжняй палаты парламента Нурлан Нігматулін. Пасаду віцэ-спікера Мажыліса заняла дачка Нурсултана Назарбаева Дарыга, якая таксама ўзначаліла парламенцкую фракцыю кіруючай партыі.

Прэзідэнт Казахстана абгрунтаваў прынятыя рашэнні неабходнасцю ўзмацнення працы органаў дзяржаўнага кіравання (і асабліва — урада) перад тварам новых пагроз, якія ўзнікаюць у цяперашняй сітуацыі. Моцным бокам новага прэм'ера эксперты называюць яго здольнасць аднолькава паспяхова знаходзіць паразуменне і з Расіяй, і з Кітаем. Прызначэнне былога прэм'ера на пасаду міністра абароны ўспрымаецца як спроба ўзмацніць гэты стратэгічны ўчастак працы дзяржавы. Прыход на афіцыйную палітычную пасаду старэйшай дачкі Нурсултана Назарбаева адлюстроўвае імкненне казахстанскага лідара кансалідаваць палітычную эліту для працы ва ўмовах турбулентнасці.

Дарэчы, 4 красавіка ў адстаўку быў адпраўлены і ўрад Арменіі — краіны, якая знаходзіцца на шляху да ўступлення ў Мытны саюз. Актыўна абмяркоўваюцца перспектывы адстаўкі ўрада Дзмітрыя Мядзведзева і ў Расіі (зрэшты, ужо не першы год).

## Рэакцыя на напружанне

У Беларусі мінулы тыдзень быў адзначаны актыўным абмеркаваннем на вышэйшым узроўні пытанняў ваеннапрамысловага і тэхналагічнага развіцця краіны. Кіраўнік дзяржавы наведаў ААТ «558 Авіяцыйны рамонтны завод» у Баранавічах, сустрэўся ў Мінску з віцэ-прэм'ерам урада Расіі Дзмітрыем Рагозіным і выказаў сваё бачанне развіцця айчыннай навукі ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Тры галоўныя вынікі названых падзей:

— Беларусь выйдзе на вытворчасць уласнага самалёта ў каапераціі з Расіяй і будзе дамагацца рэалізацыі праекта па будаўніцтве верталёта сумесна з украінскімі калегамі ў Оршы. Акрамя таго, перад дзяржаўным ВПК пастаўлена задача па стварэнні новых відаў бранятэхнікі;

— Верагодней за ўсё, будуць актывізаваны інтэграцыйныя праекты з Расійскай Федэрацыяй у сферы ваеннапрамысловага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. Гаворка ідзе пра інтэграцыю «Пеленга» і «Раскосмаса», «Інтэграла» і «Расэлектронікі», Мінскага завода колавых цягачоў і кампаніі «РТ-Авто», якая ўваходзіць у карпарацыю «Растэх»;

— Будзе адноўлены механізм дзяржаўнага заказу на навуковыя даследаванні. Гэта значыць, будзе зроблены галоўны крок да інтэграцыі навукі з вытворчасцю іператварэння яе ў паўнавартасную частку прадукцыйных сіл грамадства.

Вядома, увядзенне дзяржаўнага заказу на навуковыя распрацоўкі мае не толькі ваеннае, але і камерцыйнае значэнне. Аднак, мяркуючы па сусветным вопыце, ільвіную долю сярэдне- і доўгатэрміновых заказаў на новыя тэхналогіі будзе даваць менавіта ваеннапрамысловы комплекс. Іншымі словамі, Беларусь улічвае існуючыя тэндэнцыі да нарастання геапалітычнай напружанасці як ва Усходняй Еўропе, так і ва ўсёй Еўразіі і ў іншых рэгіёнах свету. Вырашаючы задачы ў сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, Мінск разлічвае атрымаць пры гэтым і станоўчы эканамічны эфект.

**Юрый ЦАРЫК** ■

## А КАК МЕНЯЕТСЯ ЦЕНА НА ГАЗ?

Постановлением Совета Министров №179 от 28 февраля 2014 года проиндексированы для населения субсидируемые государством цены на газ, а также установлена цена на услуги газоснабжения, обеспечивающая полное возмещение экономически обоснованных затрат на их оказание.

Так, для квартир и домов с индивидуальными приборами учета расхода природного газа и отопительными приборами установлены следующие субсидируемые государством цены на природный газ: **530,3** рубля за 1 кубометр в отопительный период (было 520,9 руб.) и **1940,9** рубля за 1 кубометр в летний период (было 1906,6 руб.). Эти цены применяются при потреблении природного газа в календарном году в объеме до 3000 куб. метров. Цена на услуги газоснабжения, обеспечивающая полное возмещение экономически обоснованных затрат на их оказание, установлена на уровне 2362 руб./куб. м.

Теперь стоит вспомнить о постановлении №52, принятом Советом Министров еще в январе прошлого года. В соответствии с этим постановлением при потреблении природного газа **от 3000 до 5500 куб.** метров включительно – применяется цена на газ с повышающим коэффициентом 1,3. Очень важно, что цена с учетом коэффициента **не может быть выше** цены, обеспечивающей полное возмещение экономически обоснованных затрат на оказание услуг газоснабжения. Таким образом, если в **зимний период** при потреблении газа во второй ценовой категории (от 3000 до 5500 куб. метров) цена составляет **689,4 руб./куб. м** (530,3*1,3=689,4) и она еще далека до максимальной, то в **летний период** (1940,9*1,3=2523,2) потребители второй ценовой категории будут платить **по ценам, обеспечивающим полное возмещение экономически обоснованных затрат на оказание услуг газоснабжения, т.е. 2362 руб./куб. м**. С момента потребления природного газа **свыше 5500 куб. метров** применяется цена на услуги газоснабжения, обеспечивающая полное возмещение экономически обоснованных затрат на их оказание независимо от периода года (2362 руб./куб. м).

Решения о начале и окончании осенне-зимнего периода принимают местные органы исполнительной власти. Границы отопительного периода, указанные в решениях, служат основанием для смены тарифов газоснабжающими организациями.

Судя по складывающимся погодным условиям, летний период в этом году начнется с середины апреля (а в некоторых районах области «лето» уже успело простоять несколько дней). А это еще один повод задуматься об экономии.

**Информация УП «МИНСКОБЛГАЗ»**

*УНП 10000877*

■ Спецрэпартаж

# ДОМ ЦВЯРОЗАСЦІ

## Карэспандэнты «Звязды» наведалі спецыялізаваны ізалятар

Урач Васіль ШЧАРБАКОЎ правярае ў «кліента» спецыялізаванага ізалятара пры Першамайскім РУУС сталіцы ўзровень алкаголю ў крыві.



**«21 сакавіка ў Мінску адкрыты прытулак для выцверажэння асоб, якіх затрымліваюць у п'яным выглядзе чыны паліцыі». Менавіта такая абвестка з'явілася ў гарадской газеце 101 год таму. За гэты час сталічныя выцвярэзнікі перажылі закрыццё з-за сухога закону ў пачатку Першай сусветнай і вяртанне, у часы СССР, ды і колькасць іх пастаянна мянялася. Цяпер жа на двухмільённы горад дзейнічае ўсяго адзін выцвярэзнік. Летась у лістападзе ён быў рэарганізаваны ў спецыялізаваны ізалятар пры Першамайскім РУУС.**

Дом, куды прывозяць у Мінску прыхільнікаў Бахуса, адшукаць староннямy чалавеку складана. Ён схаваўся ў глыбіні квартала старой забудовы з яго заблытанай сістэмай нумарацыі. Аднак таямніцу аднаго з двухпавярховых дамоў выдае шчыльны плот ды міліцэйскі аўтобус каля варот.

У дзяжурнай часці спецыялізаванага ізалятара стаяць велізарныя лавы. Адрозніваюцца яны ад звычайных тым, што іх сядзенні вельмі задзіраюцца ўгару. Гэта зроблена для таго, каб п'яныя госці не нанеслі сабе ці іншым траўмы, пакуль да іх дойдзе чарга...

— Медыцынскі агляд пачынаецца яшчэ з пляцоўкі перад уваходам у ізалятар, дзе чалавека, які перабраў, выводзяць з машыны, — гаворыць **урач спецыялізаванага ізалятара пры Першамайскім РУУС Васіль ШЧАРБАКОЎ.** — Ужо па яго першых рухах можна зразумець, наколькі моцна ён п'яны. У гэтым нам дапамагаюць відэакамеры. Між іншым, усталяваны яны ў тым ліку і ў палатах... Падчас асабістай гутаркі імкнёмся высветліць, што чалавек піў і ў якіх дозах.

Цяжэй за ўсё з найбольш «прасунутымі» алкаголікамі. Яны ўжываюць не гарэлку, піва ці «чарніла», а... лекавыя сродкі на спіртавой аснове — настойкі карвалолу ці глогу. Справа ў тым, што яны каштуюць у аптэках значна танней за класічныя напоі «з градусамі» і, да таго ж, адпускаюцца без рэцэпта. А механізм дзеяння іх у «слановых» дозах яшчэ горшы: чалавек пасля ходзіць нібыта дурны некалькі дзён. Васіль Шчарбакоў лічыць, што настоі, якія змяшчаюць спірт, трэба прадаваць па рэцэптах...

### «ТОЛЬКІ ЗА ЛЮТЫ ДА НАС ТРАПІЛА 597 ЧАЛАВЕК»

Тым часам у дзяжурнай частцы праходзіць медыцынскі агляд аднаго з кліентаў. Яго чакае выпіска. У суседнім пакоі сядзіць жанчына, якую даставілі літаральна некалькі хвілін таму.

— Павярніся кругом. Цяпер прайдзі да сценачкі. Заплюшчы вочы. Цяпер дакраніся кончыкам пальца да кончыка носа. Прысядзь. Скаргаў на здароўе няма? Апранайся, — каманды Васіля Шчарбакова гучаць мерна і роўна.

Для «гасцей» тут працуюць чатыры палаты. У кожнай з іх стаіць па пяць акуратна засланых ложкаў з чыстай бялізнай. Адна палата адведзена адмыслова для слабага полу. Аднак супрацоўнікі ізалятара прыгадваюць дзень, калі ў ізалятар даставілі выключна адных жанчын. Самым «п'яным» часам традыцыйна лічыцца ноч напрыканцы працоўнага тыдня і святочныя дні. Зрэшты, тут ёсць выключэнне — Новы год. Але гэта не таму, што людзі п'юць менш, — проста з хаты чалавека забяруць толькі тады, калі ён пачаў дэбашырыць.



**ДАРЭЧЫ**

**7 красавіка ў Мінску не будуць гандляваць алкагольнымі напоямі. Не атрымаецца набыць у краме і піва.**

Выключэннем стануць хіба што кавярні, бары і рэстараны. Але і там моцныя напоі будуць адпускаць выключна ў разліў. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама. Аналагічнае рашэнне, скіраванае на прапаганду здаровага ладу жыцця, прафілактыку п'янства і алкагалізму, прыняў і Брэсцкі гарвыканкам. Праўда, з агаворкай — у адным з магазінаў прадаваць спіртное ўсё ж будуць. Але толькі для ўрачыстасцяў і трызнаў...

— А вось у дзяжурных часцях ложкаў няма. Там для наведвальнікаў стаяць толькі мулкія драўляныя лаўкі. Ды і ў дзяжурнай часці клопатаў больш: яны ж скіраваны на тое, каб аператыўна прымаць паведамленні аб злачынствах. А ў гэты час п'яныя малоцяць у дзверы, пастаянна просяць піць, хочуць у прыбіральню... Таму можна сказаць, што ў нас камфортней, — сумна іранізуе **начальнік спецыялізаванага ізалятара Андрэй СІНЯГУБ.**

Задача перад кліентам стаіць няхітрая — выспацца і пайсці дадому. Але гэта для госця «ціхага». Для тых, хто ў нецвярозым стане любіць пабуяніць, у калідоры стаіць спецыяльнае крэсла з рамянямі.

— На жаль, выкарыстоўваць яго даводзіцца нярэдка, — гаворыць Андрэй Сінягуб. — Калі п'яны пачынае паводзіць сябе вельмі агрэсіўна, супрацоўнікі садзяць яго ў гэтае крэсла і надзейна фіксуюць рукі і ногі. Буян будзе знаходзіцца ў ім да таго часу, пакуль не супакоіцца. Што і казаць: рэч хоць і змрочная з выгляду, затое дзейсная. Людзі «пад мухай» любяць высвятляць адносіны паміж сабой. Бывае і так, што яны імкнуцца справакаваць канфлікт з супрацоўнікамі ізалятара. А ўжо колькі лаянкі перaслухалі — дык можна навуковую працу пісаць.

Кантынгент жа трапляе ў колішні выцвярэзнік самы разнастайны. Не раз бывала так, што ў адным пакоі зранку прачыналіся бізнесмены і хранічныя алкаголікі, студэнты і пенсіянеры... «Зялёны змей» робіць роўнымі ўсіх.

— Адной дзяўчыне трэба было ляцець у Вену. Але яна вельмі баялася самалётаў. Таму, каб крыху прыглушыць страх, перад адлётам вырашыла прыняць «заспакаяльнае», ды не разлічыла дозу. Прачнулася зранку, а самалёт ужо даўно паляцеў...

Такія выпадковыя кліенты трапляюць сюды даволі часта. Ёсць, аднак, у спецыялізаваным ізалятары і пастаянныя кліенты, якія за тыдзень прывозяць па два-тры разы. Узрост гасцей мае толькі мінімальны парог — непаўналетніх у ізалятар не возьмуць.

— Толькі за люты да нас трапіла 597 чалавек, — канстатуе Андрэй Сінягуб. — З іх мы змясцілі 584, астатніх не прынялі па стане здароўя. Па-першае, як гэта ні парадаксальна, у выцвярэзніку няма людзей з цяжкой ступенню ап'янення — большай за 3 праміле. Яна стварае сабой пагрозу для жыцця, такі чалавек павінен знаходзіцца пад бесперапынным кантролем медыкаў. Па-другое, ёсць і медыцынскія супрацьпаказанні.

У ізалятар нельга змяшчаць інвалідаў I і II груп (але гэты статус павінен быць пацверджаны дакументальна), людзей з яўнымі прыкметамі інваліднасці, траўмамі і псіхічнымі захворваннямі. Калі ж дакументаў пры чалавеку няма, а сумненні наконт магчымай інваліднасці застаюцца, то за кліентам вядзецца бесперапыннае назіранне. Карэта «хуткай дапамогі» выклікаецца па патрэбнасці.

### МІНУС 375 ТЫСЯЧ ПЛЮС «ПАДМОКЛАЯ» РЭПУТАЦЫЯ

Як правіла, кліенты «гасцююць» у спецыялізаваным ізалятары ад трох гадзін да сутак. Канчатковы тэрмін залежыць ад колькасці спірту ў крыві: людзей выпісваюць толькі пры нулявых паказчыках на экране алкатэстара.

— Калі п'яны ў стане назваць нумар дамашняга тэлефона або мабільнага родзічаў, то супрацоўнікі ізалятара абавязкова паведамляюць ім аб тым, што здарылася, і просяць прыехаць ды забраць небараку. Праўда, часам даводзіцца чуць з трубкі выказванні кшталту «дзе ляжыць — няхай там ляжыць...», — усміхаецца Андрэй Сінягуб.

У савецкі час «паслугі» выцвярэзніка каштавалі 10 рублёў. Больш за тое, за ноч у ім можна было пазбавіцца партыйнага білета, атрымаць вымову, страціць прэмію — адным словам, нацярпецца «на ўсіх франтах». Цяпер жа платнае працвярэжванне абыдзецца ў дзве з паловай базавыя велічыні. Прыгоды, праўда, на гэтым не скончацца: незадачліваму чалавеку на месца працы ці вучобы пасля прыйдзе «ліст шчасця»... Дык ці трэба рызыкаваць сваёй рэпутацыяй? Пытанне рытарычнае...

З рэарганізацыяй у спецыялізаваным ізалятары кліентаў прыбавілася. Цяпер у двухпавярховы будынак у Інструментальным завулку даcтаўляюць не толькі тых, хто проста валяецца п'яны на вуліцы, але і тых, хто ў нецвярозым стане парушыў закон. А дакладней кажучы, праз артыкулы Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях, якія рэгламентуюць адказнасць за дробнае хуліганства і за распіццё алкагольных напояў у публічным месцы. Толькі пасля таго, як хуліганы працвярэзяцца, іх павязуць у суд: з п'янымі людзьмі, вядома, ніхто размаўляць не будзе.

Але здараецца і так, што ў колішні выцвярэзнік трапляюць людзі, якія не адзін месяц знаходзіліся ў крымінальным вышуку або ўхіляліся ад адміністрацыйнага пакарання. Вось так і атрымліваецца казус: чалавек збег ад правасуддзя, напіўся ад радасці — і ўліп...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Надзеі БУЖАН**

■ Асаблівы свет

# У ГРАМАДСТВЕ ЦІ Ў ЧАТЫРОХ СЦЕНАХ?

## Разуменне — галоўнае, што патрабуецца дзецям з аўтызмам

**По статыстыцы міжнароднай арганізацыі Autism Speaks, адзін з кожных 88 чалавек на планеце — аўтыст. Тры гады таму тая ж арганізацыя прыводзіла іншыя суадносіны — 1 са 150. Рост аўтызму ў свеце ўжо супастаўляюць па маштабах нават не з эпідэміяй, а з пандэміяй.**

Навукоўцы заклапочаны тым, што сапраўдныя прычыны расстройства застаюцца невядомымі. Увогуле свет і сёння не вызначыўся, з'яўляецца аўтызм захворваннем ці не. Ёсць меркаванне, што ў яго аснове ляжаць складаныя арганічныя парушэнні, жахлівыя збоі ў біяхімічных працэсах. Магчыма, аўтызм — гэта лакмусавая паперка сучаснай экалагічнай і сацыяльнай катастрофы?

Даслоўна ў перакладзе з лацінскай мовы «аўтыст» азначае «паглыблены ў сябе». Пры аўтызме парушаецца здольнасць дзіцяці да сацыяльных навыкаў і кантактаў з іншымі людзьмі. Такія дзеці выбудоўваюць сваю сэнсарную сістэму так, каб максімальна мінімізаваць кантакты з навакольным светам. Часта ў іх назіраюцца цяжкасці з маўленнем, ім вельмі складана кантраляваць і праяўляць свае пачуцці. Пры гэтым інтэлект дзіцяці ў некаторых выпадках можа быць нават намнога вышэйшы, чым у яго равеснікаў. Нярэдка людзі, якія церпяць ад аўтызму, могуць бліскуча праяўляць сябе ў творчасці, навуках і іншых відах дзейнасці. Характэрная асаблівасць аўтызму — звышздольнасць чалавека канцэнтравацца на адной пэўнай ідэі, тэме ці мэце. Але аўтызм — вельмі розны. Некаторыя дзеці і сапраўды цяжкія, у іх назіраюцца «адкаты» ў развіцці, яны могуць мець саматычныя захворванні. Іншыя дзеці — фізічна здаровыя і моцныя, з высокім узроўнем інтэлекту, і вызначэнне «хворыя» ім зусім не падыходзіць.

У Беларусі на 1 кастрычніка 2013 года дыягназ «расстройства аўтыстычнага спектра» быў пастаўлены 786 дзецям. Насамрэч такіх дзяцей у дзясяткі разоў больш, проста далёка не кожная сям'я згодна прыняць псіхіятрычны дыягназ дзіцяці і ўсё, што з ім звязана (тым больш што нічога добрага гэты статус не абяцае). Нізкая інфармаванасць спецыялістаў і бацькоў аб ранніх праявах аўтызму становіцца прычынай позніх зваротаў у службу аховы псіхіятрычнага здароўя дзяцей і падлеткаў.

— Аўтызм на сёння невылечны, і ад яго няма лекаў, здольных раз і назаўсёды вырашыць праблему, — тлумачыць **галоўны пазаштатны дзіцячы псіхіятр Міністэрства аховы здароўя, дацэнт кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі БДМУ Ірына ПЯТНІЦКАЯ.** — Галоўнае — гэта ранняя дыягностыка і лячэнне тых псіхічных парушэнняў, якія суправаджаюць або ўскладняюць працяканне аўтызму. Акцэнт робіцца на псіхакарэкцыйную дапамогу і рэабілітацыю, якія здольны змяніць якасць жыцця дзяцей з аўтызмам, паспрыяць іх сацыяльнай адаптацыі. Калі выкарыстоўваць адэкватныя праблемам аўтычных дзяцей умовы, формы і метады навучання, то можна ў значнай ступені знізіць уплыў аўтызму на далейшае развіццё дзіцяці. І ўсё ж карэкцыя дзяцей з аўтызмам лічыцца адной з самых складаных у свеце.

**Сапраўдныя прычыны расстройства застаюцца невядомымі, а карэкцыя дзяцей з аўтызмам лічыцца адной з самых складаных у свеце.**

У Беларусі найбольш актыўную частку бацькоў дзяцей з аўтызмам аб'яднала Міжнародная дабрачынная грамадская арганізацыя «Дзеці. Аўтызм. Бацькі». У маі 2013 года ў Мінску быў створаны каардынацыйны савет, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі камітэтаў па адукацыі, ахове здароўя, працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, а таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Гэта прыклад міжведамаснага ўзаемадзеяння для аказання дапамогі дзецям з аўтызмам. І справа зрушылася з мёртвай кропкі...

**Навучыцца зносінам з дзіцем з аўтызмам тут прапануюць пры дапамозе камп'ютарнай гульні «У майго сябра — аўтызм». Гульня разлічана на школьнікаў, побач з якімі навучаюцца дзеці з аўтызмам.**

У гэтым навучальным годзе ў сталічнай школе № 5 адкрыўся першы інтэграваны клас для дзяцей-аўтыстаў. Галоўнай задачай праекта стала стварэнне і далейшае распаўсюджванне эфектыўнай мадэлі навучання дзяцей з аўтызмам у межах агульнаадукацыйнай школы.

— Мы ўжо можам назваць некаторыя навучальныя ўстановы, якія рыхтуюцца да прыёму «асаблівых» першакласнікаў: гэта сталічныя школы №№ 5, 76, 108, 81 і 104, — распавядае **старшыня савета МДГА «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА.** — Школы знойдуць магчымасць увесці ў штат цьютараў (у штатным раскладзе яны называюцца памочнікамі выхавальнікаў) і стварыць адаптаванае пад асаблівасці нашых дзяцей навучальнае асяроддзе. Мы вельмі ўдзячны Мінгарвыканкаму і Камітэту па адукацыі Мінгарвыканкама за падтрымку нашых праектаў, бо ў іншых рэгіёнах Беларусі сітуацыя з навучаннем дзяцей з аўтызмам куды больш складаная.

**У бліжэйшыя тыдні будзе запушчаны праект «Аўтызм: проста зразумець».** Па словах яго **аўтара Ірыны ДЗЯРГАЧ,** беларускія бацькі ствараюць сайт пра дзяцей з аўтызмам для ўсіх дзяцей і дарослых, якім блізкія паняцці «сяброўства» і «ўзаемная падтрымка», хто прымае ідэі інтэграцыі і інклюзіі.

— Калі мы прывялі сваіх дзяцей у масавыя ўстановы адукацыі, то сутыкнуліся з непаразуменнем іх асаблівасцяў педагогамі, аднакласнікамі і бацькамі аднакласнікаў. Між іншым, разуменне — гэта галоўнае, што патрабуецца нашым дзецям, — падкрэслівае Ірына. — І, як сведчыць вопыт, зразумець іх не вельмі складана. Было б толькі ўзаемнае жаданне паважаць чужую індывідуальнасць.



Як правіла, дзеці-аўтысты развітыя дысгарманічна (яны ідуць наперадзе сваіх аднагодкаў у адной галіне, але значна адстаюць у іншых), таму для іх неабходна складаць індывідуальныя планы навучання, каб была магчымасць развівацца ў тым кірунку, які для іх найбольш перспектыўны і цікавы.

У многіх развітых краінах пры ўмове правільна арганізаванага суправаджэння і навучання дзяцей з аўтызмам вынікі такой работы ўражваюць. Людзі з аўтыстычнымі расстройствамі становяцца дактарамі навук, пісьменнікамі, перакладчыкамі, рэжысёрамі, музыкантамі. І зусім не дзіўна, што амаль чвэрць праграмістаў у карпарацыі «Майкрасофт» — аўтысты...

У наступным навучальным годзе колькасць інтэграваных класаў для дзяцей з аўтызмам плануецца ў Мінску павялічыць.

На гэтым сайце вы знойдзеце гісторыі пра 20 дзяцей, якія вельмі хочуць сябраваць і шукаюць сваё месца ў грамадстве. Гэтыя старонкі будуць рэгулярна абнаўляцца. Для педагогаў там будуць размяшчаць матэрыялы СМІ на тэму навучання дзяцей з аўтызмам у Беларусі і іншых краінах.

Навучыцца зносінам з дзіцем з аўтызмам стваральнікі сайта прапануюць пры дапамозе камп'ютарнай гульні «У майго сябра — аўтызм». Гульня разлічана на школьнікаў, побач з якімі навучаюцца дзеці з аўтызмам, а таксама на ўсіх, хто жадае атрымаць уяўленне пра зносіны з асаблівымі дзецьмі. Дарэчы, сіламі іх бацькоў ствараюцца не толькі камп'ютарныя гульні пра аўтызм, але і пішуцца кнігі. Днямі выйдзе з друку невялікі зборнік казак «Аўтыліус», напісаны мамай дзіцяці-аўтыста.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Супраць наркотыкаў

# ХТО ВЫБ'Е «ДУРАСЦЬ»?

## У краінах, дзе каноплі (і, адпаведна, марыхуана і гашыш) сталі забароненымі, нарказалежныя пачалі шукаць ім легальную замену. Так у 2007 годзе ў шырокім продажы з'явіўся прадукт пад назвай «Spice»



**Вырабляецца ён на тэрыторыі Паўночнай Ірландыі ў выглядзе некалькіх сумесяў, якія прадстаўляюцца легальнымі сумесямі для курэння расліннага паходжання і не даюць станоўчага выніку на наркатычныя пробы. Дзякуючы такой «рэкламе» спайсы атрымалі велізарную папулярнасць сярод курцоў ва многіх краінах свету (нягледзячы нават на тое, што кошт прадукту быў вышэйшы, чым кошт нелегальнай марыхуаны на чорным рынку).**

У 2008 годзе Беларусь разам з іншымі краінамі СНД сутыкнулася з новымі сінтэтычнымі псіхатропнымі рэчывамі пад рознымі гандлёвымі найменнямі («Спайс», «Джа раш», «Крысталіус»).

У выніку ўжывання новых сінтэтычных канабіноідаў летась ва ўстановы аховы здароўя для аказання медыцынскай дапамогі ад наступстваў ужывання курыльных сумесяў было дастаўлена звыш 700 чалавек, зафіксавана 8 лятальных зыходаў.

З 1400 злачынстваў, выяўленых сёлета па лініі нарканкантролю, каля 75 працэнтаў складаюць збыт або захоўванне псіхатропных рэчываў, што змяшчаюцца ў курыльных сумесях.

А вось якой убачылі сітуацыю падчас абмеркавання гэтай праблемы эксперты — намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Васіль ЛОСІЧ, загадчык 21-га наркалагічнага рэабілітацыйнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя Уладзімір ІВАНОЎ і старшыня праўлення грамадскай арганізацыі «Пазітыўны рух» Ганна ЛЮБІНСКАЯ.

### ПРА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ БАРАЦЬБЫ

**Васіль ЛОСІЧ:** — Абарот насення маку на тэрыторыі краіны істотна абмежаваны дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. За апошні тыдзень зарэгістравана ўсяго 9 злачынстваў, звязаных з опійнымі наркотыкамі. Колькасць жа злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам курыльных сумесяў, можа працягваць расці. Як расце і ўдзельная вага непаўналетніх і 18-29-гадовых, якія ўцягваюцца ў падобныя злачынствы. А ўсё таму, што курыльныя сумесі лёгка ўжываць, перамяшчаць, хаваць...

У Беларусі — самая спрошчаная працэдура на забарону новых наркарэчываў. Уведзена паняцце аналагаў наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, вызначаны парадак залічэння рэчываў да такіх аналагаў, устаноўлена крымінальная адказнасць за іх незаконны абарот. Такое новаўвядзенне дазваляе ў досыць кароткі тэрмін ідэнтыфікаваць рэчыва і размясціць на сайце МУС (на наступны дзень з моманту размяшчэння на сайце рэчыва лічыцца забароненым). Такі механізм дазваляе ў разы скараціць час уключэння новых рэчываў у адпаведныя спісы. Аднак практыка паказала, што аднесці да аналагаў можна не ўсе курыльныя сумесі...

Таму наша міністэрства сумесна з іншымі дзяржорганамі, Палатай прадстаўнікоў пачало перапрацоўку Закона Рэспублікі Беларусь «Аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах, іх прэкурсорах і аналагах» — па дапаўненні яго новым паняццем «базавыя хімічныя структуры». Таксама працуем над стварэннем Міжведамаснай антынаркатычнай камісіі пры Міністэрстве аховы здароўя, па рашэнні якой абарот новых непадкантрольных наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў будзе забаронены да іх афіцыйнага ўнясення ў Рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў. Пасля ўнясення такіх змен звыш 98 працэнтаў псіхатропных рэчываў, якія з'яўляюцца ў незаконным абароце, будуць адносіцца да аналагаў, што вельмі павысіць эфектыўнасць барацьбы з курыльнымі сумесямі. Мяркуецца, нам удасца ўзмацніць пакаранне за рэалізацыю наркотыку непаўналетнім, выраб наркотыкаў у лабараторных умовах.

**Уладзімір ІВАНОЎ:** — Чаму поўнасцю нельга забараніць курыльныя сумесі? Таму што межы паміж крымінальным спайсам і звычайнымі цыгарэтамі вельмі размытыя. Таму што немагчыма забараніць цыгарэты. А цыгарэта — тая ж курыльная сумесь. Тытунь не можа прыгожа гарэць — для гэтага да яго трэба дадаць іншыя розныя рэчывы. Вядома каля 200 такіх хімічных рэчываў, сярод якіх ёсць і рэчывы кшталту спайсу. Не трэба забывацца і аб тым, што задача вытворцы — прывесці спажыўца да максімальна хуткай залежнасці. Гадоў сорак таму залежнасць развівалася вельмі працяглы час. Цяпер жа два-тры тыдні эпізадычнага курэння — і дзяўчына ўжо не можа кінуць цыгарэту! Дарэчы, я не бачыў ніводнага спажыўца спайсу, які пачаў бы менавіта з яго. Усе пачынаюць са звычайных цыгарэт.

Па-першае, давайце не блытаць спайсы і маркі. Спайс — курыльная сумесь, маркі — паперка або сапраўдная марка, на якую нанесены мікрадозы «сінтэтыкі». Ад передазіроўкі спайсу, як і ад передазіроўкі цыгарэт, можа, напрыклад, ванітаваць. Загінуць можна пры ўжыванні вельмі высокіх доз. Маркі змяшчаюць такія наркарэчывы, якія выклікаюць цяжкі галюцынаторна-параноідны псіхоз. Дык вось выпадкі гібелі маладых людзей у нас былі звязаны менавіта з ужываннем марак. Размова ідзе не пра наркаманаў са стажам, а пра абсалютна здаровых людзей, у якіх аднаразовае ўжыванне наркотыку выклікала псіхоз...

У маім аддзяленні ёсць 17-гадовы пацыент з Мар'інай Горкі. З яго слоў, нават у гэтым невялічкім гарадку ўсе падлеткі ведаюць, хто распаўсюджвае наркатычную атруту. Ніякіх вам тайнікоў і інтэрнэту. Ты кажаш патрэбнаму чалавеку: «Дай мне «полку» — і працягваеш 100 тысяч. Усё! Абсалютная празрыстая для дзяцей сістэма распаўсюджвання спайсу.

**Чаму нельга цалкам забараніць курыльныя сумесі? Таму што межы паміж крымінальным спайсам і звычайнымі цыгарэтамі вельмі размытыя. Таму што немагчыма забараніць цыгарэты.**

**Васіль ЛОСІЧ:** — Сёння 28 райцэнтраў краіны не маюць прадстаўнікоў наркакантролю. Прычына? У некалькіх этапах скарачэння кадраў. Прычым дзесьці такая пасада не была прадугледжана наогул, паколькі сама тэма не была настолькі актуальнай для невялікіх рэгіёнаў.

### ПРА ЗАЛЕЖНАСЦЬ

**Уладзімір ІВАНОЎ:** — Любы залежны — курэц, опійны наркаман, алкаголік і г.д. — здольны весці поўнасцю цвярозы лад жыцця. І спецыфічныя медыцынскія працэдуры тут ні пры чым. Няма таблетак ад гарэлкі або спайсу. Залежны павінен прыняць рашэнне жыць цвяроза і вытрымліваць пэўную тэхналогію такога ладу жыцця. Сутнасць гэтай тэхналогіі ў тым, каб кардынальна памяняць свае погляды на жыццё. Той, хто курыць, выпівае, колецца, успрымае жыццё і свет як нешта агрэсіўнае і непрыемнае, з-за чаго ўзнікае жаданне адпомсціць і зрабіць непрыемнае ў адказ. Такім непрыемным становіцца рэалізацыя жадання пакурыць, укалоцца, выпіць і... забыцца. Каб пачаць жыць цвяроза, трэба прызнаць, што магчыма жыць інакш. Студэнтка, якая перастала ўжываць псіхаактыўныя рэчывы і падтрымлівае цвярозасць, кажа мне, што ў яе цяпер проста няма свабоднага часу: яна запісалася ў незлічоную колькасць секцый...

Колькасць опійных наркаманаў у Беларусі зараз прыкладна такая ж, як у Галандыі, падобнай на нас па колькасці насельніцтва. У пэўным сэнсе мы дасягнулі нейкага біялагічнага ўзроўню. Мяркуючы па ўсім, такі мае быць. Бо, скажам, абсалютная большасць дарослага насельніцтва ўжывае алкаголь, але абсалютная меншасць становіцца алкаголікамі. Таму ёсць надзея, што вялікага росту опійнай наркаманіі ўжо не будзе. Іншая справа, што ўзніклі сінтэтычныя наркотыкі. І тут пакуль назіраецца рост распаўсюджвання. За чатыры гады існавання праз наша рэабілітацыйнае аддзяленне прайшло каля ста спажыўцоў сінтэтычных канабіноідаў. Апошнім часам у аддзяленні штодня знаходзяцца ад 10 да 15 такіх спажыўцоў. Год таму былі адзінкі.

### ПРА ЗАБАРОНУ

**Уладзімір ІВАНОЎ:** — Што рабіць? Тлумачыць — штодня, пастаянна — пра шкоду такога ўжывання. Хто гэта будзе рабіць? Тыя, хто побач. Бацькі, педагогі павінны быць самі добра інфармаванымі. З другога боку, дарослыя павінны захацець убачыць праблему. Немагчыма ўжываць наркотыкі так, каб у хуткім часе гэта не заўважылі навакольныя. Аднак блізкія наркамана не жадаюць звяртаць на гэта ўвагу. Як жонкі алкаголікаў не жадаюць бачыць праблему сваіх мужоў. Ім не хочацца ўсведамляць неўладкаванасць уласнай сям'і. Убачыць — значыць узяць на сябе адказнасць, пачаць нешта рабіць. Толькі калі залежнасць набывае невыносны характар, тады пачынаецца пошук ратавання. Між тым можна шукаць дапамогі адразу. У нас дзейнічае бясплатны тэлефон даверу: 8 801 100 18 18. Ёсць магчымасць атрымаць важную інфармацыю пра тых жа кампетэнтных спецыялістаў.

**Ганна ЛЮБІНСКАЯ:** — Апошнім часам бацькі тэлефануюць у нашу арганізацыю з дзіўнымі пытаннямі: «Куды мне яго здаць?», «Дайце мне тэлефон людзей, якія выбіваюць дурасць з наркаманаў... Яго паб'юць, і ён перастане ўжываць». Іншая праблема — некаторыя бацькі хоць і заўважылі сам факт ужывання, аднак утойваюць яго, закрываюць вочы. За мяжой, калі людзі выяўляюць падобныя праблемы, то пачынаюць адкрыта гаварыць аб праблеме. Гэта спрыяе талерантнаму стаўленню да людзей з залежнасцямі, дапамагае ім у пошуку выйсця.

### ПРА ПАКАРАННЕ

**Уладзімір ІВАНОЎ:** — Ёсць меркаванне, што неабходна прыцягваць наркаспажыўцоў да адміністрацыйнай адказнасці. Аднак ці магчыма пакараць 150 тысяч нарказалежных? З другога боку, ці магчыма прапанаваць альтэрнатыву — лячэнне і рэабілітацыю? У краіне ж дагэтуль няма палажэння аб рэабілітацыйных цэнтрах... Шэраг іх працуе, але хто як можа, і, па-другое, існуючых магчымасцяў можа аказацца недастаткова.

**Васіль ЛОСІЧ:** — Я лічу, што такая норма адыграла б сваю прафілактычную ролю. Пакуль гэтае пытанне проста выносіцца на грамадскае абмеркаванне. Як неабходна абмеркаваць з грамадскасцю і змены ў заканадаўстве па абмежаванні доступу да сайтаў, якія «гандлююць» наркотыкамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 08 мая 2014 года проводит 8-ой открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 107 | Кабель П-296М № 1 (общая длина кабеля в к-те 10 000 м) 1988 г. 2 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 108 | Кабель П-296М № 4 (общая длина кабеля в к-те 10 000 м) 1988 г. 2 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 109 | Кабель П-296М № 8 (общая длина кабеля в к-те 10 000 м) 1988 г. 2 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 110 | Кабель П-296М № 40 (общая длина кабеля в к-те 10 000 м) 1988 г. 2 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 111 | Кабель П-269М № 382 (общая длина кабеля в к-те 10 000 м) 1988 г. 2 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 112 | Автошасси Урал-375 ш. 408859 дв. 060053 1983 г. 4 кат. 6682 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 113 | Автошасси Урал-375А ш. 384992 дв. 733397 1982 г. 4 кат. 7507 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 114 | Автошасси Урал-375АМ ш. 400787 дв. 868424 1983 г. 4 кат. 6279 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 115 | Автошасси Урал-375АМ ш. 407115 дв. 973192 1983 г. 4 кат. 7180 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 116 | Шнекороторный снегоочиститель ДЭ-210Б №910111 на ш. ЗИЛ-131Н ш. 916104 дв. 9012и201 1991 г. 3 кат. 2653,6м/ч 10156 км | г. Берёза, в/ч 23324 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 112 | Автошасси Урал-375 ш. 408859 дв. 060053 1983 г. 4 кат. 6682 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 113 | Автошасси Урал-375А ш. 384992 дв. 733397 1982 г. 4 кат. 7507 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 114 | Автошасси Урал-375АМ ш. 400787 дв. 868424 1983 г. 4 кат. 6279 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 115 | Автошасси Урал-375АМ ш. 407115 дв. 973192 1983 г. 4 кат. 7180 км | н.п. Новоколосово, в/ч 25819 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 117 | Автошасси Урал-375АМ ш. 404261 дв. 934291 1983 г. 4 кат. 4941 км | г. Крупки, в/ч 63755 (филиал) | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 118 | Автошасси Урал-375АМ ш. 426398 дв. 182462 1984 г. 4 кат. 2196 км | г. Крупки, в/ч 63755 (филиал) | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 119 | Автошасси Урал-375АМ ш. 398683 дв. 883977 1983 г. 4 кат. 5413 км | г. Крупки, в/ч 63755 (филиал) | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 120 | Автошасси Урал-375АМ ш. 439262 дв. 569 1985 г. 4 кат. 3974 км | г. Крупки, в/ч 63755 (филиал) | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 121 | Грузовой Урал-4320 ш. 141431 дв. 564769 1990 г. 4 кат. 164293 км | г. Гродно, в/ч 51171 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 122 | Грузовой Урал-43202 ш. 151452 дв. 630973 1990 г. 3 кат. 68903 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 123 | Автошасси Урал-4320 ш. 079171 дв. 108892 1987 г. 3 кат. 118667 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 124 | Грузовой Урал-4320-0010 ш. 053494 дв. 883202 1986 г. 3 кат. 43638 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 125 | Грузовой Урал-4320-0710-01 ш. 087848 дв. 182695 1987 г. 3 кат. 43463 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **08 мая 2014 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 05 мая 2014 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

---

*Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд №88»*

**18 апреля 2014 года**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Мостоотряд №88»

**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об отмене принятых на внеочередном общем собрании акционеров ОАО «Мостоотряд №88» от 20 февраля 2014 г. решений по реорганизации ОАО «Мостоотряд №88» путем присоединения к ОАО «СМТ №8».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 11 апреля 2014 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения Общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться: в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания – с **15.00** до **15.25** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 18 апреля 2014 года в 15.30.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 10 апреля 2014 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП 100299744

*Наблюдательный совет*

---

**ЗАО «Агрэст» информирует акционеров о проведении очередного собрания акционеров 10 мая 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Филимонова, 2.**

**Повестка дня:** подведение итогов работы за 2013 г., утверждение годового бухгалтерского баланса.

УНН 100266857

---

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Организация:

## Открытое акционерное общество «Эркон»

Вид деятельности: монтаж и изготовление вентиляции, ПНР
Адрес: г. Минск, ул. Карастояновой, 32, пом. 18, тел. 233-16-33, УНН 100191592. Ед. изм.: млн руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2013 г. | За январь–декабрь 2012 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 4 567 | 2 575 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 020 | 4 027 | 2 573 |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 540 | 2 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 540 | 2 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | - | 65 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | - | 60 |
| в том числе: | | | |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 540 | 7 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 133 | 50 |
| Доходы по финансоой деятельности | 120 | 24 | 30 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 150 | 79 | 80 |
| Прибыль (убыток) до налогооблажения | 160 | 619 | 87 |
| Налог на прибыль (±090±150) | 170 | 134 | 24 |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 485 | 63 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 191 | 258 |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 676 | 321 |

Руководитель В.К. Чалов

Главный бухгалтер М.М. Страшненко

Данные отчетности подтверждены аудитором ИП А.В. Поздняков, квалиф. аттестат аудитора № 0000063 от 01.10.2002 г. Выд. Минфином

---

УНП 190816859

**ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве УП «Светоч», ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 07.05.2014 ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ДОЛЖНИКА, впервые выставляемого на торги в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 43, пом. 20.**

**ВПЕРВЫЕ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ НА ТОРГИ:**

1. Копировальный станок «ФК-102» – 2 976 000 руб.
2. Листорезальная машина ЯР-1 – 3 510 000 руб.
3. Ножевой фальцовочный автомат 434-849 – 4 806 000 руб.
4. Ножеточильный станок ТЧН-21-4 – 1 755 000 руб.
5. Одноножевая бумагорезательная машина 1 Сейпа 1 132 – 8 720 000 руб.
6. Процессор по обработке офсетных пластин «ФМО-85» – 2 267 000 руб.
7. Автомашина Волга ГАЗ 3102 – 1 749 000 руб.
8. Оборудование для обработки профиля с аксессуарами – 21 161 000 руб.

Заявки на участие в вышеуказанных торгах принимаются до 05.05.2014 г. С информацией о предметах, порядке и условиях проведения торгов можно ознакомиться на сайте **www.sov.by**, а также по тел.: **+37529 177 55 11.**

---

Утерянные печать, свидетельство о государственной регистрации ООО «Верлон» УНП 490654532 **считать недействительными.**

---

## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

Финансовая отчетность банка в соответствии с НСФО на 1 января 2014 года в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: **www.vtb-bank.by**

УНП 101165625.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3 | 313 784,6 | 231 856,5 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 4 | 2 320 377,9 | 1 823 227,6 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5 | 503 455,7 | 129 229,8 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 6 | 8 644,6 | 39 324,0 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 7 | 5 070 157,6 | 3 877 835,5 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 8 | 445 278,9 | 382 978,9 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 9 | 472,1 | 472,0 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 10 | 380 553,3 | 284 094,9 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 11 | 5 416,8 | 6 736,7 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 12 | 72 255,4 | 81 801,1 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | | 9 120 396,9 | 6 857 557,0 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | 499 129,8 | 493 411,1 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 13 | 3 114 924,9 | 1 984 651,4 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 14 | 4 630 140,0 | 3 766 685,4 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 15 | 14 105,3 | 22 300,2 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 1 282,2 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 16 | 200 866,0 | 86 293,2 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 8 459 166,0 | 6 354 623,5 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 84 370,2 | 84 370,2 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | 34 320,3 | 34 320,3 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 48 891,6 | 16 891,6 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 194 594,4 | 155 896,5 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 299 054,4 | 211 454,9 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 17 | 661 230,9 | 502 933,5 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 9 120 396,9 | 6 857 557,0 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 786 671,4 | 695 500,8 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 509 251,7 | 516 046,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 277 419,7 | 179 454,4 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 338 935,2 | 278 033,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 50 634,7 | 41 192,2 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 288 300,5 | 236 841,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 20 | 6,5 | 1 577,2 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 21 | (40 552,6) | 20 303,0 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 22 | 50 541,0 | 17 341,1 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 23 | 85 240,1 | 102 713,0 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 24 | 39 642,4 | 26 624,7 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 25 | 368 014,9 | 254 983,5 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 26 | 27 799,0 | 19 147,8 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 134 303,5 | 105 297,3 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 15 701,6 | 2 955,0 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 118 601,9 | 102 342,3 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 27 | 421 720 | 363 904 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2012 г. | 3011 | 84 370,2 | 34 320,3 | 16 891,6 | 165 059,9 | 131 755,5 | 432 397,5 |
| 1,1 | В том числе: результат от изменения учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | - | 46 395,0 | 24 141,0 | 70 536,0 |
| 2,1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | х | х | х | 102 342,3 | 24 141,0 | 126 483,3 |
| 2,2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | х | - | - | х | - |
| 2,3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | х | (55 947,3) | х | (55 947,3) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | х | х | х | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | х | х | х | (55 947,3) | х | (55 947,3) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | х | х | х | х | - |
| 2,7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2,8 | Остаток на 1 января 2013 г. | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на конец года | 3013 | 84 370,2 | 34 320,3 | 16 891,6 | 211 454,9 | 155 896,5 | 502 933,5 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3011 | 84 370,2 | 34 320,3 | 16 891,6 | 211 454,9 | 155 896,5 | 502 933,5 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 32 000,0 | 87 599,5 | 38 697,9 | 158 297,4 |
| 5,1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | х | х | х | 118 601,9 | 38 827,9 | 157 429,8 |
| 5,2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | х | 32 000,0 | (32 000,0) | х | - |
| 5,3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | х | - | х | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | х | х | х | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | х | х | х | - | х | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | х | х | х | х | - |
| 5,7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | 130,0 | (130,0) | - |
| 5,8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 867,6 | - | 867,6 |
| 6 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3013 | 84 370,2 | 34 320,3 | 48 891,6 | 299 054,4 | 194 594,4 | 661 230,9 |

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 118 601,9 | 102 342,3 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 38 827,9 | 24 141,0 |
| | В том числе: | | | | |
| 2,1 | переоценка основных средств | 3012121 | | 38 727,3 | 23 810,8 |
| 2,2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 100,6 | 330,2 |
| 2,3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2,4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2,5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | | 40 | 157 429,8 | 126 483,3 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 г. | 2012 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 757 543,0 | 690 520,6 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (490 344,5) | (523 334,2) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 332 904,3 | 266 902,8 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (50 131,9) | (29 774,3) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 6,5 | 1 577,2 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 24 571,5 | 41 093,0 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | 17 341,1 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 20 916,5 | 23 585,1 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (332 478,5) | (247 497,0) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (15 701,6) | (2 955,0) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | | 247 285,3 | 237 459,3 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (7 140,4) | (26 677,4) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (143 703,5) | 144 093,9 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | 29 198,2 | (11 340,0) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (884 256,2) | (669 033,6) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 24 002,0 | (9 355,1) |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | 106 802,2 | 188 423,5 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | | (875 097,7) | (383 888,7) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 5,5 | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 822 121,9 | (999 493,7) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 529 235,5 | 1 484 138,3 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | (8 613,4) | (55 990,7) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (37 043,2) | 1 101,9 |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 69 393,4 | (21 941,8) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | | 1 375 099,7 | 407 814,0 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | 41 | 747 287,3 | 261 384,6 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (99 879,2) | (65 089,3) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 13 009,2 | (5 486,6) |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | (0,3) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | (1 319 999,7) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | 1 319 999,7 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | 41 | (86 870,0) | (70 576,2) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | (55 947,0) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | 41 | - | (55 947,0) |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | 41 | 43 151,3 | 47 577,5 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | 41 | 703 568,6 | 182 438,9 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | х | 631 212,2 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 41 | 1 334 780,8 | х |

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**

**Главный бухгалтер** **М.В. Дудко**

**Дата подписания «20» февраля 2014 г.**

---

EY Совершенствуя бизнес, улучшаем мир

**Ernst & Young LLC**
Korol Street, 51, 2nd floor, office 30
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 209 4535
Fax: +375 (17) 209 4534
www.ey.com/belarus

**ИООО «Эрнст энд Янг»**
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Короля, 51, 2 этаж, офис 30
Тел.: +375 (17) 209 4535
Факс: +375 (17) 209 4534

**Аудиторское заключение независимой Аудиторской организации ИООО «Эрнст энд Янг» по публикуемой годовой отчетности ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), подготовленной по итогам деятельности за 2013 год**

Г-ну Иванову В.В.
Председателю Правления ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Акционерам, Совету директоров и Правлению ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)
Национальному банку Республики Беларусь

Мы провели аудит прилагаемой публикуемой годовой отчетности Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь) (далее «Банк»), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2014 года, соответствующих отчетов о прибыли и убытках, об изменении капитала и о движении денежных средств за год по указанную дату. Данная публикуемая годовая отчетность составлена на основании годовой финансовой отчетности Банка с целью ее обязательной публикации, в соответствии с постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 января 2013 года № 19 «Об утверждении инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга». Годовая финансовая отчетность была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 «О ведении бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь» с изменениями и дополнениями, Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507 «Об утверждении инструкции по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).

*Ответственность руководства за годовую финансовую отчетность и публикуемую годовую отчетность*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и представление годовой финансовой отчетности и прилагаемой публикуемой годовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной годовой финансовой отчетности и прилагаемой публикуемой годовой отчетности, не содержащих существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики; определение обоснованных оценочных значений.

*Ответственность Аудиторской организации*

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной публикуемой годовой отчетности во всех существенных аспектах в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 12 июля 2013 года № 56-З и Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной публикуемой годовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в публикуемой годовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения публикуемой годовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения публикуемой годовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления публикуемой годовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Мнение*

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая годовая отчетность, составленная на основании годовой финансовой отчетности Банка, достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2014 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 «О ведении бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь» с изменениями и дополнениями, Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507 «Об утверждении инструкции по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Поясняющий пункт*

Прилагаемая публикуемая годовая отчетность не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах, помимо Республики Беларусь. Соответственно, прилагаемая публикуемая годовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия годовой финансовой отчетности Банка и прилагаемой публикуемой годовой отчетности требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в финансовой отчетности и публикуемой годовой отчетности.

Лащенко Павел Анатольевич
Директор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 26 октября 2011 года).

Грушевич Олег Владимирович
Аудитор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0001794 от 26 февраля 2010 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 52 от 7 сентября 2010 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 29 августа 2013 года).

Дата аудиторского заключения: 21 февраля 2014 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 21 февраля 2014 года.

Председатель правления ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) В.В. Иванов

Директор ИООО «Эрнст энд Янг» П.А. Лащенко

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения** | **Капитальное строение, инв. № 451/С-4155 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 102,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Ленина, 20** |
| **Примечание** | Лот № 1 находится в аренде, сроком до 30.11.2018 г. |
| **Земельный участок** | 422356300002000194 общей площадью 0,0732 га (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Ленина, 20 |
| **Начальная цена продажи** | 210 000 000 (двести десять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 21 000 000 (двадцать один миллион) белорусских рублей |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «ДОРОРС», 220007, г. Минск, ул. Вокзальная, 17а, тел.: 8-017-225-20-04, факс 8-017-225-60-64, 225-21-62 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 7 мая 2014 г. в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 , каб. 209.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, и заверенные копии учредительных документов;
- *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 2 мая 2014 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by**

■ Бізнес-крок

# Прадпрымальніцтва без мэты не мае шанцаў на развіццё

## Чым вы зможаце пераадолець канкурэнтаў?

**Мы працягваем расказваць аб тым, якім чынам распачаць уласны бізнес. Сёння мы больш падрабязна разбяром мэту, місію і бачанне бізнесу.**



### Візуалізацыя абавязкова

Бачанне з'яўляецца адной з асноў пры стварэнні сваёй справы. Некаму можа здацца, што гэта эмацыянальна-псіхалагічны настрой уласніка бізнесу альбо абавязковы складнік пры стварэнні бізнес-планаў, якія характарызуюць будучую працу бізнесу. Абодва меркаванні будуць правільнымі.

Вы, як уладальнік, павінны разумець, што гэта вельмі каштоўны і важны дадатак да ажыццяўлення вашай мэты. У адрозненне ад фінансавай мэты, у бачанні вы проста мяркуеце, якім будзе рынак, ваш бізнес. Гэта візуальныя асацыяцыі, якія з'яўляюцца ў вашай галаве і якія вы будзеце перадаваць сваім супрацоўнікам, — тое, да чаго вы будзеце імкнуцца. Псіхолагі сцвярджаюць, што для дасягнення пастаўленых мэт практыкаванні па іх візуалізацыі вельмі карысныя. Калі выкрасліць псіхалагічны бок, то бачанне можа выліцца і ў вельмі значны дакумент — канцэпцыю. Пад канцэпцыяй маецца на ўвазе тое, як бізнес функцыянуе, там прапісаны выразна пралічаныя мэты. Канцэпцыя адказвае на самыя галоўныя пытанні: «Як гэта працуе?» і «Як гэта ўсё выглядае?». Таму бачанне ствараецца для агульнага разумення таго, што менавіта неабходна зрабіць усім уцягнутым у бізнес бакам.

### Будзьце карыснымі

Другая аснова стварэння бізнесу — місія. Калі паспрабаваць даць вызначэнне вышэйзгаданага паняцця, то гэта — фармулёўка задач, пастаўленых мэт і карысці вашага бізнесу. Навошта патрэбна фармулёўка місіі? Перш за ўсё таму, што тады ваша дзейнасць стане зразумелай і вашым супрацоўнікам, і кліентам. Гэта будзе гарантыяй таго, што вы не збочыце з задуманага шляху.

### Пастаноўка мэты непазбежная

«Навошта патрэбна мэта, калі ў мяне і так усё добра?» — спытаеце вы. Збольшага вы маеце рацыю. Па сутнасці, мэты патрэбны для таго, каб бачыць кірунак бізнесу ў будучыні. Хутчэй за ўсё, у вас зараз усё добра, ідзе даход і ў справах поспех. Аднак могуць з'явіцца канкурэнты, змяніцца рынак. Вашы кліенты будуць жадаць большага — таго, чаго ў вас пакуль яшчэ няма. І тут мэта абавязкова дапаможа:

1) ведаць кірунак, у якім вы рухаецеся;

2) на асобных адрэзках, як і місія, разумець, ці не збіліся вы са шляху;

3) ці не прыйшоў час зрабіць карэкцыю дзеянняў.

Калі цяпер вы ў самым пачатку, то памятайце: пастаноўка мэты непазбежная. Насамрэч яна мае вельмі важнае значэнне для першых крокаў у бізнесе. У вас павінны быць асабістыя мэты; мэты, звязаныя з рынкам; бізнес-мэты, звязаныя з вашым пачынаннем.

Пры выпрацоўцы асабістых мэт вы павінны зразумець наступнае: «Што ад гэтага атрымаеце менавіта вы?» і «Навошта вы гэта робіце?». Мэты, звязаныя з рынкам, дадуць вам уяўленне аб тым, чым вы можаце рынку дапамагчы, якія праблемы вырашыць. Калі вы разумееце, куды ідзе ваш бізнес і ў чым яго карысць, то атрымліваеце велізарную перавагу перад іншымі. А бізнес-мэты даюць уяўленне аб тым, якім будзе ваш бізнес, як ён вырасце праз некалькі гадоў, ці збіраецеся вы заняцца гэтай справай надоўга. Запомніце: чым лепш вы ўсё сабе ўяўляеце, тым больш сур'ёзна і ўпэўнена вы будзеце кіраваць. Ці можна жыць без мэт? Вядома, можна — зірніце на большую частку людзей. Я прашу вас працаваць з мэтамі. Тады вы будзеце не як усе, а значна больш моцнымі і ўпэўненымі.

**Андрэй МЯСНІКОЎ,**
**бізнес-кансультант, бізнес-трэнер.**

*Калі ў вас ёсць нейкія канкрэтныя пытанні, звязаныя са сваёй справай, дасылайце іх, калі ласка, на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці задавайце па тэлефоне 8 017 292 38 02*

■

■ Ацэнка нерухомасці

# ПАД АДЗІН ГРЭБЕНЬ

## Нацыянальнае кадастравае агенцтва прапануе правесці ў Беларусі масавую ацэнку нерухомасці ўсіх тыпаў

**Дзяржаўны камітэт па маёмасці аб'явіў аб далейшым развіцці сістэмы ацэнкі і пераходу да масавай ацэнкі ўсіх аб'ектаў нерухомай маёмасці — зямельных участкаў і капітальных будынкаў. У сваёй аснове масавая ацэнка нерухомасці абапіраецца на інфармацыю рынку нерухомасці, што робіць яе больш празрыстай, справядлівай і аб'ектыўнай, паведамілі ў прэсслужбе камітэта.**

Пачынаць стварэнне гэтай сістэмы прапануецца з пілотнага праекта, які пройдзе на параўнальна невялікай тэрыторыі Савецкага раёна сталіцы і Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Кіраўніцтва камітэта разлічвае на прыкладзе аднаго пілотнага раёна распрацаваць і апрабаваць метадалогію кадастравай ацэнкі аб'ектаў нерухомасці па ўсіх прызначэннях (жылая сядзібная, жылая шматкватэрная, грамадска-дзелавая і вытворчая нерухомасць). Тут плануецца стварыць дзейны механізм па масавым фарміраванні зямельных участкаў, капітальных пабудоў, ізаляваных памяшканняў, а таксама атрымаць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне выдаткаў на правядзенне ўсіх неабходных мерапрыемстваў для правядзення работ у межах усёй краіны.

Фінансаваць пілотны праект, у выпадку яго прыняцця, плануецца за кошт рэспубліканскага бюджэту. Арыенціровачны тэрмін рэалізацыі яго — 1–1,5 года. У якасці аб'ектаў ацэнкі выступяць аб'екты нерухомасці рознага функцыянальнага выкарыстання: зямельныя ўчасткі, зямельныя ўчасткі з адным ці некалькімі капітальнымі будынкамі, участкі з капітальнымі будынкамі і прыбудовамі, зямельны ўчастак з капітальным будынкам і размешчанымі ў ім адным або некалькімі ізаляванымі памяшканнямі рознага прызначэння і г. д.

Выбар зон для правядзення пілотнага праекта масавай ацэнкі нерухомасці не выпадковы. Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці — сярэднестатыстычны ў краіне, як па памеры тэрыторыі, так і па колькасці зарэгістраваных зямельных участкаў (суадносіны незарэгістраваных зямельных участкаў да зарэгістраваных складае ад 40 да 60%). Аналагічныя суадносіны ў Савецкім раёне Мінска — ад 12 да 88%.

Спецыялісты камітэта ўпэўнены, што апрабаваны на Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці пілотны праект дасць магчымасць у поўнай меры «падбіць» усе нюансы тэхналогіі масавай ацэнкі і масавага фарміравання нерухомасці і зарыентавацць па ўзроўні выдаткаў на правядзенне такой працы ў цэлым для краіны. Акрамя таго, праект дазволіць вызначыць эфект ад выкарыстання вынікаў масавай ацэнкі і масавага фарміравання для розных мэт, вызначыць унясенне неабходных змен у заканадаўчыя акты.

Вынікі масавай ацэнкі будуць выкарыстоўвацца для розных мэт: падаткаабкладання, страхавання, горадабудаўнічага планавання, статыстычнага аналізу рынку нерухомасці для дзяржаўных мэт, ацэнкі нерухомасці, іпатэкі, прыватызацыі, пастаноўкі на бухгалтарскі ўлік, у выпадку пераважнага права выкупу і інш.

На прыкладзе Савецкага раёна горада Мінска найбольш паказальнымі будуць змены падатковых паступленняў у выніку выплаты падатку на нерухомасць, бо рынкавы кошт нерухомасці ў сталіцы з'яўляецца больш высокім, чым у рэгіёнах.

Нагадаю, што сёння ў нашай краіне дзейнічае сістэма масавай ацэнкі зямель, якая створана і развіваецца ў Беларусі з 2000 года. Вынікі кадастравай ацэнкі зямель сёння выкарыстоўваюцца для розных мэт: падатковай базы для зямельнага падатку, арэнднай платы за зямлю, стартавага кошту на аўкцыёнах па продажы зямельных участкаў, платы за права заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка і іншыя. Але існуюць перадумовы і наспела неабходнасць развіцця гэтай сістэмы і пераходу да масавай ацэнкі ўсіх аб'ектаў нерухомай маёмасці — зямельных участкаў і капітальных будынкаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Працяг тэмы

# АДНА БАТАРЭЙКА ЗАБІВАЕ ДВУХ ВОЖЫКАЎ,

## або Як збіраць небяспечныя адходы?

**Экалагічная акцыя «Мы ведаем, як збіраць небяспечныя адходы» адбылася ў Мастах.**

Як ужо паведамляла «Звязда», у рамках праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю ўсёабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь» апрабоўваецца сучасная сістэма паасобнага збору і перапрацоўкі камунальных адходаў. Прычым гэта важна не толькі для Мастоўшчыны — яна можа стаць вопытнай «пляцоўкай» для іншых рэгіёнаў нашай краіны. І гэта датычыцца не толькі спецыяльных кантэйнераў, тэхнікі для збору і сартавання адходаў, але і растлумачальнай працы з мясцовымі жыхарамі. Асаблівая ўвага надаецца школьнікам з разлікам на тое, што яны не толькі самі засвояць правілы граматнага абыходжання з адходамі, але і пазнаёмяць з імі сваіх старэйшых сваякоў.





Летась, напрыклад, школьнікі ў рамках праекта правялі ў Мастах «смеццевую» акцыю, калі дзеці не проста наводзілі парадак у парку на беразе Нёмана, а вучыліся падзяляць смецце на 5 катэгорый — пластык, папера, шкло, біялагічныя і змяшаныя адходы. А нядаўна ўвагу мастоўскіх школьнікаў прыцягнулі да збору небяспечных адходаў — а дакладней, батарэек.

Чым небяспечная батарэйка? Аб гэтым юным мастаўчанам расказаў **Вадзім ЗУБРЫЦКІ, тэматычны каардынатар праекта па пытаннях абыходжання з камунальнымі адходамі:**

— Наша жыццё немагчыма ўявіць без электронных прыбораў (пульты дыстанцыйнага кіравання, мабільныя тэлефоны, планшэты, ноўтбукі і камп'ютары, цацкі і г. д.). І ва ўсіх выкарыстоўваюцца рознага тыпу элементы сілкавання — батарэйкі і акумулятары. За год у адной сям'і, па падліках экспертаў, можа ўтварацца ад 100 да 500 грамаў выкарыстаных батарэек. Іх доля складае каля 50% у агульным аб'ёме таксічных матэрыялаў, што трапляюць у цвёрдыя бытавыя адходы. Прычым калі не сабраць батарэйкі асобна ад іншых адходаў, то зрабіць гэта на палігоне ўжо практычна немагчыма. І далейшыя наступствы, калі яны трапляюць у навакольнае асяроддзе, вельмі сур'ёзныя. Адна так званая пальчыкавая батарэйка здольная атруціць да 1 куб. м глебы альбо 400 літраў вады. Пры гэтым цяжкія металы (цынк, магній, свінец, ртуць…) і іншыя небяспечныя рэчывы, якія ёсць у батарэйках, могуць трапіць у арганізм чалавека, выклікаўшы атручэнні і розныя захворванні. Вось чаму важна сабраць батарэйкі адразу пасля заканчэння тэрміну іх работы.

Збор батарэек з іх далейшай перапрацоўкай — справа вельмі затратная. Беларусь толькі праз нейкі час зможа рэалізаваць гэтыя задумы. На думку Вадзіма Зубрыцкага, трэба вызначыць рацыянальны для краіны варыянт з пункту гледжання экалогіі і эканомікі: будаваць уласную перапрацоўчую вытворчасць для небяспечных адходаў альбо скарыстацца магчымасцямі замежжа? Пры гэтым у любым выпадку неабходна стварыць не фрагментарную, як цяпер (у асобных гандлёвых кропках), а шырокую сістэму збору тых жа батарэек.

На гэта і накіраваны праект у Мастах. На базе раённага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўжо абсталяваны 3 пункты прыёму небяспечных адходаў ад насельніцтва, куды можна здаць адпрацаваныя люмінесцэнтныя лямпы і батарэйкі. Гэтыя пункты аснашчаны адпаведнымі кантэйнерамі для вялікай колькасці адходаў. А каб пашырыць сістэму збору, зрабіць яе для мясцовых жыхароў больш зручнай, патрабуюцца невялікія кантэйнеры з устаноўкай у розных грамадскіх будынках. Якімі яны маглі б быць, прадэманстравалі мастоўскія школьнікі падчас акцыі «Мы ведаем, як збіраць небяспечныя адходы». З кардону, атрыманага ад арганізатараў, яны сабралі спецыяльныя кантэйнеры для збору батарэек. Прычым атрымаліся не «блізняты», а кожны — па задуме аўтара, з малюнкамі і сваім поглядам на праблему, пажаданнямі тым, хто ўбачыць гэты кантэйнер і захоча ім скарыстацца.

Напрыклад, **вучаніца гімназіі № 1 Алёна ВОЛАВА,** работу якой прызналі лепшай, нашу адказнасць перад прыродай выказала так: «Адна батарэйка забівае двух вожыкаў». Яе кантэйнер, дарэчы, забралі ў сталіцу, дзе ён будзе служыць для збору батарэек у будынку прадстаўніцтва ЕС у Беларусі. Па розных адрасах накіраваліся і іншыя кантэйнеры, вырабленыя юнымі мастаўчанамі. Можна не сумнявацца, што калі будзе прапанова, то да гэтай справы з задавальненнем падключацца і дзеці з іншых рэгіёнаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

**Як зменшыць аб'ёмы расходу батарэек і абараніць ад іх навакольнае асяроддзе?**

*— Аддавайце перавагу тэхніцы, якая не патрабуе батарэек, — напрыклад, працуе ад электрычнай сеткі, з механічным заводам (гадзіннікі), выкарыстаннем сонечнай энергіі (калькулятары).*

*— Выкарыстоўвайце батарэйкі (акумулятары), якія вытрымліваюць да тысячы цыклаў зарадкі.*

*— Не выкарыстоўвайце ў адным прыборы батарэйкі розных вытворцаў, рознай ступені разраду, пры ўстаноўцы — сачыце за палярнасцю.*

*— Не варта трымаць батарэйкі на сонцы, карыстацца імі пры моцным холадзе. Каб батарэйка праслужыла больш, давайце ёй «адпачыць».*

*— Купляйце батарэйкі з маркіроўкай «без ртуці», «без кадмію».*

# ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ ПРЫВАТНАЙ АРЭНДЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Другі варыянт прадугледжвае самастойны пошук. Так, у інтэрнэце сёння шмат аб'яў і нават спецыялізаваных рэсурсаў, дзе ўсе будучыя кватаранты «белыя і пухнатыя». Давяраць такой інфармацыі з глабальнай сеткі могуць толькі вопытныя кватэраздатчыкі, якія ведаюць у гэтай сферы ўсе магчымыя «хітрыкі». Таму лепш даверыцца прафесіяналам гэтага сегменту рынку жыллёвай нерухомасці. У прыватнасці, спецыялісты сваімі спецыфічнымі папярэднімі пытаннямі падбяруць вам патрэбнага кліента, а сумніўныя варыянты адкінуць. Больш за тое, грошы за свае паслугі агенцтвы нерухомасці звычайна бяруць не з гаспадароў жылля, а з бескватэрных кліентаў.

### Да афіцыйнага афармлення трэба падыходзіць сур'ёзна

Тут адразу нагадаю, што летась пачаў дзейнічаць адпаведны ўказ кіраўніка нашай дзяржавы, згодна з якім забараняецца здаваць у арэнду жыллё, якое было пабудавана з выкарыстаннем ільготнага крэдыту. Адпаведны дазвол на такую арэнду мясцовыя ўлады могуць даць у выключных выпадках.

Самыя вялікія шанцы на яго атрыманне сёння ў маці-адзіночак: да гэтай катэгорыі слабаабароненых стаўленне больш лаяльнае. Варта спрабаваць і ў тым выпадку, калі вы плаціце за адукацыю дзяцей і можаце гэта дакументальна даказаць. Ёсць рэальныя шанцы на дазвол і тады, калі шмат сродкаў ідзе на лячэнне, альбо калі пасля будаўніцтва жылля адбылося скасаванне шлюбу ці, не дай Божа, смерць уласніка жылля або члена сям'і. У любым выпадку перад тым як аддаваць дакументы на атрыманне дазволу, неабходна сабраць разнастайныя даведкі аб усіх выдатках.

Калі я размаўляў на гэты конт са спецыялістамі мясцовага маштабу, то ў мяне склалася ўражанне, што чыноўнікі проста не падрыхтаваны да такой сітуацыі. Яны нібы баяцца раздаваць дазволы, таму што самі пакуль дасканала не ведаюць, каму можна, а каму — не. Магчыма, перажываюць, што за лішні выдадзены дакумент ад начальства атрымаюць па «шапцы». Так, гэта цяжка, але спрабаваць трэба.

**Гаспадару свабодных метраў здаецца, што знаёмы пастаялец будзе ставіцца да кватэры больш беражліва. А потым такое роднае памяшканне можна ўжо і не пазнаць...**

А тым, хто вырашыў абысці закон, нагадаю, што за здачу кватэры, якая пабудавана па льготным крэдыце, сёння прадугледжаны штраф у памеры ад 4 да 30 базавых велічынь. У тым выпадку, калі на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання парушэнне адбудзецца паўторна, штраф будзе вар'іравацца ўжо ў памеры ад 30 да 50 базавых велічынь. З гэтым разабраліся.

Цяпер мы разгледзім варыянт, калі жыллё пабудавана без дзяржаўнай падтрымкі ці калі ўладальнік цалкам разлічыўся па льготным крэдыце. З дапамогай прафесіяналаў чалавек адшукаў кватарантаў і адправіўся запаўняць дагавор у мясцовы разлікова-даведачны цэнтр жыллёва-эксплуатацыйнай службы. У ЖЭСе юрысты цэнтра дадуць вам тыпавы «дагавор найму жылога памяшкання ў дамах прыватнага жыллёвага фонду грамадзян». Гэты дакумент быў распрацаваны яшчэ ў 2006 годзе, таму спрэчных нюансаў там хапае. Нагадаю, што дагавор запаўняецца і падпісваецца кватарантам, уласнікам кватэры і паўналетнімі грамадзянамі, якія зарэгістраваны ў гэтым жылым памяшканні.

### У дагаворы лепш запаўняць усе пункты

Ужо на другой старонцы дакумента прапануецца запоўніць графу «Наймадавец дае ў карыстанне наймальніку і членам яго сям'і наступную маёмасць». Тут маецца на ўвазе мэбля, нейкія бытавыя прыборы (халадзільнік, тэлевізар, пральная машына) і іншая маёмасць па дробязі. Гэтую графу неабходна запаўняць абавязкова і па поўным дакладным спісе. Бываюць розныя жыццёвыя сітуацыі, а ў судзе разглядаюць выключна дагавор. Калі не прапісана там нейкая маёмасць, значыць, яе і не было. Спецыялісты агенцтваў расказвалі мне шмат з іх практыкі. Напрыклад, пасварыліся гаспадары кватэры з кватарантамі і апошнія з'ехалі. А разам з імі з кватэры зніклі люстэркі, дываны, журнальны столік і нават старая люстра. Менавіта гэтага ў дагаворы і не было.

**За здачу кватэры, якая пабудавана па льготным крэдыце, сёння прадугледжаны штраф у памеры ад 4 да 30 базавых велічынь.**

Самым адказным момантам стане запаўненне пункта 3.2, дзе наймальнік абавязаны «ўносіць плату за карыстанне жылым памяшканнем, а па ўзгадненні бакоў таксама плату за камунальныя паслугі ў тэрмін і ў памеры…» Многія не запаўняюць і гэты пункт, або прапісваюць адпаведныя лічбы толькі часткова. Адзін знаёмы кватэраздатчык паведаміў, што яны з кватарантам дамовіліся аб гэтым палюбоўна. Чатыры месяцы сям'я плаціла спраўна па дамоўленасці, а потым муж пасварыўся з жонкай і з'ехаў. Жанчына з сынам-школьнікам пачала аплачваць толькі камунальныя паслугі, бо ў дагаворы дакладных лічбаў па плаце за карыстанне кватэрай не было. Наколькі мне вядома, яна з'ехала толькі праз шэсць месяцаў, калі скончыўся тэрмін дагавора. Потым быў суд, які знаёмаму грошай так і не вярнуў…

Тут ёсць адзін слушны нюанс. Запісаны ў дагавор узровень аплаты за карыстанне жылым памяшканнем застаецца нязменным на ўвесь тэрмін дзеяння дагавора. Напрыклад, калі ўчора арэнда аднапакаёвай кватэры ў сталіцы ацэньвалася ў 200 долараў, а сёння стала 350, то кватарант будзе плаціць па мінімуме — на працягу года або двух, у залежнасці ад умоў дагавора.

Калі ўважліва пачытаць тыпавы дагавор, то складваецца ўражанне, што дакумент, у першую чаргу, абараняе правы кватарантаў і ў меншай ступені — уласніка жылля. Папершае, паглядзець на стан сваёй кватэры гаспадар можа толькі ў прысутнасці наймальніка і ў час, які неабходна папярэдне ўзгадніць з кватарантам. Аднак кватарант можа «хітрыць» і доўгі час гаспадара ў кватэру не пускаць. У дакуменце падобная сітуацыя ніяк не прапісана. Так, дагавор можа быць скасаваны па ўзгадненні бакоў ці па патрабаванні ўласніка, калі наймальнік не плаціць за жыллё больш чым два разы запар або калі кватарант выкарыстоўвае жылое памяшканне не па прызначэнні. Больш за тое, пры такім «ініцыятыўным» скасаванні дагавора гаспадар жылля павінен за тры месяцы адправіць кватаранту пісьмовае папярэджанне з тлумачэннямі матываў гэтага скасавання. Дык што, каб «папрасіць» дрэннага кватаранта з хаты, трэба, каб ён тры месяцы жыў і не плаціў? А з другога боку, у дагаворы прапісана, што наймальнік можа ў любы час скасаваць гэты дагавор пасля таго, як выканае свае абавязкі перад кватэраздатчыкам.

**Запісаны ў дагавор узровень аплаты за карыстанне жылым памяшканнем застаецца нязменным на ўвесь тэрмін дзеяння дагавора.**

Каб абараніць уласніка жылля ад занадта разумных наймальнікаў, ёсць адно выйсце. Трэба ў гэты тыпавы дагавор унесці дадатковае пагадненне. Вось у гэтым пагадненні дасканала ўсе спрэчныя нюансы і прапісаць. Так, падобную паперу за тры хвіліны не запоўніш, але яна вартая таго.

### Фіксаваны падатак і дэкларацыя

Пасля таго, як дагавор найму жылога памяшкання будзе зарэгістраваны ў юрыстаў ЖЭСа, неабходна стаць на ўлік у падатковай інспекцыі па месцы жыхарства. Спецыялісты інспекцыі дадуць вам рахунак, на які неабходна будзе штомесяц пералічваць фіксаваны падаходны падатак. Нагадаю, што ў сталіцы Саветам дэпутатаў з першых дзён сакавіка падобныя падатковыя стаўкі былі павялічаны.

Такія стаўкі для Мінска вызначаюцца ў залежнасці ад эканоміка-планіровачнай зоны здымнага жылля. Так, стаўка падатку на жылыя памяшканні (за кожны пакой) у першай эканоміка-планіровачнай зоне складзе 200 тысяч рублёў у месяц, у другой — 170 тысяч, у трэцяй і чацвёртай — 140 тысяч, у пятай — 120 тысяч рублёў. Заўважу, што раней за здачу жылля ў першай зоне кватэраздатчык штомесяц выплачваў у бюджэт 135 тысяч, у другой — 110 тысяч, у трэцяй, чацвёртай і пятай зонах — 95 тысяч рублёў.

Тут заўважу, што фіксаваныя памеры падатковых ставак прымяняюцца тады, калі агульны даход прыватнага ўласніка ад здачы памяшканняў за год не перавысіў 37,835 млн рублёў. Гэта сёлета. Па мінулым годзе гранічны максімальны даход ад здачы жылых памяшканняў у арэнду склаў 33,1 млн рублёў. Калі летась гаспадар жылля атрымаў ад такой арэнды большы даход, тады яму неабходна несці дэкларацыю аб даходах па выніках года ў падатковую інспекцыю. Там яму налічаць падатак па стаўцы 12% ад сумы даходу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## КОЖНЫ ДЗЯСЯТЫ ЛІТР — ПАПЯРОВЫ

**Праверкі КДК Гомельскай вобласці ў сельскіх гаспадарках зноў выявілі шматлікія факты скажэння статыстычнай справаздачнасці. Значную колькасць прыпісак валавага надою малака знайшлі ў КСУП «Ельск» Ельскага, КСУП «Беразнянскі» Калінкавіцкага, ААТ «Маісееўка» Акцябрскага раёнаў. Дарэчы, яны склалі практычна дзясятую частку ад агульнага аб'ёму малака, выкрабленага за год.**

Так, у КСУП «Ельск» 217 неіснуючых цялят летась толькі за чэрвень «выпілі» больш як 30 тон неразведзенага малака. Усяго за 2013 год у гаспадарцы прыпісалі больш за 400 тон малака. Тым часам за віртуальны аб'ём была налічана рэальная заработная плата — у суме Br62 млн руб. Там жа выявілі прыпіскі прывагі буйной рагатай жывёлы — больш за 25 тон. У КСУП «Беразнянскі» Калінкавіцкага раёна прыпіскі аб'ёмаў валавага надою малака за 2013 год склалі 328 тон, у ААТ «Маісееўка» Акцябрскага раёна — 62 тоны. У апошнім ужо ў студзені сёлета прыпісана яшчэ 24 тоны малака. Матэрыялы праверак перададзены ў праваахоўныя органы. Сёння ў шэрагу сельгасарганізацый вобласці праводзяцца аналагічныя праверкі, дзе, па папярэдніх даных, маштабы прыпісак таксама вялікія.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**(о проекте строительства жилого дома № 21А (по генплану) объекта «Строительство двух многоквартирных жилых домов серии М464-У1 со встроенным отделением сбербанка, продовольственным магазином и административным помещением на месте жилого дома № 21 по генплану в микрорайоне Каменная Горка-4»)**

**Информация о застройщике**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

| | |
|---|---|
| 1. | Жилой дом № 54 по ул. Матусевича |
| 2. | Жилой дом № 96 по ул. Нестерова |
| 3. | Жилой дом № 29 по ул. Казимировской |
| 4. | Жилой дом № 7 по ул. Киреенко |
| 5. | Жилой дом № 22 по ул. Горецкого |
| 6. | Жилой дом № 26 по ул. Горецкого |
| 7. | Жилой дом № 1 по ул. Прушинских |
| 8. | Жилой дом № 3 по ул. Прушинских |
| 9. | Жилой дом № 5 по ул. Прушинских |

**Информация о проекте строительства**

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе строительство 30% площади для многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлению администраций районов г. Минска, 20% площади из числа обманутых дольщиков на основании списков ОО «Обманутые граждане-дольщики», согласованных с администрацией Фрунзенского района г. Минска, управлением жилищной политики Мингорисполкома, 10% площади для работников ОАО «МАПИД», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Начало строительства – март 2013 г., ввод дома в эксплуатацию – август 2014 г.

Положительные заключения государственной экспертизы № 1096-15/12 от 29.11.2012 г., № 1343-15/12 от 18.02.2013 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Фрунзенский район, жилой дом № 21А по генплану в составе объекта «Строительство двух многоквартирных жилых домов серии М464-У1 со встроенным отделением сбербанка, продовольственным магазином и административным помещением на месте жилого дома № 21 по генплану в микрорайоне Каменная Горка-4».

**Характеристика объекта**

Объект – 120-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом серии М464-10-У1 с помещением банка и магазина, расположенным на первом этаже, не входящим в состав общего имущества дома. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели.

Перекрытия – железобетонные.

Кровля – плоская двухслойная рулонная.

Окна и двери балконные – деревянные с заполнением двухкамерным стеклопакетом.

Двери наружные (в квартирах) – щитовые.

Отопление – центральное.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, для граждан из числа «обманутых дольщиков» и для многодетных семей ОАО «МАПИД», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий,

- с государственной поддержкой – **8 406 000 руб. – для нормативной площади;**

- без государственной поддержки – **8 919 000 руб. – для нормативной площади;**

- для площади, превышающей нормативную площадь, – при строительстве с государственной поддержкой – 8 406 000 руб., – при строительстве без государственной поддержки – 8 919 000 руб.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 4012 от 27 декабря 2012 г., свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 25 февраля 2013 г. № 500/451-6180, от 25 февраля 2013 г. № 500/451-6182. Площадь земельного участка – 0,3089 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие не несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, автостоянка, тепловой пункт, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – август 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 4012 от 27 декабря 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям администраций районов г. Минска, для заключения договора создания объекта долевого строительства предлагается 1 (одна) двухкомнатная квартира общей площадью 53,45 м² жилой площадью 28,67 м², в счет передачи квартир в жилом доме № 6 по генплану в границах улиц Шаранговича, Горецкого.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир.**

Прием заявлений от граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям администраций районов г. Минска, осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник-четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

■ Без тэрміну даўнасці

# ГЕРОЯМІ НЕ СТАЛІ — ГЕРОЯМІ ЗАСТАЛІСЯ

**80 гадоў таму — 16 красавіка 1934 года — пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР было ўстаноўлена званне Героя Савецкага Саюза — вышэйшая ступень адзнакі за заслугі перад дзяржавай, звязаныя са здзяйсненнем геройскага подзвігу. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 475 беларусам і ўраджэнцам нашай краіны.**



Нагадаем, што першымі беларусамі, якія атрымалі пасмяротна званне Героя Савецкага Саюза за гераізм, праяўлены ў баях з фашыстамі ў 1936 годзе ў Іспаніі, сталі танкісты Чырвонай Арміі Павел Купрыянаў, ураджэнец в. Старынцы Полацкага раёна, і мінчанін Мікалай Сяліцкі.

У 1939 годзе першым двойчы Героем Савецкага Саюза стаў лётчык Сяргей Грыцавец, які родам з Навагрудскага раёна. Вызначыўся Грыцавец у баях з фашыстамі ў небе Іспаніі і з японскімі агрэсарамі на рацэ Халхін-Гол.

Адным з першых у пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдастоены гэтага высокага звання лётчык-знішчальнік Аляксей Антоненка, ураджэнец в. Васьковічы Віцебскага раёна, які вызначыўся ў першых паветраных баях з варожай авіяцыяй пры абароне Ленінграда. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб яго ўзнагароджанні выйшаў 14 ліпеня 1941 года.

Шырока вядома імя Героя Савецкага Саюза, славутага лётчыка-знішчальніка, ураджэнца в. Машканы Сенненскага раёна Аляксандра Гараўца. 6 ліпеня 1943 года падчас Курскай бітвы, уступіўшы ў бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі, ён збіў 9 самалётаў. Гаравец — адзіны ў свеце лётчык, які ў адным баі збіў столькі самалётаў ворага.

Яшчэ адзін беларус, Герой Савецкага Саюза Барыс Коўзан, таксама адзіны ў свеце лётчык, які тараніў чатыры варожыя самалёты. Пасля вайны ён жыў у Мінску. Памёр у 1985 годзе.

І, нарэшце, першымі сярод партызан Героямі Савецкага Саюза сталі Ціхан Бумажкоў і Фёдар Паўлоўскі. Акрамя таго, за гераізм і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў тыле ворага, 88 партызан і падпольшчыкаў Беларусі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Толькі 88 з 400-тысячнай арміі народных мсціўцаў. Ці не мала? Тым больш, што з агульнай колькасці Герояў партызан і падпольшчыкаў 43 чалавекі прыпадае на ўраджэнцаў Расіі, Украіны і іншых рэспублік. Імі сталі камандзіры дыверсійных груп і атрадаў, накіраваных у тыл праціўніка па лініі Народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі і ваеннай разведкі, камандзіры партызанскіх брыгад з ліку былых вайскоўцаў Чырвонай Арміі і іншыя.

Гэта зусім не азначае, што не было годных кандыдатур або не было прадстаўленняў з боку камандавання партызанскіх фарміраванняў. Справа ў тым, што сама працэдура прадстаўлення да ўзнагароджання мела складаны і доўгі працэс. У многіх выпадках партызаны чакалі сваю «зорачку» некалькі гадоў, а многія яе так і не атрымалі.

**Назавём імёны актыўных удзельнікаў партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якія не сталі Героямі Савецкага Саюза. Аднак сваімі шматлікімі подзвігамі заслугоўвалі гэтага.**

Прычыны былі рознымі. Неаб'ектыўнасць прадстаўлення, шматступеньчатая сістэма яго праходжання, суб'ектыўнасць асобных чыноўнікаў, а часам прычыны проста невытлумачальныя. Варта адзначыць, што камандаванне партызанскіх брыгад і атрадаў не скупілася на ўзнагароды і засыпала Беларускі штаб партызанскага руху прадстаўленнямі на ўзнагароджанні ад партызанскага медаля да звання Героя Савецкага Саюза.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў кіраўніцтва рэспублікі неаднаразова ставіла пытанне аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза партызанам і падпольшчыкам, якія асабліва вызначыліся. У 1958 годзе адважным падпольшчыцам Віцебскай вобласці Ефрасінні Зяньковай і Зінаідзе Партновай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яшчэ адной беларускай патрыёткі Веры Харужай гэта высокае званне прысвоена ў 1960 годзе.

У 1965 годзе, калі шырока адзначалася 20-я гадавіна Вялікай Перамогі савецкага народа над гітлераўскай Германіяй, Цэнтральны Камітэт КП Беларусі на пасяджэннях прэзідыума тройчы разглядаў пытанне аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза актыўным удзельнікам партызанскай барацьбы ў Беларусі. Спісы на 69 чалавек былі накіраваны ў Маскву на разгляд ЦК КПСС. Сярод прадстаўленых былі камандзіры партызанскіх брыгад і атрадаў, адважныя дыверсанты-падрыўнікі, удзельнікі падполля. На жаль, толькі дванаццаці з іх Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 мая 1965 года было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза: арганізатару Гомельскага падполля Цімафею Барадзіну, мінскім падпольшчыкам Івану Кабушкіну, Мікалаю Кедышку, Яўгену Клумаву, Уладзіміру Амельянюку, юнаму партызану Марату Казею і інш.

Напярэдадні 80-годдзя з дня ўстанаўлення звання Героя Савецкага Саюза і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў назавём імёны актыўных удзельнікаў партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якія не сталі Героямі Савецкага Саюза. Аднак сваімі шматлікімі подзвігамі заслугоўвалі гэтага. Ім і будзе прысвечана новая рубрыка «Звязды» — «Героямі не сталі — героямі засталіся».

### Антон Вікенцьевіч КУЗЬМІЧ

Камісар партызанскага атрада імя Чапаева 225-й брыгады былой Палескай вобласці.

Нарадзіўся ў 1915 годзе ў вёсцы Харомцы Акцябрскага раёна. Да вайны працаваў трактарыстам і шафёрам. 22 чэрвеня 1941 года прызваны ў Чырвоную Армію і накіраваны на фронт. Выходзячы з акружэння, быў паранены і апынуўся ў палоне. Праз месяц уцёк з лагера ваеннапалонных, які знаходзіўся ў Чарнігаўскай вобласці, і прабіўся ў сваю вёску, дзе адразу ўключыўся ў партызанскую барацьбу.

1 лютага 1942 года Антон Кузьміч стаў партызанам атрада, затым камандзірам дыверсійнай групы, а з 15 верасня 1943 года — камісарам атрада. На яго баявым рахунку — 13 пушчаных пад адхон варожых эшалонаў, выведзены са строю броняпоезд, 5 падарваных аўтамашын, 2 чыгуначныя масты і 4 масты на грунтавых дарогах, больш за 200 знішчаных рэек, 16 км тэлефоннай сувязі. У баях Антон Кузьміч асабіста знішчыў 37 нямецкіх салдат, захапіў станковы кулямёт і 5 аўтаматаў, вярнуў сялянам 214 галоў жывёлы, нарабаванай фашыстамі ў насельніцтва.

Як сказана ва ўзнагародным лісце на прадстаўленне камісара да звання Героя Савецкага Саюза, «А. В. Кузьміч вызначаўся мужнасцю і адвагай у баях па разгроме варожых гарнізонаў, засадах, дыверсіях на чыгунцы, у іншых аперацыях, што праводзіліся атрадам і брыгадай». Узнагародны ліст падпісаны кіраўніцтвам Палескага абкама КП (б)Б 28 снежня 1944 года.

### Сцяпан Фёдаравіч ШУПЕНЯ

Нарадзіўся ў 1896 годзе ў вёсцы Нача Крупскага раёна Мінскай вобласці. Удзельнік грамадзянскай вайны, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі былой Баранавіцкай вобласці. Перад вайной працаваў першым сакратаром Шчучынскага раённага камітэта КП (б)Б.

Партызанскую барацьбу ў тыле ворага Сцяпан Шупеня пачаў у ліпені 1941 года ў Тураўскім раёне Гомельскай вобласці. У верасні 1942 года ЦК КП (б)Б накіраваў яго ў Баранавіцкую вобласць у якасці Упаўнаважанага БШПР па Шчучынскім міжрайцэнтры, дзе ён правёў вялікую работу па згуртаванні асобных партызанскіх груп у баявыя атрады і брыгады.

Сцяпан Шупеня шмат увагі надаваў умацаванню дысцыпліны сярод каманднага і асабовага саставу партызанскіх фарміраванняў, наладжванню правільных узаемаадносін партызан з мясцовым насельніцтвам. Дзякуючы растлумачальнай рабоце, актыўным дзеянням партызан грамадзянскае насельніцтва зрывала планы акупацыйных улад па пастаўках збожжа, жывёлы, а таксама мабілізацыі моладзі для адпраўкі ў Германію і для службы ў паліцыі.

Намаганнямі Сцяпана Шупені да восені 1943 года ў Шчучынскай зоне ўжо актыўна дзейнічалі чатыры партызанскія брыгады і адзін асобны атрад, на рахунку якога 295 узарваных эшалонаў праціўніка, 135 разбітых аўтамашын. Пры крушэнні саставаў і ў адкрытых баях сіламі партызан Шчучынскай зоны забіта каля дзевяці тысяч гітлераўцаў, узарвана 75 чыгуначных і шасэйных мастоў, разбураны 42 кіламетры чыгуначных пуцей. У пяці раёнах быў наладжаны выпуск газет, выпушчаны 52 тысячы экзэмпляраў газет і лістовак.

За вялікую працу па арганізацыі партызанскага руху, умелае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі народных мсціўцаў Баранавіцкі абласны камітэт КП (б)Б 15 ліпеня 1944 года прадставіў кандыдатуру Шупені да прысваення звання Героя Савецкага Саюза. Не стаўшы Героем, ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Суворава 2-й ступені, Чырвонага Сцяга і іншымі медалямі. Пасля вайны Сцяпан Шупеня працаваў у апараце Савета Міністраў БССР, займаў адказныя пасады ў народнай гаспадарцы рэспублікі. Памёр у 1979 годзе. Яго імя прысвоена сярэдняй школе ў вёсцы Орша Шчучынскага раёна, што на Гродзеншчыне.

**Генадзь БАРКУН, гісторык**

■

■ Незабыўнае

# ПАМЯЦЬ З ДУМКАМІ АБ БУДУЧЫНІ

## На месцы лагера смерці Трасцянец з'явіцца сучасны мемарыяльны комплекс

**У памяці аб халакосце ў Германіі ёсць сваё імя — Асвенцым. «Да і пасля Асвенцыма» — менавіта так абазначаны пералом у цывілізацыі. Малавядомыя іншыя месцы масавага знішчэння людзей фашысцкімі злачынцамі: Бухенвальд, Дахау, Майданэк, Трэблінка… Не так шмат ведаюць у свеце пра Трасцянец.**




Толькі так было да апошняга часу. Сёння сусветная грамадскасць загаварыла і пра беларускі лагер смерці, дзе былі закатаваны, забіты і спалены дзясяткі тысяч мірных грамадзян, ваеннапалонных чырвонаармейцаў, партызанаў, вязняў і яўрэяў з Германіі, Аўстрыі і Чэхіі. Колькасць забітых і сёння немагчыма падлічыць дакладна: перад адступленнем нямецкіх войскаў нацысцкія каты стараліся знішчыць усе сляды масавых злачынстваў.

Апошнім часам сталі вядомыя новыя падрабязнасці знішчэння мірнага насельніцтва. Аднак у Трасцянцы і дагэтуль няма годнага помніка, які б ушаноўваў памяць ахвяр фашызму. Пра лагер смерці нагадвае хіба абеліск, размешчаны ўздоўж Магілёўскай шашы, невялічкія помнікі ў розных месцах Трасцянца. На каменных плітах не знойдзеш ніводнага прозвішча!

Пра тое, што гэта сумная недарэчнасць хутка будзе ліквідавана і неўзабаве на месцы былога лагера смерці з'явіцца сучасны мемарыял, стала вядома падчас міжнароднай канферэнцыі «На шляху да стварэння мемарыяльнага комплексу ў Трасцянцы», якая прайшла ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ё. Рау. Эксперты з Беларусі, Германіі, Аўстрыі, Чэхіі і Польшчы абмяркоўвалі, якім павінен быць мемарыял, калі ён будзе створаны і за чые сродкі.



Улады Мінска адвялі больш чым 100 гектараў зямлі для стварэння мемарыяльнага комплексу ў Малым Трасцянцы і ўхвалілі праект галоўнага архітэктара праектаў ландшафтнай архітэктуры «Мінскпраект» Ганны Аксёнавай. Сучасныя помнікі будуць усталяваны на месцы крэматорыя ў Шашоўцы і хлява ва ўрочышчы Трасцянец. Часткай будучага мемарыяла ў Трасцянцы стане асобны помнік у Благаўшчыне — на тым самым месцы, дзе, у асноўным, былі забіты яўрэі з Мінскага гета, а таксама дэпартаваныя яўрэі з Германіі, Аўстрыі і Чэхіі. Ідэя ўшанаваць трагічнае месца, якое знаходзіцца літаральна праз дарогу ад лагера смерці, належала Леаніду Левіну. Яе рэалізацыя ўжо ажыццяўляецца ў творчай майстэрні камандай вядомага архітэктара.

— Для рэалізацыі першай стадыі праекта Мінскім гарвыканкамам ужо выдаткавана 200 тысяч еўра, — зазначыў **дырэктар Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ё. Рау Віктар БАЛАКІРАЎ.** — Падтрымаць будаўніцтва мемарыяла фінансава выказаў жаданне і нямецкі бок. Дортмундскі міжнародны адукацыйны цэнтр звярнуўся да кіраўніцтва шасці гарадоў, адкуль падчас вайны дэпартавалі яўрэяў у Мінск, з просьбай прыняць удзел у фінансаванні. Пастаўлена задача сабраць 1 мільён еўра для рэалізацыі сумеснага праекта. Сёння Дортмундскі цэнтр ужо валодае паловай гэтай сумы. Астатнюю частку мяркуецца атрымаць ад міністэрства ўнутраных спраў ФРГ, дзе галоўным аргументам стане тое, што сучасная Федэратыўная Рэспубліка Германія з'яўляецца пераемніцай Трэцяга рэйха.

Ужо ў красавіку пачнецца першапачатковая праца над стварэннем мемарыялу. Аднак на хуткую рэалізацыю ўсяго праекта разлічваць не прыходзіцца. Будаўніцтва мемарыяльнага комплексу пройдзе паэтапна. Спачатку запланаваны работы па стварэнні месца памяці ў самім Трасцянцы, затым — ва ўрочышчы Благаўшчына, і толькі потым трэба будзе стварыць ці падземны пераход, ці спецыяльны мосцік, які злучыць гэтыя два аб'екты. Па падліках спецыялістаў, поўная рэалізацыя праекта мемарыяльнага комплексу разлічана на 10 мільёнаў еўра. Улічваючы тое, што сёння няма і паловы ад гэтай сумы, можна меркаваць, што паўнавартасны мемарыяльны комплекс у Трасцянцы мы ўбачым не хутка.

Верагодна, хутчэй стане магчымым рэалізаваць праграму знаёмства еўрапейскай моладзі з ваеннай гісторыяй Беларусі, у тым ліку з трагедыяй Трасцянца. У сваю чаргу, мяркуецца распрацаваць праграмы, па якіх беларуская моладзь, а таксама госці з Расіі і Украіны змогуць пазнаёміцца з аналагічнымі лагерамі смерці ў Заходняй Еўропе.

— Надзвычай важна, каб такія гістарычныя месцы, як Благаўшчына і Трасцянец, у мяне на Радзіме былі вынесены на шырокае грамадскае абмеркаванне і апынуліся ў цэнтры ўвагі, — падкрэсліў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь Вальфрам МААС.** — Кожны чалавек або кожная краіна, якая была закранута такім цяжкім лёсам ці такімі ж падзеямі, зможа скарыстацца гэтым мемарыялам як нагодай, каб яшчэ раз абдумаць сваю трагічную гісторыю. Памерлых мы ўжо не вернем, але зможам прадухіліць такое развіццё падзей, калі памяць аб іх можа цалкам сцерціся як з карціны свету, так і з гісторыі. Таму надзвычай важна стварыць мемарыял, прысвечаны ахвярам, якія скончылі там сваё жыццё, і вельмі падрабязна апісаць іх апошні шлях. І калі мы гаворым пра такія мемарыялы, то трэба ўсведамляць, што гэта не толькі месцы, якія вяртаюць нас у мінулае. Сэнс іх стварэння заключаецца ў тым, каб думаць пра нашу будучыню.

Дарэчы, сёння вядзецца вялікая праца па аднаўленні імён ахвяр Трасцянца. Пайменна ўжо можна назваць трэцюю частку вязняў. Астатнія і да гэтай пары застаюцца невядомымі. Невыпадкова адным з першых крокаў на шляху стварэння мемарыяльнага комплексу ў Трасцянцы стане закладка капсулы з імёнамі загінулых. Адбудзецца гэта сёлета — 8 чэрвеня — на тэрыторыі былога лагера смерці ў прысутнасці грамадскасці з Беларусі, Германіі, Аўстрыі, Чэхіі, Расіі, Польшчы і Ізраіля. І з гэтага дня мемарыял, які з'явіцца ў Трасцянцы, павінен будзе стаць месцам выказвання смутку і ўшанавання памяці тых, хто тут пайшоў у апошні шлях.

**Вераніка КАНЮТА**

■

■ Ёсць рэсурс

# «АФГАНІСТАН. БЕЗ ПРАВА НА ЗАБЫЦЦЁ»

## Дзякуючы беларускім бібліятэкарам украінскія воіны-інтэрнацыяналісты больш як праз чвэрць стагоддзя знайшлі звесткі пра баявога таварыша

**Цяпер аднапалчане дакладна ведаюць, дзе ён жыў і чым займаўся пасля ваеннай службы ў далёкай краіне. І вельмі ўдзячны за атрыманую інфармацыю стваральнікам электроннага рэсурсу, прысвечанага вайне ў Афганістане. Яго прэзентацыя адбылася ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя Леніна. Каля года патрачана, каб стварыць насамрэч унікальны электронны рэсурс «Афганістан. Без права на забыццё».**

— Ён створаны да 25-й гадавіны вываду савецкіх войскаў з Афганістана і прысвечаны воінам-інтэрнацыяналістам Віцебшчыны. База даных стала вынікам рэалізацыі праекта, які ажыццявілі супрацоўнікі нашай бібліятэкі пры дапамозе Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане і Віцебскага гарадскога музея воінаў-інтэрнацыяналістаў, — расказвае **дырэктар бібліятэкі Аляксандр СЁМКІН.**

Паводле яго слоў, рэсурс, які размешчаны на сайце бібліятэчнай установы, наведваюць шмат карыстальнікаў інтэрнэту. Водгукі самыя добрыя. Людзі дзякуюць, што з яго дапамогай можна адшукаць тых, з кім разам выконвалі інтэрнацыянальны доўг. Вось і «афганцы» з Украіны ўрэшце даведаліся, што пасля той вайны стала з іх аднапалчанінам.

— Галоўная мэта, якую мы вызначылі для сябе, — аддаць даніну павагі воінам, якія сумленна выканалі свой інтэрнацыянальны доўг, а таксама ўвекавечыць памяці загінулых і памерлых ад ран. Адразу хачу ўдакладніць, што рэсурс — класічная і структураваная база даных. І не прадугледжвае наяўнасць розных форумаў. Ён уключае ў сябе матэрыялы з кніг, публікацыі, фатаграфіі, лісты воінаў і сваякоў і іншыя дакументы… Персаніфікаваную інфармацыю прадаставілі «афганскія» арганізацыі і віцебскі абласны камісарыят, а таксама раённыя камісарыяты. Ёсць там і раздзел «Вайсковыя фарміраванні Віцебшчыны ў афганскай вайне». Для Віцебска вайна ў Афганістане мае асаблівае значэнне, таму што 103-я паветрана-дэсантная дывізія першай увайшла ў Афганістан і менавіта яе воінскія фарміраванні пакінулі краіну апошнімі. Лётчыкі 339-га авіяцыйнага палка ажыццяўлялі тэхнічную падтрымку: перавозілі асабовы склад, грузы, ваенную тэхніку. Сваю старонку ў ваенныя падзеі ўпісаў і 402-гі цяжкі бамбардзіровачны авіяцыйны полк, які дыслацыраваўся ў пасёлку Балбасава Аршанскага раёна. У 1994 годзе гэта воінскае фарміраванне расфарміравалі. Раздзел «Воіны-інтэрнацыяналісты Віцебскай вобласці» — самы вялікі па аб'ёме, а час працы над ім быў самым складаным — у сэнсе пошуку і ўдакладнення інфармацыі. У гэтым раздзеле некалькі тысяч прозвішчаў. Уся інфармацыя згрупавана ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам вобласці і месцам пастаноўкі на воінскі ўлік. Персанальная інфармацыя аб кожным воіну прадстаўлена невялікай біяграфічнай даведкай, — падзялілася нюансамі распрацоўкі рэсурсу **Таццяна АДАМЯН, намеснік дырэктара па бібліятэчнай рабоце.**




Цікава, што ў спісе герояў і Павел Грачоў, камандзір 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі (у складзе 40-й арміі. — **Аўт.**), які з 1992 па 1996 гады быў міністрам абароны Расійскай Федэрацыі.

— Па папярэдніх даных, больш за 6 тысяч удзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане — з нашай вобласці. Што да колькасці тых, хто загінуў, — раней лічылася, што іх 151, цяпер устанавілі прозвішчы 160 чалавек. Некаторыя пахаваны за межамі нашай вобласці, але гэта нашы землякі: вучыліся, працавалі або жылі на Віцебшчыне… Праца над папаўненнем рэсурсу будзе працягвацца, — расказаў **Валяр'ян МАЦКЕВІЧ, старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане.**

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ Землякі

# «СЛУЦКІ СЛЕД» У КОСМАСЕ

**Случчына заўжды славілася таленавітымі людзьмі ў розных галінах: мастацтве, ткацтве, культуры і нават космасе. Пра гэта можна даведацца з экспазіцыі «Случчане і космас», што працуе ў Слуцкім краязнаўчым музеі.**

— Звыш 30 нашых землякоў на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў займалі розныя кіруючыя пасады ва ўстановах, якія нямала зрабілі па асваенні космасу, — расказвае вядучы навуковы супрацоўнік музея Васіль Цішкевіч. — У свой час выконвалі абавязкі начальніка касмадрома «Байканур» генерал-палкоўнік Канстанцін Герчык і генерал-лейтэнант Юрый Жукаў. Канстанцін Васільевіч удзельнічаў у запуску першага штучнага спадарожніка Зямлі, а таксама касмічных караблёў. У 1960-м, падчас дзяржаўных выпрабаванняў балістычнай ракеты, на палігоне здарылася аварыя, загінула шмат людзей, многія атрымалі цяжкія апёкі. Але ён здолеў вярнуцца да службы, узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, яму прысвоена Ленінская прэмія. Дарэчы, яго стрыечны брат, інжынер-канструктар Данііл Герчык таксама нарадзіўся ў вёсцы Сарогі, працаваў у падмаскоўным Рэўтаве ў канструктарскім бюро акадэміка Чаламея, дзе займаліся касмічнымі сістэмамі і крылатымі ракетамі марскога базавання.

Юрый Жукаў узначальваў касмадром «Байканур» з 1983 па 1989 год, кіраваў пускам карабля «Энергія-Буран». Менавіта пры ім апрабоўвалі і новую ракету-носьбіт «Зеніт», вяліся пілатаваныя палёты па праграме «Інтэркосмас». Памёр Юрый Аверкіевіч у Смаленску 19 сакавіка 2010 года. Да апошняга часу ён падтрымліваў сувязь са сваёй малой радзімай. Супрацоўнікі музея да Сусветнага дня касманаўтыкі і авіяцыі ладзілі са славутым земляком прамую сувязь, і ўдзельнікі мерапрыемстваў маглі асабіста па тэлефоне пагутарыць з ім, задаць свае пытанні.

Выдатны астраном, дырэктар Маскоўскай абсерваторыі, прафесар Вітольд Цэраскі — выпускнік Слуцкай гімназіі № 1 (ці, як яе называюць, «Слуцкіх Афін»), якая хутка адзначыць сваё 400-годдзе. Менавіта ён заснаваў маскоўскую школу астраноміі, распрацаваў методыку фотаметрычных назіранняў, што дазволіла вымераць бляск звыш 500 зорак, вызначыць зоркавую велічыню Сонца і верхнюю мяжу яго тэмпературы — 3500 градусаў. Вітольд Карлавіч адкрыў у 1885 годзе такую з'яву, як серабрыстыя аблокі, што свецяцца ноччу. У гонар славутага вучонага названы малая планета і кратар на Месяцы.

Імя яшчэ аднаго вядомага случаніна ўвекавечана ў назве другога кратара начнога свяціла. Сямён Косберг — галоўны канструктар вадкасных ракетных рухавікоў. Менавіта яны выводзілі ў адкрытую прастору пілатаваныя касмічныя караблі, штучныя спадарожнікі Зямлі і аўтаматычныя міжпланетныя станцыі. Пасля свайго славутага «Паехалі!» Юрый Гагарын усклікнуў: «Косберг спрацаваў!». Сакрэтным Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Сямён Арыевіч быў удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Загінуў ён у аўтакатастрофе ў 1965 годзе.

Яшчэ адна легендарная асоба — Канстанцін Давідоўскі, штурман экіпажа «Месяцаход-1». На адной з сустрэч у Слуцкім краязнаўчым музеі Канстанцін Канстанцінавіч расказаў, што ў сакавіку 1971-га вырашыў павіншаваць жанчын з іх святам незвычайным чынам. Ён разлічыў шлях апарата так, каб той вывеў коламі на грунце нябеснага свяціла «8 Сакавіка». Але ў выніку з'явілася толькі «сакавіка»: не хапіла энергіі. (Наступны сеанс зарадкі павінен быў адбыцца толькі на наступны дзень з узыходам сонца.) Няпоўнае віншаванне было прадэманстравана калегам на фотаздымку… Канстанцін Давідоўскі трагічна загінуў у 2004 годзе.

На Слуцкай зямлі нарадзіўся і Ігар Шаўчук, які працаваў генеральным дырэктарам эксперыментальнага завода ААТ «Тупалеў», затым — старшынёй савета дырэктараў, генеральным канструктарам. Ігар Сяргеевіч — ганаровы авіябудаўнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі. Яго не стала ў 2011 годзе. Аляксандр Куніцкі — начальнік кафедры балістыкі акадэміі імя Дзяржынскага, аўтар больш як 80-ці навуковых прац. Яўген Жалкоўскі — прафесар, загадчык лабараторыі Інстытута фізікі Зямлі (Расійская акадэмія навук). Валерый Канцоў з 1979-га па 1999 год служыў на касмадроме «Байканур» і займаўся будаўніцтвам аб'ектаў, якія мелі дачыненне да космасу.

У экспазіцыі музея шмат цікавых экспанатаў. Гэта, напрыклад, павялічаная каляровая фотакопія карты зорнага неба XVII стагоддзя Ілы Капіевіча. Падчас паездкі цара Пятра І па Еўропе беларус быў у яго перакладчыкам і па даручэнні імператара вывучаў размяшчэнне зорак на небе. У выніку з'явілася карта, якая выкарыстоўвалася ў марскіх паходах.

З кожным годам экспазіцыя пашыраецца, папаўняецца новымі матэрыяламі і прадметамі. І ўжо сёння яна можа прэтэндаваць на статус асобнага музея.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

# КРЫНІЦА З БОЖАЙ ЛАСКІ

## Санаторый «Радон»: 20 гадоў працы дзеля здароўя людзей

**Хто сказаў, што наша зямля і мы, яе жыхары, бедныя і пастаянна залежым ад больш багатых суседзяў? Такая думка ўбівалася ў галовы тымі, хто бачыў у нас то «крэсы ўсходнія», то «адсталыя ўскраіны заходнія», для таго, каб выглядаць лепш самім. Але не верце ім, гэта няпраўда! І сёння служыць беларускаму народу спадчына, пакінутая Скарынам, Цяпінскім, Будным, Сапегам, Радзівіламі, Ільінічамі, Кішкамі, Агінскімі... А ўжо ў гады нашай дзяржаўнай незалежнасці ўмацавалі свае пазіцыі такія знакамітыя брэнды, як «МАЗ», «МТЗ», «Белкалій», «Гродна Азот» і многія іншыя. Сёння мы павядзём гаворку пра яшчэ адну жамчужыну нашай Айчыны — крыніцу радонавай вады каля вёскі Рыбакі Дзятлаўскага раёна. Тут, сярод соснаў і бяроз, у экалагічна чыстай зоне, у месцы суткі рэк-прыгажунь Моўчадзь і Панікве, якія маюць крынічную аснову і не забруджваюцца ніякімі сцёкамі, ужо 20 гадоў дадзенае нам ад Бога радовішча па-гаспадарску выкарыстоўвае дзеля здароўя людзей калектыў аднаго з буйнейшых філіялаў ААТ «Белагразраўніца» — санаторыя «Радон».**

### У ЧЫМ ГАЮЧЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ РАДОНУ?

*Галоўным кампанентам радонавай вады з'яўляецца радон — інертны газ, які ўтвараецца пры распадзе радыю. Лячэбнае ўздзеянне аказвае альфа-выпраменьванне гэтага газу і прадуктаў яго распаду. Радонавая вада садзейнічае нармалізацыі ўсіх відаў абмену ў арганізме, аказвае абязбольваючае, процізапаленчае і заспакаяльнае дзеянне. Па механізме дзеяння радонатэрапія — гэта адзін са спосабаў стымуляцыі ахоўных сіл арганізма, яго супраціўляльнасці да розных захворванняў, у тым ліку анкалагічных.*

Гідрамінеральная база радонавай вады санаторыя «Радон» прадстаўлена чатырма свідравінамі глыбінёй ад 285 да 307 метраў. Канцэнтрацыя радону каля 40 НК/л — найлепшая для выкарыстання ў лячэбных мэтах.

**Профіль санаторыя «Радон»:** лячэнне захворванняў касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, нервовай сістэмы, мочапалавой сферы, жаночых палавых органаў, бясплоднасці сямейных пар.

**Профіль дзіцячага аддзялення «Баравічок»:** лячэнне захворванняў касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, органаў кровазвароту, дыхання, стрававання, нервовай і мочапалавой сістэм.

Сёння «Радон» — гэта сучасная, аўтарытэтная не толькі ў Беларусі здраўніца, неаднаразовы пераможца рэспубліканскага конкурсу «Брэнд года». А пачыналася ўсё з праблемы, з-за якой спачатку ніхто і не прагназаваў будаўніцтва санаторыя. Узнікла яна... у адным з калгасаў.


З праектам рэканструкцыі лячэбнага аддзялення знаёміць галоўны ўрач санаторыя Леанід КАРПІШЭВІЧ.

### ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ВАДЫ

**Ініцыятар і адзін з аўтараў гэтай публікацыі Уладзімір Міхайлавіч ЛОГАШ** прыгадвае:

— У 1967 годзе мне давялося кіраваць будоўляй Лідскага лакафарбавага завода. Пры гэтым стварыўся моцны водазабор з падземных крыніц: на трох свідравальных установках працавалі рабочыя мінскага трэста «Прамбудвод» на чале з прарабам Сямёнам Брэслерам. І раптам... Неяк раніцай прыходзіць ён на планёрку і паведамляе, што начальства патрабуе перакінуць адну ўстаноўку ў калгас «Расія» Дзятлаўскага раёна, бо там на малочнай ферме выйшла са строю свідравіна і каровы засталіся без вады. Вядома, мы павінны дапамагчы сялянам. А неўзабаве Брэслер паведаміў, што новая свідравіна ў калгасе зроблена. Прычым яна нават фантануе — вада выліваецца на паверхню. Пасля аналізу аказалася: радон!!! Доўга потым Сямён казаў мне: «Бачыш, я зрабіў адкрыццё на тваёй малой Радзіме». І я гэтым ганаруся: якім жа багаццем надзяліла прырода маю родную зямлю!

Вось так чыста тэхналагічныя аспекты прыроднай крыніцы ўзаемазвязаны і з духоўнымі, патрыятычнымі пачуццямі.

### ПАД АПЕКАЙ СВЯТОГА ПАНЦЕЛЯЙМОНА

Уладзімір Логаш — ураджэнец вёскі Ахонава, якая знаходзіцца за тры кіламетры ад санаторыя «Радон»:

— Вядома, у гісторыі з адкрыццём радонавай крыніцы быў элемент выпадковасці, але адбылося гэта па волі Божай. У маёй роднай вёсцы, былым цэнтры сельсавета, ёсць царква, якая ў мінулую вайну была спалена партызанамі, а нядаўна адбудавана. Дык вось, у старыя часы двойчы ў год у гэтых мясцінах ладзіліся фэсты — 22 мая (дзень святога Мікалая) і 9 жніўня (дзень святога Панцеляймона), калі царква і прыхаджане іх ушаноўвалі. А святы Панцеляймон, як вядома, з'яўляецца апекуном дактароў і медыцыны. І хіба ж выпадкова, што менавіта каля вёскі Рыбакі, якая ўваходзіць у гэты царкоўны прыход, выявілі гаючую ваду і стварылі ўнікальную здраўніцу? Гаворачы словамі Наталлі Арсенневай, тут рассыпаліся праменні Божай хвалы.

Непадалёк ад санаторнага корпуса, на месцы свідравіны радону пабудавана каплічка, якая была асвечана **епіскапам Навагрудскім і Лідскім, намеснікам Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра ГУРЫЕМ.** Неўзабаве тут установяць бювет, бо радонавая вада выкарыстоўваецца не толькі для вонкавага прымянення, ваннаў, але, у пэўнай канцэнтрацыі, і для піцця — у мэтах лячэння захворванняў страўніка, нырак. А побач — купель, дзе можна акунуцца ў радонавую ваду, якая паступае туды па трубах са свідравіны.


Медсястра Аксана ЧЭРНІК праводзіць SPA-працэдуру.

### У ЛЮБУЮ ПАРУ ГОДА — УСЕ МЕСЦЫ ЗАНЯТЫЯ

Сёння аздараўленчая база санаторыя разлічана на 450 месцаў для дарослых, яшчэ 176 ёсць у дзіцячым аддзяленні «Баравічок». Прычым фактар сезоннасці практычна не адчуваецца: у любую пару года — максімальная запаўняльнасць. І гэта ва ўмовах канкурэнцыі, якая расце на рынку санаторна-курортных паслуг. Чым жа тлумачыцца такая запатрабаванасць радонавай здраўніцы на Дзятлаўшчыне? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да **галоўнага ўрача санаторыя «Радон» Леаніда КАРПІШЭВІЧА.**

— Прычына такой папулярнасці, па-першае, у тым, што больш нідзе ў Беларусі прыроднага радону ў лячэбнай канцэнтрацыі няма ці, можа, пакуль не знайшлі. Пасля карпатлівага вывучэння саставу радонавай вады вучоныя прыйшлі да высновы, што па сваіх лячэбных уласцівасцях нашы крыніцы не ўступаюць такім знакамітым курортам, як Цхалтуба, Мацэста, Хмельнік.

Пры гэтым наша адметнасць у тым, што радонавыя працэдуры дапаўняюцца прымяненнем лячэбных сапрапелевых гразяў з возера Дзікае, у састаў якіх уваходзяць вітаміны, фермента — і гармонападобныя рэчывы, амінакіслоты і іншыя біялагічна актыўныя злучэнні. Гэтае багацце, якім прырода таксама надзяліла дзятлаўскую зямлю, мы не толькі задзейнічаем у інтарэсах сваіх пацыентаў, але і прапануем іншым здраўніцам рэспублікі, распаўсюджваем праз аптэчную сетку для карыстання ў хатніх умовах.

Аздараўленчы эфект унікальных прыродных фактараў забяспечваецца дзякуючы ўкараненню найноўшых медыцынскіх тэхналогій, абсталявання. У гэтым кірунку супрацоўнічаем з вучонымі — у прыватнасці, з Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта, Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, з кафедры медыцынскай рэабілітацыі Гродзенскага дзяржаўнага медуніверсітэта. Пастаянна развіваем дыягнастычную базу, можам рабіць вельмі шырокі спектр біяхімічных, гарманальных даследаванняў і анкалагічных маркераў. Каб людзі, якія да нас прыехалі, спаўна скарысталіся магчымасцямі санаторыя не толькі ў лячэбных, але і ў прафілактычных мэтах.

Праўда, толькі прыродных рэсурсаў і сучаснай апаратуры тут недастаткова. За апошнія 10 гадоў, калі **ААТ «Белагразраўніца» ўзначаліў Іван Фёдаравіч АВЕРЧАНКА,** значна ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база санаторыяў таварыства. Укаранёны новыя праекты ў галіне абсталявання, медыцынскіх тэхналогій, арганізацыі працы і кіравання. Не стаў выключэннем і «Радон»: у дзіцячым аддзяленні «Баравічок» пабудаваны школа, медыцынскі пункт з ізалятарам, адрамантаваны спальныя карпусы, добраўпарадкавана тэрыторыя. Выканалі капітальны рамонт абедзенных залаў і цэхаў харчблока, які цяпер аснашчаны самым сучасным халадзільным і тэхналагічным абсталяваннем. Інтэр'ерам залаў пазайздросцяць рэстараны. Каб стварыць камфортныя ўмовы для адпачывальнікаў адрамантаваны холы 1-га і 2-га паверхаў, жылыя нумары 4-га і 5-га паверхаў,



Тут працуе ўстаноўка імпульснай вакуумнай тэрапіі з опцыяй магнітатэрапіі.

пабудаваны фантан, рэканструяваны другі корпус санаторыя — усяго не пералічыць.

Кожны супрацоўнік санаторыя (іх у нашым калектыве каля 380) працуе так, каб адпачывальнікі па максімуме атрымалі тое, на што разлічвалі пры набыцці пуцёўкі. І гэта датычыцца не толькі лячэбнага працэсу (кваліфікацыя медыцынскага персаналу вельмі высокая), але і ўсяго комплексу паслуг — пражывання, харчавання, арганізацыі экскурсій, культурных і гульнявых праграм. Для камфортнага адпачынку ёсць кінаканцэртная, танцавальная і більярдная залы, летні амфітэатр, бібліятэка, служба пракату веласіпедаў, лыж і іншага спортінвентару. У санаторыі размешчаны аддзяленні двух банкаў, пошты, аптэка. Да паслуг кліентаў таксама кавярня са свежаадціснутымі сокамі, травянымі настоямі, кіслародным кактэйлем, трэнажорная зала, тэнісны корт, гульнявыя пляцоўкі для дзяцей і дарослых. Маем два шыкоўныя аўтобусы для экскурсійных паездак — у Нясвіж, Гродна, Навагрудак, Мір, Ліду, Жыровічы, Сынкавічы...

Дарэчы, ужо даўно ў ААТ «Белагразраўніца» быў прыняты кодэкс прафесійнай этыкі супрацоўнікаў. У ім гаворыцца, што агульнымі карпаратыўнымі каштоўнасцямі работнікаў аб'яднання з'яўляюцца прынцыповасць, сумленнасць, справядлівасць, абавязковасць, адданасць калектыву і адказнасць за яго поспех, прэстыж і працвітанне. Высока цэняцца прафесіяналізм, стараннасць, акуратнасць, творчы падыход да справы, уменне ў любой сітуацыі быць карэктным да сваіх кліентаў. Інакш яны проста памяняюць нас на іншых.


З дапамогай шматфункцыянальнага лазернага апарата «Мультылайн» праводзяць унікальныя касметалагічныя працэдуры.

### «БУДУ РЭКАМЕНДАВАЦЬ «РАДОН» СВАІМ СЯБРАМ»

Паводле апошняга апытання, каля 75% адпачывальнікаў, наведаўшы «Радон» аднойчы, потым прыязджаюць ізноў. Тым самым яны «галасуюць» сваімі грашыма за высокую якасць паслуг. Прычым гэта зусім не абавязкова больш заможныя расіяне. Каля здраўніцы мы ўбачылі аўтамабілі з нумарамі самых розных беларускіх рэгіёнаў.

**Каля аднаго з працэдурных кабінетаў гутарым з мінчанінам Яўгенам ЖДАНОВІЧАМ, які, па яго словах, «у «Радоне» ужо ў 12-ты ці 13-ты раз»:**

— Я шмат чаго перапрабаваў са сваёй спінай і аддаў перавагу менавіта «Радону», дзе праходжу аздараўленне амаль штогод. Калі пачынаў, то ў санаторыі яшчэ не было цяперашняй «экзотыкі» — такой, як, напрыклад, азонатэрапія, лазеры. Хаця асабіста мне дапамагае традыцыйнае — прыродны радон, лячэбныя гразі, масаж. А парадак тут быў заўсёды: спецыялісты цудоўныя, абслугоўванне добрае.

Альбо вось толькі два апошнія запісы ў кнізе водгукаў.

**Мікалай ФІГУРОЎСКІ, г. Масква:**

«Адпачываю ў «Радоне» ў трэці раз, усё выдатна. Хочацца адзначыць добрую работу рэцэпшэн, прыбіральшчыка (чысціня, акуратнасць, неназойлівасць), зручнае і ветлівае праходжанне працэдур, камфортны адпачынак. Як і раней, буду рэкамендаваць ваш санаторый сваім сябрам».

**Алена ЛІННІК, г. Мінск:**

«Вялізная чалавечая ўдзячнасць усяму персаналу санаторыя «Радон» за суперабслугоўванне на працэдурах ва ўрачоў. Мы з сяброўкай у вас упершыню, але, паверце, вы атрымалі ў нашых асобах пастаянных адпачывальнікаў».

Кліенты выказваюць таксама падзяку медыцынскім сёстрам, афіцыянтам («нават у сталічным рэстаране не заўсёды бывае такое абслугоўванне»), «супергорнічнай», «дыджэю за ўменне падбіраць музыку», «калектыву мастацкай самадзейнасці Дзятлаўскага раённага Дома культуры за цудоўны канцэрт»...

**— Ці з'яўляецца сёння «Радон», так бы мовіць, народнай здраўніцай? — цікавімся ў галоўнага ўрача санаторыя Леаніда Карпішэвіча.**

— Абсалютна. Нашы дзверы адчынены для ўсіх — у першую чаргу для жыхароў Беларусі, а таксама для гасцей з замежжа. Выкарыстоўваюцца і магчымасці амбулаторнага аздараўлення, калі людзі пражываюць у навакольных вёсках, атрымліваючы ў санаторыі неабходныя ім паслугі. З розных абласцей нашай краіны прыязджаюць і ў дзіцячае аддзяленне «Баравічок». Раней гэта быў лагер, які выкарыстоўваўся толькі летам, а цяпер, фактычна, круглагадовы дзіцячы санаторый, які, акрамя сваёй базы, выкарыстоўвае магчымасці «дарослай» здраўніцы.



Уладзіміра ЛОГАША мы сфатаграфавалі на самым сімвалічным месцы санаторнага гарадка — каля капліцы над гаючай крыніцай.

— Такое прыроднае багацце, якім надзяліла гэтыя мясціны прырода, магутныя і эфектыўныя лячэбныя фактары трэба максімальна выкарыстоўваць дзеля аздараўлення людзей, — пераканаы Леанід Карпішэвіч.

Леанід Рыгоравіч знаёміць з праектам рэканструкцыі санаторнага корпуса, якую плануецца распачаць ужо сёлета. Будуць надбудаваны яшчэ два паверхі з аздараўленчымі памяшканнямі і спартыўнай залай. Лячэбная магутнасць санаторыя павялічыцца, як мінімум, на чвэрць, а гэта значыць, што яшчэ больш людзей змогуць скарыстацца паслугамі здраўніцы.

Дарэчы, бліжэйшымі перспектывамі павялічэння прапановы аздараўленчых паслуг на Дзятлаўшчыне (акрамя пашырэння санаторыя «Радон», цяпер будуецца лячэбна-аздараўленчы цэнтр прыватнай фірмай) з агульнай выгадай маглі б скарыстацца аграсядзібы наваколля. Яны б, што ўжо практыкуецца, прадастаўлялі жыллё адпачывальнікам, а тыя атрымлівалі б лячэнне амбулаторна.

Ды і ўвогуле наяўнасць гэтай унікальнай аздараўленчай базы з яе наведваннем сотнямі і тысячамі людзей павінна служыць інтарэсам усіх навакольных рэгіёнаў — эканамічным, культурным. У прыватнасці, садзейнічаць не толькі папулярызацыі нашай мінуўшчыны, але і аднаўленню аб'ектаў гістарычнай спадчыны, якіх нямала непадалёк ад радонавай здраўніцы. Гэта Радзівілаўскі палац у Нясвіжы, замак Ільінічаў і князёў Мірскіх у Міры, Любчанскі замак, які цяпер аднаўляецца па ініцыятыве Івана Пячынскага. Чакаюць добрых гаспадароў палаца-паркавы ансамбль Храптовічаў у Шчорсах, цудоўны парк і сядзіба графа О'Рурка ва Уселюбе...

Альбо ўзяць дарогу, што звязвае санаторый «Радон» са сталіцай былога Вялікага Княства Літоўскага Навагрудкам. Яшчэ ў савецкі час пачалося асфальтаванне ўчастка дарогі ад Дзятлава да Навагрудка. Удалося пакрыць асфальтам большую частку, як казалі ў ваколіцах, старога Кацярынінскага гасцінца. Цяпер ад «Радона» да Навагрудка ўсяго 22 км, але 10 з іх — пакуль без асфальту. Хочацца спадзявацца, што гэтая праблема будзе нарэшце вырашана. Гэта важна і для мясцовых жыхароў, і для людзей, якія прыязджаюць у санаторый з іншых рэгіёнаў рэспублікі і замежжа. Можа, з'явяцца інвестары, як гэта было ў «Радоне» з будаўніцтвам гандлёвага цэнтра і кавярні?

Альбо інвестары зацікавяцца ўстаноўкай у санаторыі сонечных батарэй?

— Мы заўсёды адкрыты для новага, перадавога, — кажа Леанід Карпішэвіч.

### ПА АПОШНІМ СЛОВЕ МЕДЫЦЫНСКАЙ ДУМКІ

**У адной публікацыі немагчыма расказаць пра ўсе найноўшыя тэхналогіі медыцынскай індустрыі, што ўкараняюцца ў «Радоне». Звернем увагу толькі на асобныя «цікавінкі». Некаторыя з іх не маюць аналагаў у рэспубліцы.**

#### Спелеакліматалячэбніца з градзірняй

Гэта наземная мадэль глыбокай пячоры, дзе сцены і падлога — з руды Салігорскага калійнага басейна. У «Радоне» прымянілі ноу-хау: у саляны пакой дабаўлена градзірня — прыстасаванне для здабычы солі шляхам выпарвання. На сцяне вісяць бярозавыя галіны, і па іх сцякае расол, насычаючы паветра аэраіонамі. Вельмі камфортная і карысная працэдура, якая станоўча ўздзейнічае на органы дыхання, імунную і эндакрынную сістэмы. Ідэя і канструкцыя распрацаваны ў ААТ «Белагразраўніца». Прычым усё выраблена з айчынных матэрыялаў. Запатэнтавана як карысная мадэль у Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці.

#### Крыятэрапія

Якасна новае рашэнне ў лячэнні людзей з астэаартрозамі. Крыятэрапія станоўча ўплывае на фізіялагічныя функцыі апорна-рухальнага апарату: аналгезія, змяншэнне ацёку і запалення суставаў, мышачная рэлаксацыя, павышэнне капілярнага крыватоку. Больш за 90% пацыентаў, якія прайшлі курс крыятэрапіі, адзначалі паляпшэнне свайго стану — зніжэнне балявога сіндрому і павелічэнне рухомасці ў пашкоджаных суставах.

#### Азонатэрапія

У санаторыі «Радон» ёсць кабінет азонатэрапіі. Гэта альтэрнатыўны метад лячэння многіх захворванняў, які дазваляе істотна зніжаць патрэбнасць у лекавых сродках. Азон валодае разнастайным лячэбным эфектам — антыбактэрыяльным, процівірусным і антыгрыбковым дзеяннем. Зніжае інтаксікацыю і запаленне, стымулюе імунітэт, пашырае сасуды, паляпшае цыркуляцыю крыві. Метад азонатэрапіі асабліва карысны людзям, якія маюць алергію на лекавыя прэпараты з узнікненнем пабочных рэакцый.

#### Выцяжэнне пазваночніка ў радонавай вадзе

Унікальная працэдура, якая выконваецца дзякуючы радону і сучаснаму абсталяванню. Чакаемы эфект методыкі — дэкампрэсія нервовых структур, паляпшэнне кровазвароту, змяншэнне ацёку і паталагічнага напружання мышцаў, ліквідацыя рэактыўных з'яў у тканках. Параметры тэрапіі вызначаюцца індывідуальна з улікам узросту і агульнага стану пацыента. Курсы такога лячэння дазволілі абысціся без аперацыі многім пацыентам з міжпазваночнымі грыжамі.

#### Лазерная касметалогія

У санаторыі «Радон» можна скарыстацца новымі методыкамі лазернай касметалогіі на ўнікальным апараце «Мультылайн». Вось далёка няпоўны пералік паслуг: лазерная эпіляцыя, лячэнне сасудзістых захворванняў скуры, карэкцыя рубцоў, нанаперфарацыя скуры, SMA-амалоджванне, лячэнне гіперпігментацыі скуры.

#### Карбоксітэрапія

Гэта новы накірунак фізіятэрапіі — падскурнае прымяненне вуглякіслага газу з сасудапашыраючым, міярэлаксіруючым і абязбольвальным дзеяннем. Карбоксітэрапія з'яўляецца новым, прагрэсіўным метадам лячэння розных захворванняў і карыстаецца вялізнай папулярнасцю на курортах Чэхіі і Германіі. Цяпер гэтая паслуга даступная і ў Беларусі.

### ВЯЛІКАМУ КАРАБЛЮ — ВЯЛІКАЕ ПЛАВАННЕ!

Гэтая добра вядомая прымаўка можа паслужыць пажаданнем на будучыню калектыву «Радона» і ўсяго санаторна-курортнага аб'яднання «Белагразраўніца». Так, зроблена нямала. Вось толькі адна лічба: з пачатку работы санаторыя на Дзятлаўшчыне паслугамі, якія па сваім узроўні і эфекце не саступаюць лепшым сусветным курортам, скарысталіся больш за 250 тысяч чалавек! Але наперадзе новыя, яшчэ больш значныя вяршыні.


Узровень гармонаў шчытападобнай залозы вызначае ўрач Галіна ЕМЯЛЬЯНЧЫК.



Сеанс гарызантальнага падводнага выцяжэння ў радонавай вадзе праводзіць медсястра Іна САНЮК.

Асаблівая ўвага — энергаэфектыўнасці, бо ад затрат на энергарэсурсы залежыць і кошт пуцёвак для адпачывальнікаў. Вялікую работу выканалі, напрыклад, па рэканструкцыі цепласетак з прымяненнем ізаляваных труб. Цяпер распачынаюць уцяпленне фасада санаторнага корпуса, што важна з пункту гледжання і энергазберажэння, і прывабнасці знешняга выгляду будынка.

...Напрыканцы мінулага года санаторый «Радон» адсвяткаваў сваё 20-годдзе. З гэтай нагоды адбылася навукова-практычная канферэнцыя з удзелам вучоных і практыкаў, выступілі 4 доктары медыцынскіх навук. Уражвае, наколькі грунтоўна кіраўніцтва ААТ «Белагразраўніца» ставіцца да таго, каб на базе прыроднага багацця ствараць і ўдасканальваць моцную, сусветнага ўзроўню курортную і рэкрэацыйную зону — аздараўлення і адпачынку. Калі ўлічваць тое, як дынамічна развіваецца, умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная і медыцынская база радонавай здраўніцы на Дзятлаўшчыне, можна не сумнявацца, што ўсё атрымаецца!


Гразелячэбніца санаторыя мае самае сучаснае абсталяванне.

**Уладзімір ЛОГАШ, інжынер-будаўнік, Барыс ПРАКОПЧЫК, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 500825808

Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана Дзянісава,
галоўны рэдактар часопіса
«Маладосць»



# БАЗАВЫЯ РЭЧЫ

«Вось пяць (дзесяць, пятнаццаць) універсальных рэчаў, якія павінны быць у гардэробе сапраўднай жанчыны, каб ствараць яе непаўторны імідж!» Радкі пра славуты жаночы «базавы гардэроб» зноў і зноў гучаць — так, быццам прамаўляюцца ўпершыню ў гісторыі гэтага старога, як усе прывіды разам, свету. А між тым, літара ў літару я чула іх у свае васямнаццаць. І дзе была мая прага да індывідуальнасці тады? І што яна робіць цяпер?

«Стварыць непадуладны часу гардэроб вельмі проста, калі вам вядома некалькі прадметаў, якія павінна мець кожная жанчына». Гэта, дарэчы, не абы-хто заяўляе, а шэф-рэдактарка Harpers Bazaar — шырока вядомага ў вузкіх колах модніц часопіса. Гэты Harpers Bazaar як пачаў аднойчы — амаль паўтары сотні гадоў таму — пісаць пра стылі і вопратку, так і піша — ужо ледзь не трыста сезонаў! — пра стылі і вопратку. Выключная крэатыўнасць і зайздросная працаёмкасць! Праўда, першыя гадоў трыццаць яны былі штотыднёвікам, апошнія ж сто трынаццаць выходзяць усяго толькі раз на месяц. Спісваюцца пакрысе? Ці прымушаюць сябе чакаць, нецярпліва і ўтрапёна?

Значыць, наяўнасць у маім гардэробе так званых базавых рэчаў гарантуе мне ўсё тое, чаго бракуе жанчыне, якая... якая як мінімум не чытае нанач выданні кшталту вышэйзгаданага. Ну, і што я маю? Зазіраючы па чарзе то ў часопіс, то ў шафу, канстатую наступнае. Блузы белага колеру — і каб спалучалася з чорнай дзелавой спадніцай, «бо гэта заўсёды выглядае шыкоўна», — няма. І чорнай спадніцы — ну што ты будзеш рабіць? — таксама няма. Два пінжакі, адзін светлы лёгкі, другі цямнейшы і цяплейшы, абодва створаны «для дадатковых магчымасцяў» — адсутнічаюць! Маленькая чорная сукенка, якая «ніколі не падвядзе»... Стоп! Мне тут раптам падумалася: а слабо не гардэроб падвесці пад базавы стандарт, хай сабе і парадамі прафесіяналаў выбудаваны, а павесці сябе цалкам наадварот (як я, дарэчы, люблю)?

Вось вісіць у маёй шафе маленькая, як яны там у сваіх часопісах пішуць, сукенка. Яна не чорная — чырвоная. Ад вядомага брэнда, хоць і айчыннага. У ёй я адкрывала першы ў Беларусі дабрачынны паказ Red Dress Collection. Ніякія псіхолагі не прымусяць мяне пазбавіцца гэтай рэчы, хоць яна «супраць правілаў» — не была выкарыстана ніводнага разу «за апошні як мінімум год».

Побач вісіць «варыянт для кактэйлю». Гэта мне «свеціць» апрануць хіба што на дамашні закрыты паказ з канапай у якасці подыума. Але ж гэтую сукенку падарыла мне стрыечная сястра, калі я, прымаючы ўдзел у фестывалі «Лунінская восень», заначавала ў сваёй берасцейскай цётачкі. З якім цудоўным настроем я ўспамінаю, як мы ўтрох літаральна апоўначы ладзілі самы сапраўдны «паказ». Бо які там сон пасля «Лунінскай восені»?..

Вось сукенка з фірменнага дэніму, прывезена з-за мора-акіяна не менш чым паўстагоддзя таму. У ёй любіла фарсануць мая бабуля Ева, карабельны кок. Я люблю апранаць яе ў дні, калі патрабуецца асаблівая рашучасць, бо выглядаю тады як не тое што рэдактарка якогасці мадняцкага выдання, а нават як сапраўдная медыямагнатка.

Пад які заўгодна гардэроб можна з паветранай лёгкасцю падвесці не адну, а дзве, тры, пяць «баз», якія будуць зразумелымі выключна табе. І, хто ведае, ці не па гэтай прычыне яны стануць залогам тваёй непаўторнасці? Шэрасць і невыразнасць — паняцці, якія fashion-журналістыка пагардліва супрацьпастаўляе індывідуальнасці. Ці не так? А мне вось падумалася: яно ж і добра — калі табе хаця б час ад часу ўласцівыя гэтыя, на маю думку, даволі дэфіцытныя якасці — шэрасць і невыразнасць. Бо хочацца, бывае, не вылучыцца, а схавацца. Апошняе калі-нікалі нясе нашмат больш розных выгод, чым першае. Асабліва калі ты сучасная па-сапраўднаму. Уласцівасць сапраўднасці — ніколі не перабольшваць. Ці не так? Ёй няма ў тым патрэбы. Бо навошта шугаць полымю там, дзе дастаткова проста праменьчыка?..

■

■ Асноўны занятак

# ЛЯЛЬКА, А Ў БАСКЕТБОЛЕ РАЗБІРАЕЦЦА!

## Пра жанчын, якія асвоілі мужчынскія прафесіі



**Калі раней жанчыны былі занятыя, галоўным чынам, у сацыяльнай сферы і сферы абслугоўвання, то цяпер пералік іх прафесій значна пашырыўся. Усё больш актуальнымі крытэрыямі падчас выбару кандыдата на працоўнае месца становяцца не палавая прыналежнасць, а здольнасці, асаблівасці характару, вопыт і жаданне. Рэсурсны цэнтр Фонду ААН у галіне народанасельніцтва распытаў некаторых жанчын Беларусі аб тым, як ім працуецца на «мужчынскай ніве».**

**Удзельная вага жанчын па рабочых спецыяльнасцях складае 45%, жанчын-служачых — каля 70, кіраўнікоў — каля 45, спецыялістаў — 75, іншых служачых — 80. У катэгорыю «іншых служачых» уваходзіць і новая для Беларусі спецыяльнасць — баскетбольны агент «ФІБА» (першыя і асноўныя прадстаўнікі гэтай прафесіі ў свеце — мужчыны).**

— У Беларусі ўсяго тры агенты, і са сваімі калегамі я не перасякалася, — расказвае **баскетбольны агент «ФІБА» Аляксандра ПУШКІНА.** — Што датычыцца маіх стасункаў з еўрапейскімі калегамі, то можна смела сцвярджаць: агенту або менеджару клуба важней, што і як ты прапануеш, а не тое, мужчына ты ці жанчына і колькі табе гадоў. Некаторыя агенты, дарэчы, нават адзначаюць станоўчую жаночую якасць у гэтай рабоце — клапатлівасць, тактоўнасць і мэтанакіраванасць. Аднак мне здаецца, што гэта выключна індывідуальныя якасці, якія могуць быць як у жанчын, так і ў мужчын. Здаецца дробязь — папытацца пра самаадчуванне гульца, папярэдзіць аб павялічаных нагрузках, якія яго чакаюць... Але ж потым глядзіш, і нехта сапраўды больш папрацаваў над сабой, пазбегнуў траўмы і г.д.

Калі ўжо гаварыць аб стэрэатыпах, то ў маім выпадку ўсмешку выклікае тое, што мой рост — 1,56 м, а баскетбалісты — ад 1,80 м да 2,12 м. Мяне часта называюць «лялькай» у параўнанні з гульцамі. Ну і няхай я буду маленькай дзяўчынай, якая выдатна разбіраецца ў баскетболе!

**Для жаночай занятасці ў Беларусі характэрна высокая доля працуючых жанчын у сферы паслуг (амаль 80%), меншая — у вытворчых галінах (16-45%). Змене прыярытэтаў спрыяюць экстрэмальныя захапленні.**

— Нейкі час я захаплялася альпінізмам і скачкамі з вяроўкай з высокіх будынкаў, — расказвае **прамысловы альпініст Віялета ВАСТОК.** — Калі я не змагла здаць экзамен ва ўніверсітэце і мяне з-за гэтага адлічылі, трэба было падумаць, як жыць далей. Неяк сустрэла старую знаёмую, якая пазнаёміла мяне з хлопцамі, што працавалі якраз у прамысловым альпінізме. Яны спрасцілі сітуацыю з пошукам працы і прапанавалі далучыцца да іх. Вось так я трапіла ў лік прамысловых альпіністаў. Мужчыны, вядома, бралі на сябе самую небяспечную работу, а мяне паступова вучылі, тлумачылі, што і як робяць. Хутка я змагла выконваць частку функцый самастойна.

Калі я перайшла працаваць памочнікам дырэктара ў кампанію, якая займаецца арбарыстыкай (работа з дрэвамі), то працягвала цікавіцца незвычайнымі, на першы погляд, для дзяўчыны навыкамі. На новым месцы «пасябравала» з бензапілой, навучылася вязаць вузлы, прыкладна ацэньваць, якім чынам нацягнуць скайлайн, з чаго пачаць распіл дрэва.

**Сёння жанчына за рулём аўтамабіля, тралейбуса або трамвая ўжо не выклікае здзіўлення, а вось дамы за рулём таксі — дагэтуль дзіва. Хоць на самой справе «жаночае» таксі — з'ява зусім не новая. (Першай сакрэты таксаматорнага парка асвоіла немка Элізабет фон Пап у 1908 годзе. Адзіная на той момант жанчына-вадзіцель таксі скончыла Берлінскую школу вадзіцеляў.)**

— Вадзіцелем таксі я працую амаль 5 гадоў, — кажа **таксіст Крысціна РЫБАЛТОЎСКАЯ.** — Тэма перавозак для мяне была не новай. Раней я перавозіла будматэрыялы. Нягледзячы на прадузятасць, звязаную са спецыяльнасцю, папоўніць рады вадзіцеляў таксістаў мяне паклікалі якраз сябры-мужчыны. Што да рэакцыі кліентаў, то толькі невялікая частка мужчын ставіцца з нейкай апаскай, жанчыны ж — наадварот, з вялікай павагай. Я думаю, мяжа паміж жаночымі і мужчынскімі прафесіямі ўсё больш размываецца.

**Заўважана, што запраўшчыцы
нават больш трывалыя
за мужчын, асабліва
ў эмацыянальным сэнсе.
Усё ж такі працаваць даводзіцца
з людзьмі, якія па розных
прычынах бываюць і капрызнымі,
і раздражнёнымі, і падаўленымі.**

**Калі ў прамысловасці, лясной гаспадарцы, на транспарце, у будаўніцтве пераважаюць мужчыны, то сярод работнікаў аховы здароўя і адукацыі жанчыны складаюць каля 80% . Жанчын больш у галіне фінансаў, крэдыту і страхавання, у культуры, на прадпрыемствах гандлю і грамадскага харчавання. Аднак прыкладаў, калі беларускі пераходзяць у мужчынскія прафесіі, становіцца ўсё больш.**

— Ніколькі не шкадую, што змяніла прадуктовы гандаль на сферу рэалізацыі нафтапрадуктаў, — тлумачыць **раздатчык нафтапрадуктаў на «Газпрамнафта» (г. Рэчыца) Нона ГАГАЧОВА.** — Па адукацыі я мастак па інкрустацыі, а мой муж — дальнабойшчык, у юнацтве добра ганяў на матацыкле. Таму аўтамабільная тэма мне блізкая, нягледзячы на творчую адукацыю. Мая цяперашняя праца — мужчынская па сваёй сутнасці, паколькі звязана з нафтапрадуктамі. Але гэта не азначае, што жанчыны з ёю спраўляюцца горш. Заўважана, што запраўшчыцы нават больш трывалыя за мужчын, асабліва ў эмацыянальным сэнсе. Усё ж такі працаваць даводзіцца з людзьмі, якія па розных прычынах бываюць і капрызнымі, і раздражнёнымі, і падаўленымі.

Некаторыя аўтамабілісты напачатку лічылі недарэчным, што жанчына запраўляе машыну: «Вы няправільна заліваеце, пераблытаеце!» Цяпер прывыклі і нават пры наяўнасці свабодных калонак едуць туды, дзе ёсць запраўшчык.

— Мы жывём у няпросты час, калі дзяўчаты працуюць нароўні з мужчынамі, стамляюцца і шукаюць месца, дзе можна адпачыць, пакінуць свае негатыўныя эмоцыі, — кажа **баксёр Дар'я ШУЛЬГА.** — Для мяне такім месцам стала тайская зала. Каля года я практыкую муай-тай. Вядома ж, я пакуль аматар. Але якое задавальненне дастаўляе вывучэнне новых рухаў, новых звязак і новых удараў! Ні ў якім разе нельга сказаць, што гэта неразумны спорт. Тут галава працуе на сто працэнтаў. І, нягледзячы на гэта, ты расслабляешся.

Бокс павышае самаацэнку, фарміруе характар, дапамагае дасягнуць мэты і ўпэўнена рухацца наперад. Некаторыя лічаць, што такі занятак ператварае лэдзі ў «пацанку», але гэта не так. Дар'я з задавальненнем носіць сукенкі, абцасы. У яе жаноцкая прычоска. Адно другому не перашкаджае.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Бусел прыляцеў

# КАБ ЦЯЖАРНАСЦЬ БЫЛА Ў РАДАСЦЬ

**Чаканне будучага дзіцяці для большасці жанчын — вялікая радасць і шчасце. Але бываюць выпадкі, калі цяжарнасць выклікае занепакоенасць у будучых бацькоў. Гэта здараецца пераважна тады, калі ў іх саміх ёсць праблемы са здароўем.**

— Сёння людзей з ідэальным станам здароўя няма ва ўсім свеце, таму будучай маці трэба не хвалявацца, а прымаць меры, — тлумачыць **Васіль ЮРАСАЎ, кандыдат медыцынскіх навук, намеснік дырэктара па медыцынскіх пытаннях незалежнай лабараторыі ІНВІТРА.** — Каб добра разумець сітуацыю і падрыхтавацца да родаў, трэба абавязкова зрабіць наступныя аналізы. Гэта — агульны аналіз крыві, аналіз мачы. Неабходна таксама вывучыць стан печані і нырак, вызначыць узровень глюкозы (цукру ў крыві) і г.д. А тое, што Валянціна ведае сваю групу крыві і рэзус-фактар, а таксама групу крыві і рэзус-фактар біялагічнага бацькі, — вельмі добра. Гэта дазволіць урачам прыняць адпаведныя меры.

Калі ў маці адмоўны рэзус-фактар, а ў дзіцяці станоўчы, то падчас такой цяжарнасці ў арганізме жанчыны могуць выпрацоўвацца антыцелы да дзіцяці. Але пік узаемадзеяння такіх антыцел назіраецца непасрэдна ў час родаў, калі кроў маці сутыкаецца з крывёю немаўляці. Для першай цяжарнасці гэта не так страшна, а вось у час наступных ужо могуць быць праблемы. Але і яны вырашальныя: у пэўны перыяд цяжарнасці ў рэзус-адмоўнай маці вывучаюць колькасць антыцел і пачынаюць уводзіць антыдот. Гэта дазваляе пазбегнуць негатыўных наступстваў для дзіцяці (маю на ўвазе папярэджванне гемалітычнай хваробы нованароджаных).



Таксама неабходна кантраляваць узровень эрытрацытаў. Калі іх у арганізме жанчыны мала, гэта прыводзіць да анеміі, а яна, у сваю чаргу, — да недахопу кіслароду ў органах і тканках як у маці, так і ў дзіцяці. Недахоп кіслароду выклікае плацэнтарную недастатковасць, з-за якой можа перарвацца цяжарнасць.

Таксама пры даследаванні агульнага аналізу крыві трэба звярнуць увагу на лейкацыты (дазваляюць вызначыць, ці назіраецца ў гэты момант у арганізме жанчыны абвастрэнне якога-небудзь хранічнага захворвання) і на трамбацыты. Ад колькасці апошніх залежыць, наколькі хутка спыніцца кроў у жанчыны у час родаў.

Калі ў жанчыны, напрыклад, павялічаная згусальнасць крыві, то дадаткова неабходна даследаваць сценкі сасудаў, бялкі, якія цыркулююць у крыві (фібрынаген, пратрамбін і іншыя). Падчас цяжарнасці колькасць фібрынагену і пратрамбіну расце. І гэта лічыцца нармальным! Але калі іх колькасць павялічваецца занадта хутка, то ў жанчыны можа развіцца трамбоз у структуры плацэнты, што таксама прывядзе да перарывання цяжарнасці.

Што датычыцца цукровага дыябету, то тут больш важна сачыць за станам глюкозы ў крыві самой жанчыны. Ад бацькі гэтае захворванне можа і не перадацца дзіцяці, а вось калі жанчына не будзе сачыць за сваёй вагой, то ў гэтым выпадку ў яе можа сфарміравацца гістацыйны (скрыты) дыябет. Ён можа назірацца ў час цяжарнасці і знікне ў тым выпадку, калі маці прытрымліваецца дыеты і сочыць за сваёй вагой пасля родаў. Але калі жанчына не будзе гэтага рабіць, пачне набіраць пасля родаў вагу, то гістацыйны дыябет пяройдзе ў пастаянную форму.

Дарэчы, за вагой наогул вельмі важна сачыць — калі жанчына «ў целе» цяжарная, то ў арганізме дзіцяці, яшчэ калі яго маці носіць пад сэрцам, пачынаюць фарміравацца ў вялікай колькасці пустыя тлуставыя мяшочкі. У далейшым, як толькі такое дзіця пачынае падрастаць і перастае сачыць за вагой, у яго адразу з'яўляюцца праблемы з масай цела і ўзнікне рызыка захворвання на цукровы дыябет.

Аднак, што б ні паказалі аналізы, пужацца не трэба. Невырашальных праблем сёння амаль няма, бо медыцына развіваецца цяпер хутка, што дазваляе вырашыць вельмі многія праблемы з тых, якія яшчэ некалькі дзясяткаў гадоў таму ўспрымаліся як прыгавор.

**Гелена АВЕЛА.**
**Фота Ганны АНДРУШЭВІЧ**

■

# 10 ДОКАЗАЎ ТАГО, ШТО ЁН У ЗАХАПЛЕННІ АД ВАС

**Мужчыны рэдка паказваюць свае пачуцці, нават калі яны сапраўды страцілі розум ад жанчыны. Безумоўна, і ў іх ёсць свае спосабы паведаміць пра каханне. Праўда, для жанчын яны не відавочныя. Мы ж чакаем кветак, рамантычных жэстаў, песень пад балконам... А яны даказваюць нам сваё каханне зусім па-іншаму.**

### 1. Ён раскрываецца перад вамі

Душэўны стрыптыз, аповед пра самыя патаемныя думкі і пачуцці — няпростае выпрабаванне для ўсіх людзей, і асабліва для мужчын. Будзьце ўпэўнены, ён не проста так стаў раскрываць перад вамі душу.

### 2. Ён робіць брудную працу

Вынас смецця або аддрайванне ракавіны — не вельмі рамантычныя паводзіны, аднак гэта такі мужчынскі спосаб паказаць свой клопат: зрабіць ваша жыццё больш лёгкім.

### 3. Ён просіць вас аб дапамозе

Кожны раз, калі мужчына просіць вас дапамагчы яму выбраць падарунак для мамы, ён хоча пачуць вашу думку, таму што паважае вас і ваш выбар. Ці не гэта прыкмета вялікага кахання?

### 4. Ён праяўляе свае пачуцці на публіцы

Калі ён так і намагаецца патрымаць вас за руку, абняць, пацалаваць, а то і гулліва ўшчыкнуць пасярод супермаркета — успрымайце гэтыя дзеянні як камплімент. Ён шчаслівы і ганарыцца тым, што вы — яго жанчына, а часам няма лепшага спосабу выказаць свае пачуцці, чым мацней прыцiснуць каханую да сябе.

### 5. Ён выбірае «правільныя» падарункі

Калі падарункі, атрыманыя ад яго, не ўяўляюць сабой нічога асаблівага — гэта не прычына для хвалявання: большасць мужчын зусім не ўмее дарыць тое, што сапраўды трэба. А вось калі ён з зайздросным пастаянствам здзіўляе вас змесцівам прыгожых скрыначак, то гэта — дакладны знак яго вялікага кахання. Ваш мужчына не толькі ўмее ўважліва слухаць, але і гатовы патраціць даволі шмат часу на пошук «правільнага» падарунка.

### 6. Ён знаёміць вас з сям'ёй

Можаце быць упэўненай: як толькі мужчына знаёміць сваю дзяўчыну з маці, апошняя адразу ж пачынае намякаць яму на тое, што ёй даўно хочацца стаць бабуляй. Таму, вырашыўшы сабраць за адным сталом дзвюх любімых жанчын, мужчына цудоўна разумее, на што ён ідзе. А вам варта зразумець, што ён бачыць будучыню ў вашых адносінах.

### 7. Ён робіць вас часткай свайго кола

Увесці вас у сваё кола — гэта не толькі шапачна пазнаёміць з сябрамі. Калі ён сапраўды будуе планы на будучыню, то будзе планаваць сумесныя паходы ў кіно, вячэры ў рэстаранах, «спантанныя» вечарынкі; або запрашаць вас на мерапрыемствы, якія ў яго з сябрамі сталі добрай традыцыяй: наведванне спартбараў падчас важных матчаў, сумесныя прагулкі ў парках, паход у боўлінг і г.д.

### 8. Ён становіцца часткай вашага жыцця

Калі ён не супраць далучыцца да вас падчас сумных паходаў па крамах або пакорліва глядзіць чарговы слёзны серыял па тэлевізары, ведайце: ён гатовы да доўгай аблогі крэпасці.

### 9. Ён ідзе на кампраміс

Усё проста: калі ён вас кахае, то хоча зрабіць вас шчаслівай. Гэта не азначае, што ён заўсёды будзе дазваляць вам рабіць усё, што заўгодна, але тое, што ён гатовы пайсці на кампраміс, які задаволіць абодва бакі, — гэта дакладна. Усё роўна, пра што зайшла гаворка (пра месца правядзення сумеснага водпуску або пра тое, каму пайсці зачыніць дзверы), — ён прадэманструе сваё каханне гатоўнасцю саступіць. У абмен на ўступку з вашага боку, вядома ж.

### 10. Ён гаворыць пра каханне

Зразумела, мужчынскае прызнанне ў каханні — падзея такая ж рэдкая, як і сустрэча з дыназаўрам. Таму калі яго раптам «прарвала», слухайце, не прапускаючы ні слова! Хто ведае, калі яго «накрые» ў наступны раз.

**Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

■ Матуліны занатоўкі

# СЛЕД СЛАНА



Вяртаемся з садка. На дарозе — вялізная выбоіна. Такая вялізная, што пераскочыць яе не ўдаецца ні Антону, ні мне.

— Мам, дык гэта ж след слана! — зазначае сын.

— Ну і адкуль тут сланы? — пытаюся я.

І Антошка пачынае распавядаць мне гісторыю пра тое, што ўначы, калі людзі і машыны засынаюць, па горадзе пачынаюць разгульваць сланы. Прычым ходзяць яны на дыбачках — таму іх слядоў амаль нідзе не відаць. А вось тут слон спатыкнуўся...

— Чым ты яго корміш, што ён такі разумны? — пытаюцца ў мяне бабулькі каля пад'езда. На любую іх заўвагу сын лёгка выдумляе сваю гісторыю, а не так даўно пачаў дэкламаваць бабулям яшчэ і вершы Коласа... Звычайна я адказваю, што ён сам па сабе такі таленавіты (па шчырасці, так і лічу). Але насамрэч яшчэ ні ў адну сваю ранейшую справу я не ўкладала столькі сіл, колькі ў выхаванне аднаго маленькага хлопчыка.

Не, я нічога не шыю і не клею начамі, і наогул даўно забылася на модную тэму ранняга развіцця. Ні на якія дзіцячыя курсы мы з ім таксама не ездзім (хіба толькі ў басейн), спецыяльных цацак і дыскаў я не купляю ўжо гады два. Проста займаюся звычайнымі будзённымі справамі, а Антон жыве побач. Праўда, я ўвесь час з ім размаўляю (гэта без перабольшвання так — калі сын не спіць, размаўляем мы пастаянна і пра ўсё на свеце). І яшчэ я ніводнага разу не павышала на яго голас... Але ж як гэта няпроста — маўчаць тады, калі, бывае, хочацца закрычаць з усяе сілы, спяваць, чытаць вершыкі, расказваць казкі, калі хочацца памаўчаць хаця б паўгадзіны!

Затое ў мяне ніколі не ўзнікае пачуцця віны, што сыну не хапае маёй увагі. І пра дзіцячую агрэсію (пік якой, па сцвярджэнні псіхолагаў, прыходзіцца на двухгадовы ўзрост) я ведаю толькі па кніжках. Тым не менш, летам Антону будзе ўжо тры.

Ён умее лічыць да пяці і рабіць нескладаныя матэматычныя падлікі ў межах гэтых лічбаў, ведае амаль усе літары і няблага арыентуецца ў мовах чатырох краін, дзе нам давялося пажыць з яго нараджэння. Доўгі час мы хадзілі ў краму разам з ягоным любімым мядзведзікам, які (не без маёй дапамогі) «разглядаў» сустрэчныя машыны, вызначаючы, якая яму больш даспадобы, — так Антон навучыўся адрозніваць колеры. Па дарозе дадому мы шукалі скарб ці які-небудзь «палац дракона», адлічваючы крокі — так ён навучыўся лічыць. Гатуючы сняданак ці вячэру, я размаўляла з ім за сфінкса ці нават Эйфелеву вежу, якім Антон «тэлефанаваў», — так ён пачаў разумець, што ёсць зусім іншыя гарады і краіны... А калі сын зацікавіўся, што там за дом за высокім зялёным плотам, міма якога мы ходзім ледзь ці не штодня, я паспрабавала пачытаць Антону першы верш Якуба Коласа. Праз дзень тут жа, каля музея паэта, ён папрасіў новы верш...

Здаецца, за ўсё сваё папярэдняе жыццё я не размаўляла столькі, колькі за той час, што стала маці.

Я пазнаёмілася з усімі жыхарамі нашага і суседніх дамоў, ахвотна ўступала ў разгорнутыя гутаркі з выпадковымі суразмоўцамі ў Польшчы, Швецыі і наогул усюды, імкнучыся стварыць у сына ўражанне бяспечнага і добразычлівага свету. Бо ў сваім дзяцінстве толькі і чула, што за межамі нашай сям'і небяспека падсцерагае на кожным кроку. І мне спатрэбілася нямала гадоў, каб ачысціць сваю падсвядомасць ад пастаяннага чакання непажаданай сустрэчы ці падзеі. Але, як толькі я здолела пазбавіцца ад гэтага ў сваёй галаве, непажаданыя сустрэчы і падзеі бясследна зніклі і з маёй рэчаіснасці.

**Не буду спрачацца — узнагарода ідэальнай маці наўрад ці будзе мая. Але я дакладна ведаю адно: нашы дзеці — гэта адлюстраванне нас саміх. І вось ужо трэці год імкнуся стаць такой, якой мне заўсёды хацелася быць.**

Калісьці даўно мяне вельмі ўразіў эксперымент, які я ўбачыла ў адной з тэлеперадач. Злачынцам, асуджаным на пажыццёвы тэрмін пакарання, прапаноўвалі паглядзець відэазапіс, дзе людзі проста ішлі па сваіх справах. І вызначыць, каго з тых людзей яны абралі б сваёй ахвярай. І хоць кожны са злачынцаў глядзеў відэа ў ізаляваным пакоі, усе без выключэння паказалі на адных і тых жа людзей. Дык ці не мы самі прыцягваем да сябе свае няшчасці? Не на пустым жа месцы ўзнікла навука віктымалогія, што даследуе патэнцыяльных ахвяр...

Безумоўна, гэта я таксама чула: як бы вы ні выхоўвалі сваё дзіця, яму ўсё роўна будзе што распавесці свайму псіхатэрапеўту. Не буду спрачацца — узнагарода ідэальнай маці наўрад ці будзе мая. Але я дакладна ведаю адно: нашы дзеці — гэта адлюстраванне нас саміх. І вось ужо трэці год імкнуся стаць такой, якой мне заўсёды хацелася быць. Такой, якім хацела б бачыць уласнага сына.

Напрыклад, я даўно марыла стаць больш разняволенай. І цяпер, у свае 43 гады, я, нарэшце, магу дазволіць сабе гучна смяяцца на людной вуліцы проста таму, што добры настрой, не апасаючыся, што пра мяне падумаюць «не тое». Магу дурэць з сынам на дзіцячай пляцоўцы, навыперадкі з'язджаць з ім з горак, размаўляць на розныя галасы і на хаду выдумляць самыя неверагодныя гісторыі. Магу, нарэшце, адмовіцца ад працы, дзе я для ўсіх і заўсёды была вінаватая, і заняцца тым, што мне сапраўды па душы...

І сябе, новую, я бачу ў сыне.

Аднойчы ў інтэрв'ю кагосьці з нашых шматдзетных «зорак» я прачытала параду, як справіцца з дзіцячымі капрызамі. Маўляў, трэба зрабіць выгляд, што менавіта такіх паводзін ты і чакаеш ад дзіцяці. Сапраўды — калі ў адказ на плач Антона я пачынала патрабаваць, каб ён роў яшчэ гучней, плач чароўным чынам спыняўся. Але аднойчы я так стамілася ад усяго на свеце, што не вытрывала і ўпершыню расплакалася пры сыне сама. І Антон... пачаў падбухторваць мяне плакаць гучней — дакладна так, як рабіла гэта я. Ад раптоўнай крыўды мае слёзы імгненна высахлі. І я зразумела, што трэба шукаць нешта іншае, сваё...

Калі раней хтосьці казаў, што дзіця — гэта яго «творчы праект», я толькі пасміхалася. Падобныя словы падаваліся мне амаль нахабствам: няўжо можна ставіць сабе ў заслугу вартасці іншага чалавека? Цяпер і я дакладна ведаю: дзіця — гэта вельмі творчы праект.

Але і я сама — творчы праект уласнага сына. Ці не так?

**Марына БЕРАЗЕНСКАЯ**

■

■ Ведай нашых!

## ЗОЛАТА І БЕЗ «МАСКІ»

**На расійскую тэатральную прэмію «Залатая маска» вылучаны беларускія рэжысёры і мастакі**



Алег ЖУГЖДА.

Алег Жугжда, галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога тэатра лялек, намінаваны на прэмію за лепшую працу рэжысёра за спектакль паводле Дастаеўскага «...і пакаранне», які ён паставіў у Разанскім тэатры лялек. Пра тое, што Жугжда ўмее перакладаць літаратурную класіку на асаблівую мову тэатра, беларускія гледачы ведаюць дзякуючы пастаноўцы «Пікавая дама», адзначанай Нацыянальнай тэатральнай прэміяй у Рэспубліцы Беларусь. Адметнасць гэтага рэжысёра — ва ўменні адчуваць, калі герой чалавек становіцца лялькай у руках лёсу ці па ўласнай волі, і пераводзіць гэта ў тэатральную прастору. Дапамагае тут і праца сцэнографа. Таму за той жа спектакль Разанскага тэатра лялек намінаваны на «Залатую маску» беларускі мастак Валерый Рачкоўскі, які нядаўна пайшоў з жыцця. Нашы чытачы могуць яго ведаць па працы ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек.

Але ў гэтым тэатры ёсць свае адметныя рэжысёры. Адзін з іх — Аляксандр Янушкевіч намінаваны як рэжысёр на «Залатую маску» за стварэнне спектакля «Эдып» Курганскага тэатра лялек «Гулівер» і творчага аб'яднання «КультПраект». Разам з ім над гэтай пастаноўкай працавала мастачка з Магілёўскага тэатра лялек Людміла Скітовіч. Яна вылучана ў намінацыі «Лялькі. Лепшая праца мастака».

Прэміі бываюць важныя, але ж, незалежна ад іх, беларускія лялечныя тэатры зачароўваюць цудоўнымі творамі як дарослых, так і дзяцей, дзякуючы таму, што іх стваральнікі не проста працуюць — яны жывуць творчасць. Залатыя нашы...

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Выстава

## ЗЯЛЁНАЯ СЦЯНА

**У мастака Віктара Пятрова такія асацыяцыі з мясцінамі, дзе ён жыве**



«Зялёная сцяна старога дома» — так называецца яго персанальная выстава, якая працуе ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Віктар Пятроў з'яўляецца прадстаўніком беларускага авангарду 1980—1990-х гадоў. Гэта быў цікавы час, адметны ў мастацтве Беларусі, калі завіравалі і выявіліся самыя розныя плыні, ідэі, аўтарскія пошукі і эксперыменты. А чаго чакаць ад авангардыста, як не адвольнага і вельмі асабістага адчування рэчаіснасці, дзе колер можа стаць сімвалам цэлай краіны?.. Зона зялёнага для яго ўвасабляе Беларусь.

Вось тлумачэнні самога аўтара: «Зялёная сцяна — гэта мая назва альбо метафізічнае азначэнне таго месца, дзе я жыву, якое ўмоўна называецца цяпер Беларусь. Гэтая зямля мела іншыя назвы. Але для мяне гэта зялёная зямля. У ёй — павольная вада, лес і нябёсы, а недзе за гарызонтам хаваюцца нябачныя сусветы. «Цяперашняя выстава — гэта працяг праекта, які ажыццявіўся ў 2006 годзе ў Інстытуце імя Гётэ ў Мінску. Таму некаторыя працы 20-гадовай даўніны можна сёння асэнсаваць па-новаму — і з улікам асабістага вопыту, і праз уласнае ўспрыманне. Тое ж і з творамі апошняга дзесяцігоддзя, якія прадставіў Пятроў. Прадставіў ён — а разумеем мы. Наша адчуванне сучаснага мастацтва — гэта ў нейкім сэнсе і працяг таго, што мы ёсць як істоты, якія адчуваюць і мысляць. З мастацтвам жа заўсёды так: адна справа — аўтарская задума, але кожны глядач можа дадаць уласных асацыяцый і ведаў, уявы, чакае адчуць і інтэрпрэтаваць па-свойму. Тым і цікавы гэты працэс — разгадвання твораў сучаснага мастацтва, чытання сэнсаў, якія яны нясуць.

Але і гэта ўсяго толькі «фрагменты» творчасці мастака, якія вызначаюць галоўныя лініі яго творчага вопыту, што назапашваўся цягам 35 гадоў. Выхаванец беларускай мастацкай школы (скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут), Віктар Пятроў выбраў шлях мастакоў, якія стваралі не «дзякуючы», а «насуперак». Ён паказваў свае творы на неафіцыйных кватэрных выставах яшчэ з 1981 года. Напрыканцы 90-х ініцыяваў стварэнне таварыства незалежнага сучаснага мастацтва «Форма». Меў дачыненне да заснавання Галерэі сучаснага мастацтва «6-я лінія», якая ў 90-я гады вылучалася падыходамі да працы айчынным мастакамі, а таксама канцэптуальнымі выставамі. Яшчэ яму аматары авангардных формаў павінны быць удзячныя за тое, што ў Мінску з'явіўся Міжнародны фестываль перформансу «Навінкі». Пятроў у ліку тых мастакоў, якія ўдзельнічалі ў Беларускім павільёне 54-й Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва.



Але ж вось як бывае: нам ёсць што і каго паказаць іншым, калі трэба. Але ці заўсёды пільна жыхары краіны прыглядаюцца да таго, што маюць тут і цяпер? Таму што, якое б ні было мастацтва — у розных праявах, формах, — яно ўсё роўна адгукаецца на з'явы рэчаіснасці, якія адбываюцца ў канкрэтнай прасторы, дзе іх стварае мастак. Палотны Віктара Пятрова маюць свой асаблівы сюжэт, абстрактныя формы, творчая манера яго ўвабрала ўвесь папярэдні вопыт мастацтва з багаццем яго плыняў і кірункаў. Але прастора Віктара Пятрова — мясцовая. Тая, якую ўсе мы добра ведаем і назіраем штодня. Зялёная. Колеру надзеі і імкнення да душэўнай раўнавагі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Асоба

## Алесь БАДАК:
# «ВЕРШ ПІШАШ ДЛЯ СЯБЕ, ПЕСНЮ — ДЛЯ ПУБЛІКІ»

**На вочы мне некалі трапіліся дзіцячыя кнігі Алеся Бадака. І першае ўражанне ад яго творчасці вылілася ў цвёрдае абяцанне: гэтыя кнігі павінны прачытаць мае дзеці! Настолькі зразумела, па-добраму, адкрыта звяртаецца ён да маленькага чытача. За руку вядзе малога па сцежках дарослага свету, адказваючы на ўсе «дзіцячыя» пытанні, якіх бывае шмат. Трошкі казачнасці Алесь Бадак усё ж пакідае сабе ў кішэні — дзіця павінна развівацца плаўна, і на многія пытанні яно хоча пачуць у адказ нейкую казку. «Разумее дзіцячую душу», — кажа ў прадмове да кнігі Алеся «Маленькі чалавек у вялікім свеце» пісьменнік Віктар Шніп. Так, яшчэ ў раннім узросце, пачынаецца знаёмства з Бадаком-пісьменнікам.**

**Працягваецца пазней — як з вядомым літаратарам, крытыкам і публіцыстам, аўтарам вершаў і слоў да шмат якіх вядомых песень. Але цяпер Алесь Бадак яшчэ і галоўны рэдактар часопіса «Полымя». Мы размаўлялі пра тое, над чым творца працуе сёння і ў чым шукае натхненне.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

***— Нядаўна ў Беларусі Выдавецкім домам «Звязда» быў рэалізаваны цікавы праект — выйшла серыя кніг мастацкай літаратуры народаў СНД пад назвай «Сугучча сэрцаў». Вы складальнік гэтай серыі. Калі ласка, раскажыце аб праекце падрабязней і падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад працы.***

— Калі я складаў гэтыя кнігі, неаднаразова пераконваўся, што на масавым чытацкім узроўні мы недаацэньваем літаратуру краін былога СССР. Недаацэньваем, бо не ведаем яе, тых літаратурных працэсаў, якія адбываюцца на постсавецкай прасторы. Многім здаецца, што тая літаратура скончылася на імёнах пісьменнікаў савецкага часу. Але за апошнія дваццаць з нечым гадоў у нашых суседзяў па СНД з'явілася нямала новых цікавых аўтараў. Кожная з кніг гэтай серыі складаецца з дзвюх частак: першая — літаратура адной з краін СНД, другая — сучасная беларуская літаратура. Выйшла 11 кніг тыражом больш за тысячу экзэмпляраў кожная. Трапілі яны не толькі ў бібліятэкі Беларусі, але і ў розныя культурныя ўстановы нашага блізкага замежжа.

***— Колькі часу спатрэбілася, каб выдаць 11 тамоў?***

— Кнігі выйшлі за 2013 год. Калі ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя гэта зрабіць было досыць цяжка, то сёння ёсць інтэрнэт, магчымасць аператыўных зносін. Калі задумвалася серыя, у нас ужо былі наладжаны добрыя кантакты з пісьменнікамі Азербайджана, Арменіі, Таджыкістана, Туркменістана — амаль з усімі краінамі СНД. Не кажу ўжо пра Расію і Украіну. Да таго ж, штогод на міжнародны «круглы стол», прысвечаны мастацкай літаратуры, прыязджаюць пісьменнікі з розных краін. Знаёмімся, перапісваемся.

***— Шмат пішаце для дзетак. Маеце дзяцей?***

— Мая дачка Наташа ўжо дарослая. Некалькі гадоў таму скончыла гуманітарны факультэт БДУ.

***— Ці натхняла вас дачка на напісанне кніг?***

— Для дзяцей я пачаў пісаць яшчэ студэнтам: аповесці, казкі. Цікава рабіць нейкія адкрыцці для сябе, пра сябе. Усе пытанні я задаваў ад імя дзяцей, але сам. Пісаць для дзяцей складаней, таму што трэба ўвайсці ў дзіцячы свет. І я ўваходзіў — ужо дарослым. Неаднаразова. Мне так здавалася. Дзіцячы свет — своеасаблівы свет. Менавіта ў гэтую пару фарміруецца характар чалавека, яго разуменне дабра і зла. Пісаць для маленькіх — вялікая адказнасць. Дзіця ніколі не скажа, што яго падманвае кніжка, што так, як там напісана, не бывае, нягледзячы на ўсю казачнасць сюжэта і паводзін яе герояў. Што да вашага пытання... Далёка не кожны пісьменнік, у каго ёсць дзеці, пачынае пісаць для дзяцей. Наяўнасць уласных дзяцей ці, скажам, пляменнікаў, відаць, важная для пісьменніка, паколькі ёсць магчымасць пастаяннага судакранання з дзіцячым светам, але гэтага недастаткова. Калі дачка была малая, тады яшчэ былі модныя грампласцінкі. Я даваў ёй слухаць аўдыяказкі «Кракадзіл Гена», «Маўглі»... Калі яны скончыліся, дачка патрабавала ўсё новыя. І я расказваў — прыдумляў на хаду. Можа быць, з гэтага ўсё і пачалося.

***— Калі не памыляюся, у 2008 годзе вы сталі лаўрэатам прэміі «Залаты купідон» за лепшую кнігу года ў намінацыі «Публіцыстыка»?***

— Так, атрымаў яе за першую кнігу «Расліны» серыі для дзяцей «Усім пра ўсё». Гэту серыю прыдумаў сам і ў якасці аўтара яе рэалізоўваю. Пасля «Раслін» з'явіліся «Жывёлы», «Насякомыя», «Птушкі», «Водны свет». Цяпер рыхтуецца шостая кніга. Але я вырашыў крышку адысці ад жывёльнага і раслліннага свету. Кніга будзе называцца «Дзе мы жывём». З яе можна даведацца пра тое, з чаго будавалі дамы ў глыбокай старажытнасці і з чаго яны будуюцца цяпер, якіх традыцый прытрымліваліся нашы продкі пры будаўніцтве свайго жытла і чаму з часам некаторыя беларускія гарады драбнелі і сёння ўяўляюць сабой звычайныя вёскі.

***— Акрамя ўсяго, вы пішаце яшчэ і тэксты песень. Скажыце, колькі ўжо напісана і хто іх выконвае?***

— Калі шчыра, не лічыў. Але каля ста песень ёсць дакладна. Увогуле, адна з першых песень у рэпертуары Аляксандра Саладухі напісана на мае словы — «Заваражаная фея». Потым Саша Нэма яе запісаў пад гітару. Цяпер яе выконваюць «Верасы». Шмат песень у рэпертуары ансамбля «Сябры», Анатоля Ярмоленкі. Не так даўно Іна Афанасьева па-новаму перапісала песню «Сарамлівая дзяўчынка», створаную 20 гадоў назад мною і кампазітарам Алегам Елісеенкавым. Акрамя таго, мне цікава пісаць і для моладзі. Нядаўна мы з тым жа Елісеенкавым напісалі песню для Юліі Гусевай — «Кахаю і люблю», з якой яна будзе ўдзельнічаць у конкурсе маладых выканаўцаў на «Славянскім базары ў Віцебску». У гэтай спявачкі цудоўны голас. Да таго ж яна не замыкаецца ў пэўных творчых рамках (так званым фармаце), які вельмі шкодзіць творчай індывідуальнасці. Таму, мне здаецца, у Юліі вялікія перспектывы.

***— Раскажыце пра гісторыю стварэння вашай першай песні.***

— Першая песня была напісана без майго ўдзелу *(смяецца)*. Елісеенкаў, з якім даўно сябруем і потым напісалі шмат песень, купіў у кнігарні маю першую кніжку, выбраў, як яму здавалася, самы песенны верш і напісаў на яго музыку. Калі б я быў кампазітарам, то выбраў бы гэты верш калі не самым апошнім, то перадапошнім у гэтым пераліку. Верш называўся «Грошы». Створаная песня ўдзельнічала ў папулярным некалі фестывалі «Песню бярыце з сабою». Там, дарэчы, я яе ўпершыню і пачуў.

***— Як здараецца часцей: спярша пішуцца словы, а потым на іх кладзецца музыка, альбо наадварот?***

— Вядома, мне прасцей спачатку напісаць словы: тут я вольны сам выбіраць рытм, вершаваны памер. Пасля — аддаць іх кампазітару, і няхай ён пакутуе, прыдумляючы на словы мелодыю. Дарэчы, калі спачатку пішацца музыка, вельмі часта яе рытм з паэтычнага пункту гледжання бывае «няправільны», ламаны. Слухаеш ужо гатовы запіс — можаш гэтага і не адчуць. А калі пачынаеш чытаць словы якой-небудзь папулярнай песні, то першае ўражанне, што аўтар тэксту нібы абсалютна не валодае паэтычнай граматай! Асабліва гэта тычыцца песень апошніх дзесяцігоддзяў. Тым не менш многія мае песні нараджаліся менавіта з гатовай мелодыі.

***— Чым песня адрозніваецца ад верша?***

— Верш пішаш для сябе, пра сябе, у першую чаргу хочаш, каб ён спадабаўся табе самому. Калі верш мне не падабаецца, я яго ніколі друкаваць не буду. Песня — гэта іншае. Песню ты пішаш не для сябе, для выканаўцы, а праз яго — для публікі. Таму для мяне вельмі важна, калі пішу песню, ведаць, хто яе будзе выконваць. Яшчэ адно вельмі важнае адрозненне: у вершы ключавая думка, вобраз могуць быць дзе заўгодна (напачатку, усярэдзіне, у канцы), у песні — гэта абавязкова прыпеў. Таму звычайна я пачынаю пісаць песню з прыпеву, а пасля ўжо «падганяю» пад яго запевы.

*Вось такі ён, Алесь Бадак. Творчы, цікавы, «цёплы» чалавек. Упэўнены, што сустрэць вожыка — на радасць. Шчыра дзеліцца сваімі ўспамінамі. Яму многае хочацца сказаць, таму часта адна думка дае штуршок другой — і размова напаўняецца дадатковымі сэнсамі. Рознабаковы і гарманічны. Адкрыты, лёгкі. Непаўторны Алесь Бадак.*

**Гутарыла Ангеліна ПАКАЧАЙЛА**

## З ПАЧУЦЦЁМ РАДЗІМЫ

**Непадзельнае мастацтва падзеленай зямлі**

**Складаны перыяд айчыннай гісторыі вачыма мастакоў адлюстроўвае выстава «І рай, і боль па Песеннай зямлі» ў Нацыянальным гістарычным музеі. Упершыню прадстаўлены графічныя творы 1920—1930 гадоў, прысвечаныя Радзіме, якія знаходзяцца ў калекцыі музея.**

Беларускае мастацтва ў 1920—1930-х гадах існавала з адчуваннем болю. Гэта той перыяд нашай гісторыі, калі было дзве Беларусі. Гэта калі разглядаць тэрытарыяльна. Але ў свядомасці людзей было сваё ўяўленне пра радзіму. І яго адлюстроўвалі мастакі: тыя, што жылі ў Савецкай Беларусі, і тыя, што засталіся пасля падзелу на тэрыторыі заходняй яе часткі. Цяпер пра той няпросты перыяд можна чытаць у кнігах, але яшчэ яго можна пабачыць — праз творы мастакоў.

Збор музея пачаў фарміравацца менавіта ў той час і адлюстраваў у тым ліку тагачасны імпэт у цікавасці да роднай зямлі. У тым ліку і з боку творцаў, якія ездзілі ў экспедыцыі і малявалі тое, што бачылі навокал. Графіка Савецкай Беларусі прадстаўлена творамі А. Астаповіча, А. Тычыны, М. Дучыца, М. Аксельрода, О. Марыкса ды іншых. Асабліва адзначана адметнасць творчага Віцебска. Заходнюю Беларусь увасаблялі, у прыватнасці, Я. Драздовіч, П. Сергіевіч, Л. Родзевіч і шэраг невядомых творцаў.

■ Прэм'ера

## ЧОРНАЕ, ЗНОЎ ЧОРНАЕ І ЎВЕСЬ ЧАС ЧОРНАЕ

**У асобе загадкавай незнаёмкі можна не адразу пазнаць Смерць**

Дама скідвае вуаль — і ператвараецца ў істоту без полу і твару (толькі бледныя косці абазначаюць галаву). «Ну як можна было закахацца ў такую?» — шчыра здзіўляюцца жанчыны ў жалобе. Закахацца, страціць галаву і ў выніку — жыццё... Але гэтая істота ведае, што рабіць з аматарамі лёгкіх прыгод. Яе танец зачароўвае. Зацягвае. Ад такіх, відаць, і губляюць галаву, а потым і жыццё.

Чорны колер, чорныя ўдовы, чорны гумар. Гэта чорная камедыя ў Новым тэатры, што ў Мінску. Колер жанчын, што засталіся без мужоў і тут жа вырашылі адсвяткаваць гэты момант з келіхам шампанскага і кавалачкам торта. А вось чаму і як яны засталіся адны, распавядаецца ў спектаклі «Дамскае танга», які паставіў рэжысёр Венядзікт Расстрыжэнкаў паводле п'есы Славаміра Мрожака «Удовы».

Гераіні так і абазначаюцца: Першая ўдава (Н. Капітонава,), Другая ўдава (К. Ермаловіч), Трэцяя ўдава (А. Пінчук). Побач з дзвюма першымі яшчэ круцяцца Першы мужчына (А. Верашчака) і Другі мужчына (П. Чарноў). За іх стасункамі назірае афіцыянт (В. Агаян). Адносіны высвятляюцца праз словы — іх трэба лавіць уважліва, каб не згубіць сэнс. Бо гэта не той спектакль, дзе акрэслены і паступова развіваецца сюжэт, хоць ён насамрэч ёсць. Мужчыны вырашылі гульнуць ад жонак. Але здрада каханай — як смерць. Вось іх яна і напаткала. Не важна, якім чынам: ён атруціўся стравамі (жонкі-бландзінкі?) ці сканаў ад прастуды — відаць, рудавалосая прыгажуня не надта клапацілася пра догляд (раніцой захварэў, у абед памёр, увечары пахавалі), ці сапраўды загінуў на дуэлі (вось толькі з кім і з-за каго?). Але ж тое, што здараецца ў жыцці, бывае не проста так. Усе падзеі прыцягваюцца ўчынкамі: калі Смерць добра паклікаць, то яна прыходзіць. Вось нават у кавярні, дзе сядзяць дзве ўдавы і разважаюць пра сваіх каханых, яна не проста сядзіць. Яна вядзе сваё паляванне. І робіць гэта пераканаўча. З гарачым пачуццём рамантычнай закаханасці і ўсёабдымнай страсці.

Але не быў бы то Мрожак, калі б не перакуліў усё з ног на галаву: чорнае для некага можа стаць светлым, яркім і нават аптымістычным. Кумкі-жанчыны не надта сумуюць па сваіх БЛАГАверных. Аправіўшыся ад шоку, яны зноўку вяртаюцца да сваёй нетаропкай свецкай гутаркі. Усё пра іх, пра мужчын, якія сыходзяць у чорнае, калі думаюць, што сваімі дзеяннямі ўсяго толькі імкнуцца зрабіць сабе жыццё больш яркім.

Абсурд, з якім даводзіцца сутыкацца ў жыцці, прыйшоў на тэатральныя падмосткі ў другой палове мінулага стагоддзя, у тым ліку і дзякуючы творчасці польскага драматурга Славаміра Мрожака, які летась пакінуў свет. Абсурд у тэатр прыйшоў зусім не беспадстаўна: драматургі падгледзелі яго ў недасканаласцях жыцця, у грамадскіх з'явах, а таксама няшчырых і штучных паводзінах звычайных людзей у дачыненні да іншых. І, відаць, гэта па-за межамі палітычных ці сацыяльна-эканамічных сістэм: творы аўтараў з Заходняй Еўропы (у тым ліку Мрожака)



заваявалі тэатральныя сцэны Заходняй Еўропы. Разгадка — у саміх п'есах, якія па-філасофску драматычныя, але ў той жа час напоўнены тонкім гумарам.

Таму, калі Мрожака паставіць з пачуццём і разуменнем, то можна і стварыць своеасаблівы мастацкі свет, і гледачу дагадзіць, падкаму сёння на камедыі. Таму спектакль В. Расстрыжэнкава атрымаўся глядацкім. Прытым адчуваецца жаданне зрабіць пастаноўку канцэптуальнастылёвай. Дзеля гэтага працавала мастак-пастаноўшчык Дар'я Волкава. Яна адчула галоўнае: чорны — галоўны колер гэтага спектаклю, але пастаралася яго разбавіць драбніцамі ружовага, ліловага і чырвонага. Іншая справа, што гэтыя колеры ў асноўным у легкадумных жабо і дэкаратыўных кветачках і іншых прадметах, што ператварае гераінь (у большай ступені іх) у карыкатурных персанажаў. Гледачу гэта падабаецца: абсурд нібыта падкрэслены, яго маркіруюць: маўляў, не памыліся! Куды больш стылёва выглядае тэма смерці, дзе ўсё строга і няма нічога лішняга: доўгая стрыманая сукенка, якая пры гэтым не перашкаджае стварыць вобраз з дапамогай харэаграфіі (балетмайстар-пастаноўшчык М. Баранава) і чырвоны абрус, які становіцца раздражняльнікам, нібыта ў руках тарэадора. Строгія лініі. Дакладныя рухі. Роля, у якой няма ніводнага слова, становіцца галоўнай. Але ж у маўчанні ёсць свой сэнс.

Гэта ўсё да таго, што абсурд у тэатры закладзены найперш тэкстам, праз які даносіцца сэнс. Таму ўсё астатняе на сцэне павінна не адцягваць увагі, а наадварот, падкрэсліваць словы. «Дамскае танга» — спектакль мінімалістычны. І ў ім сапраўды няма патрэбы ў нейкіх асаблівых дэкарацыях. Таму што галоўнае тут — супрацьстаянне двух пачаткаў: жаночага і мужчынскага. І таго, што паміж імі: шчырае каханне альбо смерць душы.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Фестывалі

## ХАРАСТВО ВЕСНАВОЙ МУЗЫКІ

**Музычны фестываль «Мінская вясна» ўпершыню адкрыў дзверы для аматараў класічнай музыкі ў 1984 годзе канцэртам з твораў народнага артыста Рэспублікі Беларусь кампазітара Анатолія Багатырова. Традыцыйна ў «Мінскай вясне» возьмуць удзел вядучыя калектывы краіны, а таксама зоркі акадэмічнай музыкі, якія прадставяць творчасць кампазітараў ад эпохі барока да сучаснасці. Дваццаць два канцэрты пройдуць у Вялікай і Малой залах Беларускай дзяржаўнай філармоніі з 2 па 28 красавіка.**

